Міністэрства адукацыя Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны універсітэт
Гістарычны факультэт
Кафедра крыніцазнаўства

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедры | Дэкан факультэта |
| __________С.М. Ходзін | _________ А.Г. Каханоўскі |
| «26» снежня 2023 г. | «26» снежня 2023 г. |

# Архівы асабістага паходжання

Электронны вучэбна-метадычны комплекс
для спецыяльнасці:
1-23 01 13 «Гісторыка-архівазнаўства»

Рэгістрацыйны № 2.4.2-24/387

Аўтар:
Іванова В.С., дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ

Разгледжана і зацверджана на пасяджэнні Навукова-метадычнага савета БДУ
18.01.2024 г., пратакол № 5

Мінск, 2023

УДК 930.253(075.8)
І-209

Зацверджана на паседжанні Навукова-метадычнага савета БДУ
Пратакол № 5 ад 18.01.2024 г.

Рашэнне об дэпанаванні вынес:
Савет гістарычнага факультэта
Пратакол № 4 ад 26.12.2023 г.

А ў т а р:

Іванова Вольга Сяргееўна, дацент кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

Рэцэнзенты:

Агеенка Т.М., навуковы супрацоўнік аддзела публікацыі дзяржаўнай ўстановы “Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь”;

Шабасава М.А., дацэнт кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

Іванова, В. С. Архівы асабістага паходжання : электронны вучэбна-метадычны комплекс для спецыяльнасці: 1-23 01 13 «Гісторыка-архівазнаўства» / В. С. Іванова ; БДУ, Гістарычны фак., Каф. крыніцазнаўства. – Мінск : БДУ, 2023. – 67 с. – Бібліягр.: с. 66–67, бібліягр. у падрадковых нататках.

Электронны вучэбна-метадычны комплекс (ЭВМК) распрацаваны для студэнтаў, спецыяльнасці 1-23 01 13 «Гісторыка-архівазнаўства». Змест ЭВМК дае магчымасці для вывучэння пытанняў згодна вучэбнай праграме, па адпаведнай дысцыпліне. ЭВМК дазваляе сфарміраваць комплексныя веды па адным з па тэорыі і методыцы захоўвання аднаго з відаў архіваў – архіваў асабістага паходжання.

Структура ЭВМК уключае тэарытычны, практычны раздзел, раздзел кантроля ведаў і дапаможны раздзел.

## ЗМЕСТ


ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ........ 5

1. ТЭАРЫТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ........ 7

1.1. Тэарытычныя асновы працы з архівамі асабістага паходжання ........ 7

1.1.1. Архівы асабістага паходжання і захаванне памяці ........ 7

1.1.2. Паняцце і віды архіваў асабістага паходжання ........ 9

1.1.3. Прававыя асновы захоўвання архіваў асабістага паходжання ........ 11

1.1.4. Рэканструкцыя архіваў асабістага паходжання ........ 13

1.2. Захоўванне архіваў асабістага паходжання ........ 15

1.2.1. Пачаткі  і прырода захоўвання архіваў асабістага паходжання з канца XVIII – да пачатку XX ст. ........ 15

1.2.2. Тэарытычныя і метадычныя асновы захоўвання архіваў асабістага паходжання ў савецкім архівазнаўстве ........ 19

1.2.3.  Збіранне і захоўванне архіваў асабістага паходжання Беларусі ў савецкі перыяд ........ 23

1.3.Асноўныя віды архіваў асабістага паходжання: асаблівасці складу і сучаснае захоўванне ........ 29

1.3.1. Фонды асабістага паходжання ў складзе дзяржаўных сховішчаў Рэспублікі Беларусь ........ 29

1.3.2. Архівы беларускай эміграцыі ........ 33

1.3.3. Сучасныя тэндэнцыі захоўвання асабістых архіваў ........ 34

1.3.4. Сямейныя архівы ў кантэксце сучасных праблем асабістага дакументавання ........ 36

1.4. Методыка працы з дакументамі асабістага паходжання ........ 39

1.4.1. Камплектаванне і экспертыза каштоўнасці дакументаў асабістага паходжання. Грашовая ацэнка ........ 39

1.4.2. Стварэнне навукова-даведачнага апарата да фондаў асабістага паходжання. Архіўны вопіс і каталог. ........ 44

1.4.3. Забеспячэнне захаванасці  і улік дакументаў асабістага паходжання. Асаблівасці захоўвання кніг і музейных прадметаў ........ 49

1.5. Архівы вуснай гісторыі як асобны від архіваў асабістага паходжання ........ 51

1.5.1. Этапы развіцця вуснай гісторыі і архіваў вуснай гісторыі ........ 51

1.5.2. Правілы працы архіваў вуснай гісторыі ........ 54

1.5.3. Падыходы да запісу вусных успамінаў і тэрміналогія ........ 56

1.5.4. Правілы збору, апрацоўкі, захоўвання і выкарыстання вусных успамінаў ..... 59
2. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ..... 64
3. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ..... 65
4. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ ..... 66
4.1. Рэкамендаваная літаратура ..... 66
4.2. Электронныя рэсурсы ..... 67

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Электронны вучэбна-метадычны комплекс (ЭУМК) па вучэбнай дысцыпліне “Архівы асабістага паходжання” прызначаны для студэнтаў спецыяльнасцяў 1-23 01 13 “Гісторыка-архівазнаўства”, 6-05-0322-02 “Архіўная справа”.

Навучальныя дысцыпліна “Архівы асабістага паходжання” адносіцца да шэрагу дысцыплін спецыялізацыі. Прадстаўлены ЭУМК таксама можа выкарыстоўвацца ў выкладанні дысцыпліны спецыялізацыі “Архівы вуснай гісторыі”.

ЭУМК складзены на аснове вопыту выкладання дысцыпліны супрацоўнікамі кафедры крыніцазнаўства, пачынаючы з 1992 г.,  а таксама метадычных распрацовак Беларускага дзяржаўнага архіва-музеяя літаратуры і мастацтва пад кіраўніцтвам  Г.В. Запартыка.

ЭУМК спрыяе фармаванню сістэмы ведаў па гісторыі, тэорыі і методыцы працы з архівамі асабістага паходжання, уключаючы асабістыя сямейныя, фамільныя архівы, архівы вуснай гісторыі, якія захоўваюцца ў як прыватнай уласнасці так на дзяржаўным захоўванні архіваў, музеяў і бібліятэк. Уключаючы асаблівасці працы з дакументамі асабістага паходжання  па  камплектаванні, экспертызе каштоўнасці, стварэнні навукова-даведачнага апарата, уліку, забеспячэнні захаванасці і выкарыстанні.

ЭУМК забяспечвае тэарэтычную базу і метадычнае забеспячэнне навучальнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне. І ўключае наступныя раздзелы: тэарэтычны, практычны, раздзел кантролю ведаў, дапаможны. Тэарэтычны раздзел уключае курс лекцый па асноўных 5 тэмах курса паводле праграм. Па тэксце даюцца спасылкі на дадатковую літаратуру па кожнай тэме. Практычны раздзел уключае ў сябе прыкладны пералік пытанняў для падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў, якія адпавядаюць тэмам і пытанням лекцый. У склад раздзела кантролю ведаў уваходзіць прыкладны пералік пытанняў да заліку па курсе. Дапаможны раздзел уключае ў сябе: спіс асноўнай вучэбнай, навуковай літаратуры, актуальнай нарматыўнай і метадычнай літаратуры і электронныя рэсурсы.

Праца з ЭУМК з'яўляецца асновай для асваення вучэбнага матэрыялу. У выніку студэнты павінны

ведаць:

- тэарэтычныя асновы працы з дакументамі асабістага паходжання, асноўныя этапы іх захоўвання;
- асноўныя сховішчы, дзе захоўваюцца дакументы асабістага паходжання;
- прававыя асновы працы з дакументамі асабістага паходжання;
- асаблівасці методыкі працы  з дакументамі асабістага паходжання ў дзяржаўных сховішчах Рэспублікі Беларусь.

умець:

- аналізаваць дакладна выкарыстоўваць тэрміналогію, што тычыцца дакументаў асабістага паходжання;
- арганізоўваць работу архіваў з дакументамі асабістага паходжання;

- праводзіць экспертызу каштоўнасці і камплектаванне дакументамі асабістага паходжання;

- ствараць навукова-даведачны апарат па дакументах асабістага паходжання;

- забяспечваць належныя ўмовы фізічнай захаванасці і улік дакументаў асабістага паходжання.

валодаць:

- метадамі экспертызы каштоўнасці, архіўнай рэканструкцыі, класіфікацыі дакументаў асабістага паходжання, навукова-тэхнічнай апрацоўкі і апісання.

Акрамя таго, выкарыстанне студэнтамі ЭУМК спрыяе фармаванню універсальных і базава-прафесійных кампетэнцый згодна адукацыйнаму стандарту па названай спецыяльнасці. Праца з ЭУМК пабудавана на аснове міждысцыплінарных сувязяў з такой навучальнай дысцыплінай як «Архівазнаўства».

Дысцыпліна вывучаецца студэнтамі на дзённым аддзяленні на працягу 7-га семестра. Усяго на вывучэнне адводзіцца 86 гадзін, з іх 36 аўдыторных, 20 гадзін лекцый, 14 гадзін семінарскіх заняткаў, 2 гадзіны кіруемай самастойнай працы, 2 заліковыя адзінкі. Па выніках курса праводзіцца залік.

# 1. ТЭАРЫТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 1.1. Тэарытычныя асновы працы з архівамі асабістага паходжання

### 1.1.1. Архівы асабістага паходжання і захаванне памяці

Французскі філосаф-пазітывіст, гісторык і архівіст Шарль Ланглуа ў канцы XIX ст. даючы функцыянальную перыядызацыю гісторыі архіваў вылучаў перыяд існавання архіваў як “арсеналаў улады” і наступны як “лабараторый гісторыі”. У другой палове XX–пачатку XXI ст. актуальным стаў разгляд архіваў як аднаго з інстытутаў сацыяльнай памяці грамадства, месцаў памяці. Само паняцце памяць параўнальна нядаўна увайшло ў гістарыяграфію гістарычнай навукі[1] і архівазнаўства[2]. Яны выступаюць як інстытуцыі, якія мусяць задаволіць патрэбы памяці і здзейсніць суб’ектыўны выбар таго, што будзе забытае, а што захаванае. Архівы асабістага паходжання традыцыйна разглядаюцца засноўваючыся пераважна на катэгорыі памяці.

Паняцце *“памяць”* стала актыўна вывучацца з 1920-х гг. у асяроддзі сацыёлагаў. Французскі сацыёлаг Марыс Хальбвакс ўвёў у навуковы ўжытак катэгорыю *“калектыўная (ці сацыяльная) памяць”* – ўспаміны пра падзеі, што мелі значэнне для канкрэтнай супольнасці. Галоўнай функцыяй калектыўнай памяці з’яўлалася захаванне адзінства супольнасці і яе ўзнаўленне. Розныя сацыяльныя групы культывавалі і захоўвалі сваю калектыўную памяць, для захавання, падтрымання і перадачы калектыўнай ідэнтычнасці. *Індывідуальная памяць* чалавека абапіралася на памяць калектыўную для таго, каб пацвердзіць ці ўдакладніць свае ўспаміны. Калектыўная памяць не супадала з *гісторыяй ці гістарычнай памяццю* (наборам найбольш значных фактаў, якія занялі месца ў памяці людзей, прайшлі пэўны адбор і сістэматызацыю). Гістарычная памяць пачыналася ў той момант, калі заканчвалася традыцыя і распадалася калектыўная памяць.

*Калектыўная ідэнтычнасць* (Алейда Асман) – уяўленне пра сябе, якое канструюецца малымі ці вялікімі сацыяльнымі групамі (нацыямі і дзяржавамі). Ідэнтычнасць групы мае прыярытэт над індывідуальнай.

*Калектыўная (сацыяльная) памяць* (Марыс Хальбвакс) – памяць пра мінулае асобнай групы людзей, якая падкрэслівае асаблівасці гэтай групы, адрознівае яе

---

[1] Горны А. С. Францішак Багушэвіч як “месца памяці” беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі / А. С. Горны // Беларускі гістарычны часопіс. – 2020. – № 5. – С. 29–34.

[2] Илизаров Б. Архивный документ в свете представлений о социальной памяти // Археографический ежегодник за 1985 год. – М., 1987. – С. 42–51; Старостин Е.А. Архивы в системе социальной памяти российского общества // Социальная память в институциональном измерении: Постсоветский архив: Материалы семинара Центра россиеведения. РАН. ИНИОН. Центр россиеведения. – М., 2010. – С. 12–18; Илизаров Б.И. Социальная память и архивы: историографический и практический аспекты // Отечественные архивы. – 2021– № 4 – С. 18-31. Chorążyczewski W. Archiwa i pamięć. Z dziejów polskich archiwów. // Archiwa–Kancelarie–Zbiory. – T. 1. – Toruń, 2005. – S. 13–27; Rosa A. Archiwa między historią i pamięcią. Antropologizowanie archiwistyki // Archiwa–Kancelarie–Zbiory. – Toruń, 2008. – S. 99–133; Wiśniewska M. Archiwum jako miejsce pamięci// Archiwa–Kancelarie–Zbiory. – T. 4(6). – Toruń, 2013. – S. 137–147 і інш.

ад іншых. Калектыўная памяць уключае ў сябе падзеі мінулага, не звязаныя з непасрэдным досведам канкрэтнага чалавека, але вядомыя яму дзякуючы пераказам іншых. Калектыўная памяць фарміруе індывідуальную, пашырае яе і прадстаўляе дамінуючую версію мінулага.

*Камунікатыўная памяць* (Ян Асман) – форма калектыўнай памяці, якая ахоплівае ўспаміны, звязаныя з недалёкім мінулым. Гэта «жывыя» ўспаміны, якія чалавек падзяляе са сваімі сучаснікамі. Камунікатыўная памяць існуе на працягу 3-4 пакаленняў

*Гістарычная памяць (гісторыя)* (Марыс Хальбвакс, Л. Рэпіна) – форма калектыўнай памяці, якая прапануе набор найбольш значных фактаў, якія прайшлі адбор і сістэматызацыю і занялі пэўнае месца ў свядомасці людзей. Гістарычная памяць перманентна абнаўляецца і можа выступаць у якасці ідэальнай рэальнасці ці як прадукт маніпуляцыі масавай свядомасцю.

Пры стварэнні дакументаў (архіваў) асабістага паходжання канструюецца індывідуальная, акружаючая канкрэтную асобу сацыяльная гісторыя, у якую ўпісваюцца падзеі, сацыяльныя ўзаемаадносіны і працэсы, а таксама даецца іх інтэрпрэтацыя.

*Выкарыстанне дакументаў асабістага паходжання.* Дакументы (архівы) асабістага паходжання могуць выступаць як дапаўненне да традыцыйнага гістарычнага даследавання, пабудаванага на аналізе афіцыйных архіўных дакументаў і іншых крыніц. У гэтым выпадку можа адбывацца сацыяльная праблематызацыя тэмы, верыфікацыя пэўных фактаў і канцэпцый, распрацоўка новых сюжэтаў узнятай праблемы і інш.

Другі падыход заключаецца ў тым, што рэпрэзентацыя, верыфікацыя і інтэрпрэтацыя адбываюцца выключна на аналізе дакументаў асабістага паходжання. Напрыклад, факты і ацэнкі аднаго дакумента, могуць быць суаднесены з вуснымі ўспамінамі, фотаздымкамі і дакументамі асабістага архіва. У гэтым выпадку яны становяцца падставай для стварэння біяграфічных ці сямейных аповедаў, інтэрпрэтацыі падзей уласнага жыцця ці гістарычных фактаў. Часта дакументы сямейных архіваў ёсць фундаментам для фарміравання калектыўнай ідэнтычнасці канкрэтнай сям'і, а гісторыя іх стварэння, выратавання ці страты – пэўным этапам жыцця, сродкам захавання ці канструявання памяці[3].

Две асноўныя методыкі аналіза дакументаў асабістага паходжання: тэматычная і біяграфічная. Але могуць быць выкарыстаныя таксама лінгвістычныя, псіхалагічныя, сацыялагічныя, антрапалагічныя падыходы.

Асаблівасці архіваў (дакументаў) асабістага паходжання:

1. Суб'ектыўнасць
2. Эмацыйнасць
3. Ацэначнасць і інтэрпрэтацыя
4. Тэрміналагічная, тэматычная і відавая разнастайнасць

[3] Падрабязней гл.: Іванова, В. Прамоўленая гісторыя: XX ст. у памяці жыхароў беларускай вёскі. – Мінск, 2018. – 448 с.

5. Несістэмнасць захоўвання, захоўванне дакументаў адной асобы ў розных сховішчах

6. Этычныя і прававыя аспекты выкарыстання.

### 1.1.2. Паняцце і віды архіваў асабістага паходжання

*Дакументы асабістага паходжання* – дакументы створаныя асобай па-за межамі службовай дзейнасці:

- Дакументы дзейнасці (творчай, навуковай, грамадскай і інш.)
- Біяграфічныя дакументы
- Маёмасна-гаспадарчыя дакументы
- Вусныя успаміны, пісьмовыя успаміны, дзённікі
- Фотаздымкі
- Ліставанне
- Сабраныя дакументы (калекцыі)
- Артэфакты

Дакументы асабістага паходжання, могуць выступаць непасрэдна як вынік жыцця і дзейнасці асобы (*правенінцыйныя дакументы*: дакументы дзейнасці, біяграфічныя, успаміны, ліставанне); і як дакументы, якія адносяцца да гэтай дзейнасці (*пертынінцыйныя* ці сабраныя, якія адносяцца да дзейнасці асобы апасродкавана).

Дакументы асабістага паходжання адрозніваюцца ад *дакументаў па асабовым складзе* – дакументаў, створаных ў выніку працоўнай дзейнасці асобы (асабовыя справы, загады па асабовым складзе, карткі па уліку кадраў і інш.) Архівы асабістага паходжання складаюцца пераважна з дакументаў асабістага паходжання, але ў некаторых выпадках у яго склад могуць трапляць і дакументы па асабовым складзе.

У залежнасці ад дамінавання той ці іншай катэгорыі дакументаў, іх складу і спосабу збірання могуць вылучацца розныя віды архіваў асабістага паходжання (ААП): асабістыя, сямейныя, фамільныя архівы, калекцыі, персанальныя зборы. Да гэтага шэрагу можна аднесці архівы вуснай гісторыі, архівы літаратуры і мастацтва. ААП могуць знаходзіцца ў прыватнай уласнасці ці быць перададзеныя на дзяржаўнае захоўванне.

*Прыватны/прыватнаўласніцкі архіў* – архіў, які ўтварыўся ў выніку дзейнасці прыватнай установы, асобы або групы асоб і знаходзіцца ў прыватнай уласнасці (асабісты, сямейны, фамільны, канфесіянальны архіў, архіў прыватнай установы).

*Асабісты архіў (спадчына)* – гэта усе дакументальныя і недакументальныя сведчанні аб дзейнасці адной асобы, якія адлюстроўваюць асноўныя накірункі яе жыцця, дзейнасці і інтарэсаў, уключаючы дакументы, створаныя пасля смерці асобы. Усе дакументы ў складзе асабістага архіва аб’яднаныя прыналежнасцю да дзейнасці адной асобы.

*Сямейны архіў* – дакументальныя і недакументальныя вынікі дзейнасці адной сям’і, якія з’яўляюцца асновай для фарміравання сямейнай ідэнтычнасці. Сямейныя архівы ёсць масавай з’явай і знаходзяцца пераважна ў прыватнай

уласнасці. У выпадку калі сямейны архіў мае у сваім складзе каштоўныя і старажытныя дакументы, ці калі члены сям'і вызначаюцца значным унёскам у развіццё розных галін дзейнасці (навукі, культуры, мастацтва ці інш.) дакументы сямейных архіваў могуць перадавацца на дзяржаўнае захоўванне.

*Фамільны архіў* – архіў, які ўтварыўся ў выніку дзейнасці прадстаўнікоў аднаго роду (як правіла больш трох пакаленняў) і ўтрымлівае сведчанні аб палітычнай, грамадскай, гаспадарчай, культурнай, творчай актыўнасці прадстаўнікоў роду. Асноўны комплекс дакументаў фамільнага архіва – гэта маёмасна-гаспадарчыя, якія сведчаць аб кіраванні уладаннямі. Уласна дакументы асабістага паходжання (дзённікі, ліставанне, біяграфічныя) займаюць у такіх архівах нязначную частку.

*Сядзібны архіў* – архіў, які ўтварыўся ў выніку дзейнасці асобы альбо сям'і і ўтрымлівае дакументы аб кіраванні маёнткамі, а таксама дакументы асабістага паходжання. Сядзібныя архівы існавалі ў XIX – пачатку XX ст., і па аб'ёму дакументаў былі менш значнымі за фамільныя і тычыліся пераважна аднаго маёнтка. Роднасныя тэрміны: дваровы архіў, маянтковы архіў.

*Літаратурны архіў* – архіў грамадска-палітычнага дзеяча, дзеяча літаратуры, мастацтва ці навукі. Тэрмін ужываўся ў СССР у 1920–1930-я гг. Раўназначны тэрміну "асабісты архіў".

*Архіў літаратуры і мастацтва* – дзяржаўнае сховішча, ў якім захоўваюцца дакументы па гісторыі літаратуры і мастацтва: у т.л. з асабістых архіваў дзеячаў літаратуры і мастацтва, а таксама адпаведных устаноў (творчых саюзаў, рэдакцый газет, тэатраў, філармоній і інш.)

*Персанальны збор* – комплекс архіўных дакументаў, штучна аб'яднаных па прыкмеце прыналежнасці да дзейнасці асобы. Ствараецца архівістамі ў выпадку адсутнасці (страты) асабістага архіва.

*Калекцыя* – комплекс дакументаў, аб'яднаных па адной ці некалькіх прыкметах. У пераважнай большасці выпадкаў ствараецца з дакументаў асабістага паходжання. Але можа стварацца і з іншых відаў дакументаў (напрыклад, калекцыя карт). Калекцыі бываюць двух відаў: створаныя архівістамі з разрозненых дакументаў асабістага паходжання, ці створаныя прыватнай асобай з дакументаў асабістага паходжання (напрыклад, калекцыя аўтографаў вядомых дзеячоў, сабраная А. Ельскім).

*Архіў вуснай гісторыі (АВГ)* – комплекс вусных успамінаў па адной ці некалькіх тэмах, сабраных з выкарыстаннем вызначанай методыкі, а таксама захаваныя і выкарыстоўваемыя па вызначаных правілах. У апошнія дзесяцігоддзі АВГ пераважна працуюць ў онлайн-фармаце.

Дакументы асабістага архіва перададзеныя на дзяржаўнае захоўванне утвараюць *фонды асабістага паходжання (асабістыя, сямейныя, фамільныя (родавыя)* – комплексы дакументаў, які захоўваюцца ў дзяржаўным архіве, бібліятэцы ці музеі. Дакументы фонда асабістага паходжання аб'яднаныя паміж сабой інфармацыйнымі сувязямі, абумоўленымі прыналежнасцю да дзейнасці аднаго фондаўтваральніка (асобы, сям'і альбо рода адпаведна). Асабісты архіўны фонд з'яўляецца фрагментам асабістага архіва, прынятага на дзяржаўнае

захоўванне. Дакументы адной асобы могуць захоўвацца і захоўваюцца ў некалькіх фондах[4].

### 1.1.3. Прававыя асновы захоўвання архіваў асабістага паходжання

Упершыню комплексы дакументаў асабістага паходжання былі аднесеныя да дзяржаўнай і недзяржаўнай частак у адпаведнасці з Законам аб Нацыянальным архіўным фондзе (НАФ) і архівах ў Рэспубліцы Беларусь 1994 г. (у другой рэдакцыі 1999). Прыватныя архівы фізічных асоб – комплексы архіўных дакументаў, створаныя асобай, сям'ёй, родам ці набытыя імі і зарэгестраваныя рэспубліканскімі органамі дзяржаўнай архіўнай службы уключаліся ў склад недзяржаўнай часткі. Уладальнік такога архіва мае усю паўнату правоў па яго захоўванні і перадачы. Часткі асабістага архіва пры прыёме на дзяржаўнае захоўванне набываюць статус асабістага архіўнага фонда, уключаюцца ў склад калекцый, збораў і становяцца дзяржаўнай часткай НАФ. Шэраг асабістых архіваў дзеячаў, якія спрыялі развіццю беларускай навукі і культуры, захоўваюцца за межамі Беларусі. Яны, адлюстроўваючы духоўнае жыццё беларускага народа, патрабуюць вывучэння як частка інфармацыйнага рэсурса грамадства, якая патэнцыяльна можа быць уключана ў склад НАФ, шляхам перадачы як саміх дакументаў, на падставе волевыяўлення ўладальніка, так і копій дакументаў, якія захоўваюцца ў сховішчах замежных краін. У адпаведнасці з нарматыўнымі-прававымі актамі асабістыя архівы становяцца часткай НАФ пасля ўнясення ў спіс крыніц камплектавання дзяржаўнага архіва (да недзяржаўнай часткі), ці пры перадачы дакументаў (копій дакументаў) на дзяржаўнае захоўванне (да дзяржаўнай часткі).

Права доступу да дакументаў фондаў асабістага паходжання, што захоўваюцца ў дзяржаўных сховішчах Рэспублікі Беларусь падпарадкоўваюцца агульным патрабаванням, вызначаным ў арт. 29 Закона аб архіўнай справе і справаводстве (2011 г., у рэдакцыі 2022). Абмежаванні доступа могуць тычыцца дакументаў кепскай фізічнай захаванасці, ці дакументаў, якія падпадаюць пад дзеянне таямніц рознага віда. У дадзеным выпадку –таямніцы асабістага жыцця (Інструкцыя аб парадку доступа да дакументаў, што ўтрымліваюць таямніцу асабістага жыцця (2012). Пры перадачы дакументаў асабістага паходжання на захоўванне ўладальнік мае права цалкам ці часткова, а таксама для вызначаных асобаў, абмежаваць права доступа да дакументаў тэрмінам да 75 гадоў. Гэта прапісваецца ў дагаворы прыема-перадачы (дагавор куплі-продажу) дакументаў на дзяржаўнае захоўванне.

---

[4] Падрабязней гл.: Іванова, В. Змест і эвалюцыя паняцця "асабісты архіў" / В. Іванова // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 8. / рэд. кал. У.І. Адамушка [і інш.] – Мінск, 2007. – С. 55–67;
Дмитриев С.С. Личные архивные фонды. Виды и значение их как исторических источников // Вопросы архивоведения. – 1965. № 4. – С. 35–48; Kolankowski Z. Granice spuścizny archiwalnej // Archeion. Czasopismo naukowe poświęcone sprawom archiwalnym / Nachelna Dyrekcja Archiwów Państwowych. – T. 57. – 1972. – S. 53–73; Syta K. Archiwa magnackie w XVIII wieku. Studium kultury kancelaryjno-archiwalnej. – Toruń, 2010. – 311 s.

Дакументы асабістага паходжання таксама могуць падпадаць пад дзеянне аўтарскага права. У адпаведнасці з Законам аб аўтарскім праве і сумежных правах (2011 г.) Аб’ектамі аўтарскага права з’яўляюцца:

літаратурныя творы (кнігі, брашуры, артыкулы і інш.);

драматычныя і музычна-драматычныя творы;

аўдыёвізуальныя творы;

творы выяўленчага мастацтва (скульптура, жывапіс, графіка, літаграфія і інш.);

творы прыкладнога мастацтва і дызайну;

творы архітэктуры, горадабудаўніцтва;

фатаграфіі;

карты, планы, эскізы, ілюстрацыі і пластычныя творы;

творы навукі (манаграфіі, артыкулы, справаздачы, навуковыя лекцыі і даклады, дысертацыі, канструктарская дакументацыя і інш.).

Асабістыя немаёмасныя правы на творы навукі, літаратуры і мастацтва ахоўваюцца бестэрмінова. Выключнае права на твор дзейнічае на працягу жыцця аўтара і 50 гадоў пасля яго смерці. Заканчэнне тэрміна дзеяння выключнага права на твор азначае пераход гэтага твора ў грамадскі здабытак. Творы, якім на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ахова ніколі не падавалася, таксама лічацца грамадскім здабыткам. Яны могуць свабодна выкарыстоўвацца любой фізічнай або юрыдычнай асобай без выплаты ўзнагароджання. Пры гэтым павінны выконвацца права аўтарства, права на імя і права на недатыкальнасць твора. Вольнае выкарыстанне твораў бібліятэкамі і архівамі дапускаецца без згоды аўтара ці іншага праваўладальніка і без выплаты аўтарскага ўзнагароджання, але з абавязковым указаннем аўтара твора. Бібліятэкі і архівы могуць ажыццяўляць рэпрадукаванне і іншае прайграванне без мэты атрымання прыбытку апублікаваных твораў для камплектавання бібліятэчных і архіўных фондаў, замены страчаных, знішчаных ці непрыдатных для выкарыстання экзэмпляраў твораў.

Немалаважнымі пры працы з дакументамі асабістага паходжання з’яўляюцца этычныя аспекты, незафіксаваныя прававымі нормамі. Яны могуць тычыцца жадання ці нежадання асобы на апублічванне фактаў асабістага ці грамадскага жыцця, стану здароўя і іншых аспектаў, якія вызначаюцца ў Метадычных рэкамендацыях па працы з архіўнымі дакументамі, што ўтрымліваюць звесткі, якія адносяцца да асабістай таямніцы грамадзян (2015 г.).

Такім чынам, ў дачыненні да дакументаў (архіваў, фондаў) асабістага паходжання дзейнічаюць наступныя нормы:

- права прыватнай уласнасці;
- агульныя правілы доступа да дакументаў у дзяржаўных сховішчах Рэспублікі Беларусь (Закон аб архіўнай справе і справаводстве (2011, у рэдакцыі 2022 г.);
- аўтарскае права (Закон аб аўтарскім праве і сумежных правах (2011, арт. 6, 20, 21, 37);

• таямніца асабістага жыцця (Інструкцыя аб парадку доступа да дакументаў, што ўтрымліваюць таямніцу асабістага жыцця (2012)[5];

• этычныя аспекты.

### 1.1.4. Рэканструкцыя архіваў асабістага паходжання

Архіўная рэканструкцыя па сваёй тэарытычнай прыродзе грунтуецца на класічным прынцыпе правеніенцыі (паходжання), сфармуляваным нідэрландскімі архівістамі ў канцы XIX ст. і атрымаўшым ўсеагульнае прызнанне на Міжнародным кангрэсе бібліятэкараў і архівістаў у Брусэлі ў 1910 г. Тады Самюэль Мюллер вызначыў *прынцып правеніенцыі як «архіўнае правіла, згодна з якому кожны дакумент ўключаецца ў архіўны фонд і ў тую частку фонду, да якой ён належаў падчас дзейнасці арганізацыі».* Архіўная рэканструкцыя (рэканструкцыя архіўнага фонда, рэканструктыўны метад, метад рэстаўрацыі, метад рэканструкцыі архіўнага фонда,) з'яўляецца лагічным працягам прынцыпу правеніенцыі і звяртае ўвагу на спосабы і механізмы аднаўлення розных дакументальных комплексаў (пераважна фонда ці архіва ўжо неіснуючай арганізацыі) у іх самым шырокім значэнні. Метад архіўнай рэканструкцыі паўстае як асноватворны ў архівазнаўстве і дазваляе яму вырашаць цэлы шэраг задач. Ён з'яўляецца *комплексным:* можа выкарыстоўвацца для розных мэтаў, аб'ектаў, у розных канфігурацыях, і праз выкарыстанне шэрагу агульнанавуковых (сістэмна-функцыянальнага аналіза, метада гістарычнай рэтраспекцыі, мадэлявання і інш.) і прыватнанавуковых (экспертызы каштоўнасці, навуковага апісання і інш) метадаў[6].

*Рэканструкцыя асабістых архіваў (архіваў асабістага паходжання)* – гэта від рэканструкцыі ідэальнага архіўнага аб'екта – тэарэтычнае ўзнаўленне найбольш поўнага комплексу дакументальнай (і недакументальнай) спадчыны адной асобы. Асабісты архіў (архіў асабістага паходжання) з'яўляецца ідэальнай канструкцыяй, якая магла не існаваць ў рэальнасці ці не захоўвацца ў адным месцы. Рэканструкцыя прадугледжвае аналіз і характарыстыку усіх захаваўшыхся частак архіва і выяўленне незахаваўшыхся частак на падставе аналіза асноўных накірункаў дзейнасці.

Рэканструкцыя можа адбывацца шляхамі фізічнага перамяшчэння рэшткаў архіва ў адно сховішча, тэарэтычнага даследавання гісторыі архіва, стварэння даведніка, публікацыі вопісу, характарыстыкі складу кожнай структурнай часткі (напрыклад, архіва Станіслава Аўгуста Панятоўскага, Беларускага музея імя Івана Луцкевіча, архіва Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, бібліятэк Уладзіміра Пічэты, Яўхіма Карскага, Мітрафана Доўнар-Запольскага, арганізацыі выстаў выяўленых у розных сховішчах дакументаў), стварэння электроннага інфармацыйнага

---

[5] Падрабязней гл.: Іванова В. Эвалюцыя тэарытычных і прававых прынцыпаў доступа да архіваў // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 22. / гал. рэд. Э.М. Савіцкі [і інш.] – Мінск, 2021. – С. 43–51.

[6] Падрабязней гл.: Іванова В.С., Латушкін А.М. Метад архіўнай рэканструкцыі ў архіўнай справе і навуковых даследаваннях // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 24. / гал. рэд. Э.М. Савіцкі [і інш.] – Мінск, 2023. – С. 117–132.

рэсурсу, дзе прадстаўленыя ў пэўным парадку дакументы, якія суправаджаюцца каментарамі і адлюстроўваюць этапы жыцця і дзейнасці асобы. Так, на сайце «Архівы Беларусі» у раздзеле тэматычныя распрацоўкі прадстаўлена рэканструкцыя асабістых архіваў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Напалеона Орды, Ігната Дамейкі, Уладзіміра Караткевіча, Браніслава Эпімах-Шыпілы, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Барыса Кіта, створаная супрацоўнікамі дзяржаўных архіваў і навуковых устаноў. Першасная рэканструкцыя асабістых архіваў, можа таксама адбывацца шляхам стварэння даведніка ці электроннай базы дадзеных, дзе ўтрымліваецца кароткая інфармацыя аб утваральніку і месцах захоўвання асабістага архіва. Пэўным узорам можа быць даведнік «Асабістыя архівы ў дзяржаўных сховішчах СССР» у 3-х тт., рэестр і база дадзеных «Эліта Украіны», электронная база дадзеных па асабістых архівах у Германіі «Nachlassdatenbank», база дадзеных «SEZAM» з інфармацыяй аб усіх фондах, што захоўваюцца ў дзяржаўных і акадэмічных архівах Польшчы. У працы “Асабістыя архівы Беларусі канца XVIII – пач. XXI ст.” праведзена першасная навуковая рэканструкцыя каля 1400 асабістых архіваў беларускіх дзеячаў, што захоўваюцца ў больш як 100 сховішчах Беларусі і замежжа[7].

Першыя спробы рэканструкцыі дакументальных збораў знакамітых дзеячаў пачалі ажыццяўляцца яшчэ ў канцы XIX ст. Так, у 1898 г. у Вільні быў створаны г. зв. Мураўёўскі музей, дзеля арганізацыі якога ў розных сховішчах была праведзена праца па пошуку і вынятку дакументаў аб дзейнасці графа Міхаіла Мураўёва ў перыяд кіравання г.зв. «Паўночна-Заходнім краем» у 1863–1865 гг. З 1923 г. да канца 1980-х гг. ва ўсіх архівах СССР вялося выяўленне і перамяшчэнне ў сховішча Цэнтральнага партыйнага архіва Інстытута марксізму-ленінізму пры ЦК КПСС дакументаў звязаных з дзейнасцю Ўладзіміра Леніна і Іосіфа Сталіна. Мерапрыемствы па фізічным перамяшчэнні прыводзілі да парушэння цэласнасці архіўных фондаў устаноў і архіўнага прынцыпу правеніенцыі, а рэканструкцыя станавілася сродкам ідэалагізацыі дзейнасці асобы ў палітычных мэтах.

Правядзенне рэканструкцыі асабістых архіваў, скіраванае на вырашэнне архівазнаўчай, крыніцазнаўчай і гісторыка-культурнай задач, залежыць ад ступені ўсведамлення каштоўнасці і неабходнасці захоўвання і ўзнаўлення крыніц памяці архіваўтваральнікам, яго спадчыннікамі, дзяржавай і грамадствам. Методыка рэканструкцыі заснаваная на вывучэнні біяграфіі, асноўных накірункаў дзейнасці асобы, гісторыі асабістага архіва і захаваных фрагментаў, вызначэнні і характарыстыкі іх складу, паўнаты і каштоўнасці.

[7] Іванова, В. Асабістыя архівы Беларусі канца XVIII – пач. XXI ст. – Мінск, 2014. – 404 с.

### 1.2. Захоўванне архіваў асабістага паходжання

#### 1.2.1. Пачаткі і прырода захоўвання архіваў асабістага паходжання з канца XVIII – да пачатку XX ст.

*1-ы этап: канец XVIII – 20-я гг. XIX ст. – ўсведамленне значнасці дзейнасці асобы і вынікаў гэтай дзейнасці ў выглядзе асабістых архіваў.* Аб асабістых архівах як самастойных комплексах дакументаў можна казаць пачынаючы з XVIII ст. Менавіта ў эпоху Асветніцтва ў сувязі з развіццём навукі і культуры дзейнасць навукоўца і творцы пачала разглядацца як асобная з'ява, а яго дакументы – як крыніца даследаванняў рознага кшталту. Асновай такіх архіваў у адрозненні ад прыватнаўласніцкіх, якія дамінавалі ў папярэднія перыяды, *з'яўляюцца ужо не маёмасна-гаспадарчыя дакументы, а дакументы якія найперш характарызуюць дзейнасць асобы (творчую, навуковую, грамадскую і інш.), біяграфічныя дакументы, ліставанне і мемуары.*

З'яўленне асабістых архіваў як феномена звязана не толькі са зменай складу дакументаў, але і ўсведамленнем іх каштоўнасці з боку уласна асобы-творцы і творчай (навуковай) супольнасці.

Пачатак сталай традыцыі захоўвання асабістых архіваў можна аднесці да 20-х гг. XIX ст., калі вядомы нямецкі паэт **Іаган Гётэ** (1749–1832), пачаў упарадкаванне свайго архіва з мэтай выдання збору твораў. Праца вялася больш 10 гадоў. З дапамогай сябра паэта Тэадора Кройтэра была праведзена сістэматызацыя дакументаў, створаны каталогі, а вынікі апублікаваны ў 1822–1823 гг. на старонках часопіса «Über Kunst und Alternum» у артыкулах «Захаванне майго літаратурнага архіва» і «Захаванне майго літаратурнага архіва і падрыхтоўка поўнага збору твораў». У 1823 г. Гётэ пісаў: *«Цяпер... падумаў нарэшце пра галоўнае: захаваць маю літаратурную спадчыну (архіў) і выдаць поўны збор твораў. Гэта было б немагчыма без прыгожых маладых гадоў, якія былі занатаваны. Зараз зразумела, што мае планы здзейсніліся, і замест матэрыяльнага заробку, створана большае багацце, інтэлектуальна-разумова.*

Адносіны да дакументальнай спрадчыны вельмі моцна залежалі ад волі ўладальніка. Так, напрыклад, у 1818 г., згодна аднаму з пяці тастаментааў, архіў **Тадэвуша Касцюшкі** (1746–1817) быў знішчаны ў прысутнасці натарыуса. У XIX ст. вялікі комплекс дакументаў аб яго дзейнасці быў нанова сабраны Польскім музеем у Раперсвілі (Швейцарыя), але большая частка загінула падчас Другой сусветнай вайны разам са зборамі Нацыянальнай бібліятэкі ў Варшаве. Рэшткі архіва зараз захоўваюцца ў некалькіх сховішчах.

Свае асаблівасці мелі архівы *гісторыкаў-навукоўцаў*, якія для напісання сваіх прац збіралі гістарычныя крыніцы (копіі і выпіскі з архіўных дакументаў, творы і г. д.). Менавіта гэтыя дакументы. з цягам часу станавіліся асноўнай і найбольш каштоўнай часткай асабістага архіва, да якой далучаліся творы і біяграфічныя дакументы дзеяча. Адной з першых такіх калекцый сталі г. зв. «тэкі Нарушэвіча», аўтара «Гісторыі польскага народа», якія складаліся з 230 тамоў копій дакументаў ад 1140 г. да другой паловы XVIII ст.

Асабісты архіў члена Румянцаўскага гуртка гісторыка і археографа **Івана Грыгаровіча** характарызуецца наяўнасцю вялікай колькасці капійных дакументаў з архіваў Полацка, Магілёва, Віцебска, Оршы, якія рыхтаваліся для публікацыі. Падпісаныя Фёдарам Галадкоўскім, Антоніем Дарашкевічам, Іванам Сыценка, Мікалаем Гартынскім. Лёс архіва Грыгаровіча тыповы для таго часу. Пасля яго смерці дакументы захоўваліся ў сына Мікалая Грыгаровіча (дырэктара Сінадальнай бібліятэкі ў Пецяргбургу), а ў 1872 г. былі перададзены ў Румянцаўскі музей (зараз Навукова-даследчыцкі аддзел рукапісаў Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі). Вялікая частка архіва апынулася ў прыватных зборах краснаярскага бібліяфіла Г.В. Юдзіна. У пасляваенны час знойдзены прафесарам Праабражэнскім ў Краснаярску. У 1950-я гг. перададзены у Беларусь, спачатку у абласны архіў, а потым у архіў літаратуры і мастацтва і стаў там першым.

Зборам і захоўваннем гістарычных дакументаў займаліся прафесары Віленскага ўніверсітэта Ігнат Анацэвіч (1780–1845), Міхал Баброўскі (1784–1848), Ігнат Даніловіч (1787–1843), Іван Лабойка (1786–1861), Іосіф Ярашэвіч (1793–1860), якія стаялі ля вытокаў беларускага мовазнаўства, правазнаўства, археаграфіі, гістарыяграфіі. У іх асабістых архівах адклалася вялікая колькасць матэрыялаў па гісторыі Беларусі. Пасля смерці сваіх уладальнікаў архівы часта станавіліся прадметам куплі-продажу і разыходзіліся па руках калекцыянераў. Напрыклад, частка дакументаў **Ігната Анацэвіча** (6 сховішчаў) (уключаючы дакументы з архіваў Пецярбурга, Кёнігсберга, Дзярэчына, Пулаў, ліставанне Станіслава Панятоўскага, папскія булы, дакументы па гісторыі дома Ягелонаў, дакументы аб дыпламатычных зносінах Расіі і Польшчы ў XVI–XVIII стст. ды інш.) была перададзена калекцыянеру К. Свіндзіцкаму. Іншая частка патрапіла да гродзенскага калекцыянера Слізня. Некаторыя дакументы апынуліся ў зборы Эдварда Рачынскага і Рамуальда Падбярэзскага.

Рукапісная спадчына **Міхала Баброўскага** разышлася па руках адразу пасля яго смерці (найбольшая колькасць – да бібліяфіла Ў. Трэнбіцкага). Неапублікаваныя рукапісы Ігната Даніловіча былі набытыя Яўстахам Тышкевічам для Віленскага музея старажытнасцей у 50-я гг. XIX ст.

*2-гі этап: другая палова XIX – пачатак XX ст. – ўсведамленне неабходнасці сталага захоўвання асабістых архіваў у бібліятэках, музеях, архівах і прыватных калекцыях.* У бібліятэку Віленскага ўніверсітэта на пачатку стагоддзя па ініцыятыве рэктара, астранома і матэматыка Яна Снядэцкага паступілі дакументы гісторыкаў Мацея Догеля (1715–1760) і Яна Альбертрандзі (1731–1808), Тадэвуша Чацкага (1765–1813), архіў матэматыка і астранома з Брэслау Іагана Шэйбеля. У другой палове XIX ст. пачалося стварэнне сховішчаў, якія значна садзейнічалі захоўванню дакументаў выдатных дзеячаў краю. Як правіла, гэта была прыватная ініцыятыва, якая гуртавала вакол сябе прадстаўнікоў мясцовай інтэлектуальнай эліты. Так, у 1856 г. у Вільні былі адчынены Музей старажытнасцяў і Віленская археалагічная камісія пад кіраўніцтвам Яўстаха Тышкевіча. Яе супрацоўнікамі з’яўляліся Тэадор Нарбут, Юзаф Крашэўскі, Мікалай Маліноўскі, Ігнат Ходзька, Платон Кукальнік, Адам Кіркор, Іосіф Ярашэвіч ды інш.

Пра неабходнасць сістэматычнага захоўвання дакументаў асабістага паходжання ў другой палове XIX ст. заявілі два выбітных калекцыянера і навукоўцы Міхал Федароўскі і **Аляксандр Ельскі**. У прыватнасці А. Ельскі ў адным са сваіх артыкулаў, прысвечаных стогадоваму юбілею Адама Міцкевіча, пісаў: *«Немцы да такой ступені апекаваліся спадчынай сваіх песняроў, што нават дакладна запісалі колькасць бялізны, што засталася пасля вялікага Шылера ці знакамітага Гётэ. Ці ж не павінны і мы на раздарожжах лёсу паважна ставіцца да духоўнай спадчыны і памятак нашых вялікіх вешчуноў?»*

Найбольш вядомай на беларускіх землях у сярэдзіне XIX ст. была калекцыя Аляксандра Ельскага (1834–1916) у Замосці, якая налічвала больш за 20 тыс. аўтографаў знакамітых асоб з усёй Еўропы. Тут захоўваліся часткі асабістых архіваў Адама Міцкевіча, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Адама Кіркора (каля 5 тыс. лістоў), Станіслава Манюшкі, братоў Францішка і Антонія Смуглевічаў, фамільныя архівы Прозараў, Ельскіх, Заранкаў, Хмараў ды інш. Акрамя таго Аляксандр Ельскі збіраў дакументы філаматаў, зрабіў апісанне асабістага архіва Казіміра Пясецкага, шкадаваў, што не здолеў здабыць дзённік Дз. Манюшкі, які мусіў быць «каштоўнай крыніцай [гісторыі] пераважна мясцовасці, дзе жыў і дзейнічаў Манюшка, яшчэ напалеонаўскага перыяду». Па сведчанні калегі і біёграфа А. Ельскага Ю. Талькі-Грынцэвіча: *«У паперах, што засталіся пасля Ельскага, ёсць сорак папак, дзе змяшчаюцца яго нататкі, манаграфіі, запіскі і карэспандэнцыі аб людзях і фактах. З цягам часу яны будуць мець вялікую каштоўнасць для гісторыі»,* – па сутнасці гэта апісанне асабістага архіва самога калекцыянера. Для сваіх збораў Аляксандр Ельскі распрацаваў пэўную сістэматызацыю. Таксама праводзілася іх навукова-тэхнічная апрацоўка. Фамільныя архівы, уключаючы асабіста-сямейныя, публічныя і маёнткава-гаспадарчыя дакументы захоўваліся ў фасцыкулах і звязках, а таксама мелі інвентары ці сумарыушы.

Калекцыя была сістэматызаваная па тэматычна-асабоваму прынцыпу і ўключала больш за 100 тэматычных раздзелаў. Сярод іх варта назваць наступныя: «Літоўскія ваяводы і кашталяны», «Польская філасофія», «Рускія саноўнікі і духоўныя асобы», «Царская папка», «Французская папка», «Падзеі 1861–1863 гг.» ды інш. У раздзелах дакументы былі згрупіраваны па папках, на кожнай з якіх пазначалася прозвішча і імя асобы, сфера яго дзейнасці, а таксама змест і дата дакумента. Прозвішчы падкрэсліваліся чырвоным алоўкам, ставілася пячатка «Biblioteka i museum Aleksandra Jelskiego w Zamościu». Музей, аднак, не захаваўся да нашага часу, бо большая частка збору загінула ў часы грамадзянскай вайны ў 1917–1921 гг. у беларускіх землях. Зберагліся толькі тыя рукапісы, экспанаты і малюнкі, якія ў 1900 г. сам Ельскі падараваў Ягелонскаму ўніверсітэту ў Кракаве, — каля 20 000 адзінак. Зберагліся некаторыя рукапісы, якія Ельскі падараваў у 1907 г. архіву Таварыства сяброў навук у Вільні (эпісталярная спадчына Адама Кіркора). Частка рукапісных і кніжных збораў трапіла ў музеі і архівы Мінска (у Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва ёсць невялічкі фонд Ельскага, матэрыялы якога былі перададзены пасля Другой сусветнай вайны з Масквы) і Варшавы (фонд

Прозараў і Ельскіх у Галоўным архіве старажытных актаў). Частка рукапісаў Ельскага знаходзіцца ў фондзе папер Мітрафана Доўнар-Запольскага ў Цэнтральным гістарычным архіве Украіны ў Кіеве, а рукапіс Ельскага «Паведамленне пра беларускія казанні» — у Цэнтральным гістарычным архіве Украіны ў Львове[8].

Менавіта Аляксандр Ельскі і Міхал Федароўскі ўпершыню паставілі пытанне аб неабходнасці захавання дакументальнай спадчыны асобы і сям'і. Ствараліся спісы наяўных і страчаных архіўных, бібліятэчных, мастацкіх збораў. Канстатуючы факты знішчэння цэлага шэрагу фамільных архіваў пасля 1863 г. **Міхал Федароўскі** лічыў галоўнай прычынай тое, што *«злачынцы-ўнукі не перанялі ад сваіх дзядоў іх паважлівага стаўлення да старажытных дакументаў»*[9].

Каштоўнасць асабістых архіваў узрасла падчас пошуку альтэрнатыўных крыніц памяці. У другой палове XIX ст. пытанне аб неабходнасці захоўвання асабістых архіваў як каштоўнай крыніцы па гісторыі філасофіі і духоўных рухаў было ўзнята прадстаўніком «філасофіі жыцця» **Вільгельмам Дзільтэем.** У артыкуле «Літаратурныя архівы і іх значэнне для вывучэння гісторыі філасофіі» (1889) аналізавалася карціна страты шэрагу архіваў і цяжкасці іх выкарыстання на прыкладзе архіваў Імануіла Канта, Хрыстыяна Вольфа, Лацаруса Морыца ды інш. Між іншым у артыкуле адзначалася: *«Рукапісы выдатных духоўных дзеячаў, якіх дала Германія з часоў Гуманізму і Рэфармацыі, у большасці сваёй загінулі па прычыне існаваўшага да іх непаважлівага стаўлення… Калі супаставіць вялізнае значэнне, якое маюць рукапісы для гісторыі філасофіі і духоўных рухаў, і тую бесклапотнасць, якая панавала ў адносінах да іх, калі паглядзець на абумоўленае ёю знішчэнне большай часткі найважнейшых рукапісаў і рукапісных збораў, то ва ўсіх зацікаўленых асобаў узнікае жаданне, як мага хутчэй пакласці канец такому невыноснаму становішчу».*

Вельмі клапатліва ставіўся да свайго асабістага архіва загадчык Віленскага цэнтральнага архіва старажытных актавых кніг **Іван Спрогіс** (1833–1918). Яго архіў утрымліваў багатае ліставанне, дзённікі, якія адлюстроўвалі не толькі інтэлектуальнае, духоўнае і культурнае жыццё г. зв. «рускай Вільны», але і стасункі з вядомымі навукоўцамі таго часу ў кантэксце гістарычных і ідэалагічных узаемадзеянняў. Перад самай вайной у лістах да свайго сябра Аляксандра Жыркевіча Іван Спрогіс ставіў пытанне аб лёсе свайго архіва, мяркуючы яшчэ пры жыцці перадаць яго ў Віленскую публічную бібліятэку. Гэта выклікала даволі рэзкую рэакцыю А. Жыркевіча:

*«Ваше распоряжение при вашей жизни явно несообразно с литературными обычаями… Только когда пройдет 25–50 лет после вашей смерти можно разрешить ими пользоваться, а так при жизни Вы наживете себе врагов…*

---

[8] Запартыка Г. В. Да гісторыі калекцыі аўтографаў з бібліятэкі і музея старажынасцей А. К. Ельскага ў Замосці // Беларускі археаграфічны штогоднік. / рэд. кал. Р. П. Платонаў (гал. рэд.) [ды інш.] – Мінск, 2001.– Вып. 2. – С. 55-86.

[9] Federowski M. O lekkomyślem niszczeniu starych dokumentów // Księga pamiąkowa na uczenie setnej rocznicy urodzin Adama Mickiewicza 1798–1898. – Tt. 1–2. – Warszawa-Peterburg-Kraków, 1899. – T. 2. – S. 16

*Убедительно прошу Вас во всяком случае вернуть мне мои письма, не позволяя рыться в них посторонним… Я ничего не буду иметь против, если вы соберете и при мне уничтожите, т.е. сожжете, дав мне их предварительно пересмотреть и перечитать» Аляксандр Жыркевіч, 1913.*

У выніку Іван Спрогіс, каб захаваць канфідэнцыяльнасць перадаў дзевяць сшыткаў сваіх дзённікаў на захоўванне А. Жыркевічу з умовай перадаць іх пасля сваёй смерці ў Віленскую публічную бібліятэку. Трэба меркаваць, што сам архіў быў перададзены ў бібліятэку да 1915 г., калі бібліятэка была вывезена ў сувязі з наступленнем нямецкіх войскаў. Пазней яе зборы папоўнілі фонд Бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта. Аляксандр Жыркевіч не выканаў запавет Івана Спрогіса адносна дзённікаў, і яны трапілі на захоўванне ў Дзяржаўны гістарычны архіў Латвіі[10].

### 1.2.2. Тэарытычныя і метадычныя асновы захоўвання архіваў асабістага паходжання ў савецкім архівазнаўстве

Пасля ўсталявання савецкай улады на тэрыторыі былой Расійскай імперыі востра паўстала пытанне аб стварэнні новай сістэмы захоўвання архіўных дакументаў, як былых афіцыйных установаў, так і прыватных архіваў. Паводле дэкрэту СНК РСФСР «Аб рэарганізацыі і цэнтралізацыі архіўнай справы ў РСФСР» (1918) з дакументаў былых імперскіх установаў на аснове прынцыпу цэнтралізацыі ствараўся Адзіны дзяржаўны архіўны фонд (АДАФ). У 1919 г. была зроблена спроба пачаць збор дакументаў асабістага паходжання (асабістых, сямейных, сядзібных архіваў) і ўключыць іх у склад АДАФ. Пры Галоўархіве РСФСР было створана сховішча прыватных архіваў. Нацыяналізацыя асабістых архіваў творчай эліты адбылася з прыняццем 29 чэрвеня 1919 дэкрэта «*Аб адмене прыватнай уласнасці на архівы памерлых рускіх пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў і вучоных, што захоўваюцца ў бібліятэках і музеях*». Дэкрэты, прынятыя ў 1923 г., прадугледжвалі абавязковую перадачу ў архівасховішчы Цэнтрархіва дакументаў сям'і Раманавых, а таксама г.зв. «дзеячаў контррэвалюцыі» і эмігрантаў. Аб неабходнасці ашчаднага стаўлення да дакументаў асабістага паходжання было заяўлена ў вядомай праграмнай брашуры У. Бонч-Бруевіча «Захоўвайце архівы» (1920). Між іншым у ёй адзначалася неабходнасць *«старанна захоўваць архівы прыватных асоб, асабліва архівы, якія знаходзяцца ў маёнтках былых землеўладальнікаў, таму што шмат хто з іх займаўся зборам матэрыялаў па розных пытаннях, а таксама ліставання з выдатнымі дзеячамі свайго часу»*.

---

[10] Іванова В.С. З асабістага архіва І.Я. Спрогіса (лісты Дз. І. Даўгялы да І.Я. Спрогіса ў Бібліятэцы Віленскага універсітэта) // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 11. / гал. рэд. Э.М. Савіцкі [і інш.] – Мінск, 2010. – С. 177–190; Іванова, В. Асабістыя архівы ў Латвійскіх сховішчах як крыніца па гісторыі Беларусі / В. Іванова // Сучасныя праблемы дакументазнаўства, архівазнаўства і археаграфіі: матэрыялы навук.-практ. канф., прысвеч. 85-годдзю Дзярж. архіўн. службы і 80-годдзю Нац. архіва Рэсп. Беларусь. (Мінск, 12 красавіка 2007) / склад. В.С. Пазднякоў, П.П. Журкевіч. – Мінск, 2007. – С. 162–168.

Шэраг заканадаўчых актаў, прынятых у першыя гады савецкай улады, па ацэнках сучасных даследчыкаў спынілі тэндэнцыю рэвалюцыйнага знішчэння, але адначасна яны ж стварылі базу для прымусовай нацыяналізацыі дакументаў у жорстка цэнтралізаванай сістэме архіўнага захоўвання. Цэнтрархіў інтэнсіўна папаўняўся матэрыяламі. Быў складзены пералік з 700 вядомых у дарэвалюцыйнай Расіі сядзібных архіваў. У 1920-я гг. рукапісныя аддзелы Пецярбургскай публічнай бібліятэкі, Румянцаўскага музея, Пушкінскага дома павялічыліся амаль удвая за кошт дакументаў асабістага паходжання. Была створана вялікая колькасць музеяў, якія захоўвалі асабістыя архівы дзеячаў рэвалюцыйнага руху, членаў камуністычнай партыі ды інш.

На канферэнцыі архівістаў 1921 г. па дакладу І.Л. Маякоўскага было вырашана стварыць міжведамасны савет з прадстаўнікоў Галоўархіва, Галоўмузея і Аддзела бібліятэк для распрацоўкі інструкцыі для работы і размежавання функцый дадзеных устаноў. І і ІІ з’езды архівістаў РСФСР (1926, 1929) прынялі рашэнні аб спыненні працы музеяў і бібліятэк па збіранні дакументаў асабістага паходжання і перадачы апошніх у дзяржаўныя архівы.

У 1925 г. калегія Цэнтрархіва РСФСР прыняла Палажэнне аб арганізацыі АДАФ, у адпаведнасці з якім дакументы асабістага паходжання захоўваліся ў Архіве народнай гаспадаркі, культуры і быту, Аддзеле прыватных фондаў Сховішча старажытных актаў, Архіве рэвалюцыі і знешняй палітыкі ды інш. У 1926 г. СНК РСФСР прыняў пастанову аб здачы ў Цэнтрархіў усіх былых прыватных архіваў, замацаваўшы яго права на захоўванне дакументаў такога кшталту, якое аспрэчвалася шэрагам устаноў. У 1927 г. было заключана пагадненне паміж Галоўархівам і Галоўнавукай аб перадачы дакументаў асабістага паходжання ў архівы. У канцы 1920-х гг. стала актуальным пытанне аб захоўванні асабістых архіваў дзеячаў літаратуры або г. зв. *літаратурных архіваў*. На ІІ з’едзе архівістаў (1929) у сувязі з дакладам У. В. Максакава было прынята рашэнне аб стварэнні ў Маскве Архіва гісторыі літаратуры. У гэтым жа годзе калегія Цэнтрархіва зацвердзіла правілы прыёму на захоўванне архіўных матэрыялаў ад прыватных асоб.

Пераўтварэнне Дзяржаўнага літаратурнага музея ў Цэнтральны дзяржаўны літаратурны архіў адбылося ў 1941 г. У справе захоўвання асабістых архіваў дзеячаў літаратуры СССР асабліваe значэнне мела ўзнікненне ў другой палове 1930-х гг. г. зв. «адзіных архіваў» (ці мемарыяльных музеяў) Аляксандра Пушкіна, Льва Талстога, Аляксея Горкага ў Расіі, Тараса Шаўчэнкі і Івана Франко ва Украіне. У 1930 г. быў створаны Архіў АН СССР, што захоўваў асабістыя архівы акадэмікаў і навукоўцаў, якія працавалі ў сістэме навукова-даследчых устаноў АН СССР. У 1941 г. у Палажэнні аб ДАФ СССР было замацавана права дзяржаўных архіваў на камплектаванне дакументамі асабістага паходжання грамадскіх і дзяржаўных дзеячаў СССР, выдатных прадстаўнікоў навукі, літаратуры, мастацтва, працаўнікоў гаспадаркі, Герояў Сацыялістычнай працы, прадстаўнікоў асобных дваранскіх фамілій. Вызначаліся асноўныя катэгорыі дакументаў, якія падлягалі дзяржаўнаму захоўванню. Да іх належалі афіцыйнае і прыватнае ліставанне, рукапісы твораў, мемуары і дзённікі, кінафотафонадакументы.

Пытанне аб захоўванні асабістых архіваў сучаснікаў, сведкаў ці ўдзельнікаў гістарычных падзей было ўпершыню пастаўлена на Ўсесаюзнай канферэнцыі гісторыкаў-архівістаў, прысвечанай 25-годдзю савецкай архіўнай справы ў чэрвені 1943 г. Рэзалюцыя, прынятая па дакладу У. Максакава, ставіла задачу збірання дакументаў грамадзян адзначаных узнагародамі савецкага кіраўніцтва.

Улетку 1958 г. на нарадзе працаўнікоў архіўных установ В. М. Скварцова ўпершыню выказала ідэю аб стварэнні адзінага навукова-даследчыцкага цэнтра для распрацоўкі праблем, звязаных з сістэматызацыяй і фандзіраваннем дакументаў асабістага паходжання.

У 1957 г. Галоўархіў СССР сумесна з іншымі навуковымі ўстановамі пачаў распрацоўку даведніка, які б адлюстроўваў аб'ёмы і структуру фондаў асабістага паходжання, што захоўваліся ў дзяржаўных сховішчах СССР[11].

У падрыхтаваных трох тамах змяшчаліся звесткі аб асабістых фондах і калекцыях больш чым 500 сховішчаў СССР. Гэта былі дзяржаўныя і акадэмічныя архівы, бібліятэкі, музеі, установы Міністэрстваў культуры і асветы па стану з 1957 па 1975 гг. У пачатку 1960-х гг. у саюзных рэспубліках па ўзору ЦДАЛМ СССР пачалі ўзнікаць спецыялізаваныя дзяржаўныя ўстановы для захоўвання асабістых архіваў – архівы літаратуры і мастацтва. Першым у 1960 г. пачаў працу архіў у Беларусі, у 1966 г. – ва Ўкраіне і Азербайджане, у 1968 г. – у Літве, у 1969 г. – у Ленінградзе, у 1970 г. – у Грузіі, у 1986 г. – у Арменіі. Да канца 1980-х гг. у СССР дзейнічала восем архіваў літаратуры і мастацтва, два з якіх (у Беларусі і Украіне) набылі статус архіва-музея. Яны атрымалі шырокія магчымасці для ажыццяўлення экспазіцыйнай дзейнасці. Найвялікшым сярод пералічаных архіваў з'яўляўся Архіў літаратуры і мастацтва ва Украіне (1103 фонды асабістага паходжання). Гэты архіў меў таксама свой філіял – Літаратурна-мемарыяльны дом-музей А. Карнейчука (1972).

У канцы 1950-х – першай палове 1960-х гг. на старонках перыядычных выданняў і падчас канферэнцый разгарнулася шырокае тэарэтычнае абмеркаванне праблем камплектавання архіваў фондамі асабістага паходжання. У выніку былі акрэслены асноўныя праблемы дадзенага накірунку, менавіта прыём на дзяржаў нае захоўванне малакаштоўных фондаў і неабходнасць вызначэння крытэрыяў каштоўнасці асабістых фондаў, адсутнасць у архівах асабістых фондаў працаўнікоў гаспадаркі, удзельнікаў Другой сусветнай вайны, раскіданасць асабістых архіваў па розных сховішчах ды інш.

У 1958 г. ГАУ СССР на падставе досведу працы з дакументамі асабістага паходжання дзяржаўных архіваў, Аддзела рукапісаў Дзяржаўнай бібліятэкі ім. У. Леніна, Цэнтральнага партыйнага архіва Інстытута марксізму-ленінізму пры ЦК КПБ, Архіва АН СССР была распрацавана інструкцыя па навукова-тэхнічнай апрацоўцы, дзе ўпершыню на міжведамасным узроўні былі сфармуліраваны асноўныя паняцці і вызначаны этапы працы з архівамі асабістага паходжання пры іх паступленні на дзяржаўнае захоўванне. Метадычныя рэкамендацыі па працы з дакументамі асабістага паходжання, створаныя прадстаўнікамі архіваў, музеяў і

[11] Личные архивные фонды в государственных хранилищах СССР: указатель: в 3-х тт./ ред. кол. Ю. И. Герасимова и др.; сост. Э. В. Колосова и др. – М., 1962– 1980. – Т. 1–3.

бібліятэк, грунтаваліся на аднастайнасці падыходаў у вызначэнні фонду асабістага паходжання, яго складу, правілаў уліку і захоўвання ў адпаведнасці з заканадаўствам аб ДАФ СССР.

У маі 1963 г. пры ГАУ СССР з прадстаўнікоў архіўнага ўпраўлення, Акадэміі навук, Міністэрства культуры ды іншых устаноў быў створаны Міжведамасны навукова-метадычны савет па набыцці дакументаў ва ўласнасць дзяржавы. Яго асноўнай функцыяй стала выяўленне і цэнтралізаваны ўлік асабістых архіваў і калекцый, а таксама іх размеркаванне па дзяржаўных сховішчах.

18–22 мая 1965 г. у Маскве ГАУ СССР быў праведзены Ўсесаюзны семінар па камплектаванні дзяржаўных архіваў дакументамі асабістага паходжання, які выявіў значную цікавасць з боку архівістаў да дадзенай праблемы. Адным з найбольш дыскусійных стала пытанне аб неабходнасці браць на захоўванне асабістыя архівы «простых» людзей. У выніку быў распрацаваны спіс катэгорый архіваўтваральнікаў, вызначаліся крыніцы камплектавання. *У максімальным аб'ёме было прызнана мэтазгодным прымаць толькі дакументы найбольш вядомых асоб.* Уключэнне той ці іншай асобы ў спіс камплектавання было абумоўлена наяўнасцю ў яго ўзнагарод, званняў, дасягненняў у творчай або прафесійнай дзейнасці, сваяцкіх сувязяў з выдатнымі асобамі, а таксама наяўнасцю ў іх каштоўных збораў дакументаў. З архіваў «актыўных, але шэраговых членаў грамадства» рэгіянальным архівам было прапанавана ствараць калекцыі.

Таксама ўпершыню быў вызначаны склад дакументаў, што прымаліся на захоўванне, уводзіўся іх падзел на дакументы ўсесаюзнага, рэспубліканскага і мясцовага значэння, на дакументы асоб розных сфер дзейнасці, была распрацавана схема сістэматызацыі ўнутры фонду.

У 1976–1977 гг. абмеркаванне пытання аб асабістых архівах і іх значэнні ў кантэксце захавання культурнай спадчыны разгарнулася на старонках «Литературной газеты» і прыцягнула ўвагу грамадскасці да неабходнасці беражлівага стаўлення да архіўнай спадчыны. Дыскусія пачалася з артыкула загадчыцы аддзела рукапісаў Дзяржаўнай бібліятэкі СССР С. Жытомірскай «Што мы пакінем у спадчыну?» і сканцэнтравалася на праблеме захоўвання дакументаў не толькі выдатных асоб, але і «простых» людзей. Гэту ідэю падтрымалі пісьменнікі Г. Шторм, Н. Эйдельман, Я. Гордзін ды інш. Тым не менш намеснік дырэктара Цэнтральнага дзяржаўнага архіва народнай гаспадаркі (ЦДАНГ) У. Цаплін і супрацоўнік Цэнтральнага дзяржаўнага ваенна-гістарычнага архіва (ЦДВГА) А. Шнэйдэр з пункту гледжання архівістаў-практыкаў адзначылі, што захапленне збіральніцтвам прывядзе да перагрузкі архіваў. Яны палічылі немэтазгодным камплектаванне архіваў вялікай колькасцю дакументаў шараговых грамадзян, назваўшы іх «макулатурай асабістага паходжання».

Да канца 1980-х гг. у саюзных, рэспубліканскіх, абласных і краявых архівах было сканцэнтравана каля 9 тысяч фондаў асабістага паходжання (каля 1 млн. адз. зах.). Штогод гэта колькасць павялічвалася на 80–100 тысяч адз. зах. З гэтага шэрагу 51% складалі фонды дзеячаў літаратуры і мастацтва, 20% – дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, 13% – удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай

і Другой сусветнай войнаў, 10% – вучоных розных галін; 6% – працаўнікоў гаспадаркі.

### 1.2.3. Збіранне і захоўванне архіваў асабістага паходжання Беларусі ў савецкі перыяд

*3-ці этап захоўвання архіваў асабістага паходжання ў Беларусі – гэта 20-30-я гг. XX ст. – пачатак сістэматычнага камплектавання дзяржаўных сховішчаў дакументамі асабістага паходжання.* У 1920-я гг., як і ва усім СССР, ў БССР быў распачаты шырокі пошук і канцэнтрацыя архіўных дакументаў у дзяржаўных сховішчах на прынцыпах цэнтралізацыі. Працаўнікі архіваў, бібліятэк, музеяў пачалі абследаванне зруйнаваных сядзіб. Сядзібы – унікальная з’ява сацыяльна-культурнага жыцця Беларусі XIX – пачатку XX ст., – захоўвалі вялікую колькасць бібліятэчных, архіўных і музейных каштоўнасцей, а сядзібныя архівы сталі асяродкам зберажэння не толькі маёнткавых і сямейных дакументаў, але таксама калекцый гістарычных матэрыялаў, творчай і навуковай спадчыны асобы. Праблемай захоўвання і ўзнаўлення страчанай дакументальнай спадчыны прыватных архіваў заняліся ў гэты перыяд вучоныя гісторыкі і архівісты І. Барашка, М. Мялешка, А. Шлюбскі, грамадскія і культурныя суполкі і ўстановы.

У 1920–1930-я гг. своеасаблівым цэнтрам збірання асабістых архіваў дзеячаў беларускай літаратуры і мастацтва стаў **беларускі аддзел Дзяржаўнай бібліятэкі БССР**. З бібліятэкай супрацоўнічалі такія выдатныя дзеячы таго часу як рэжысёр Еўсцігней Міровіч, музыказнаўца Юльян Дрэйзін, рэжысёр Уладзіслаў Галубок, грамадскі дзеяч і пісьменнік Язэп Дыла, паэты Язэп Пушча, Уладзімір Жылка, пісьменнік Змітрок Бядуля. Працаўнікамі бібліятэкі былі Станіслаў Шушкевіч, Яўгенія Пфляўмбаўм, Зміцер Астапенка, Мікола Улашчык ды інш., што клапаціліся аб захоўванні дакументальнай спадчыны і стварылі пэўны культурны асяродак. Янка Купала передаў загадчыцы аддзела беларускай літаратуры Ю. Бібіле свае рукапісы: «Аднойчы адчыняюцца дзверы аддзела і з’яўляецца Купала: у адной руцэ адмысловы кіёк, у другой вялікі пачак папер. Перадаючы яго мне, ён сказаў: *«Гэта мае рукапісы. У вас яны лепей захаваюцца»*. Гэта былі рукапісы зборнікаў «Жалейка», «Шляхам жыцця» і асобныя дакументы. У гэты ж час вучоным і мовазнаўцам Язэпам Лёсікам, які займаўся разборам літаратурнай спадчыны Каруся Каганца і публікацыяй яго твораў, у Дзяржаўную бібліятэку быў перададзены асабісты архіў пісьменніка. З 1931 г. тут захоўваліся таксама некаторыя рукапісы Цішкі Гартнага (Зміцера Жылуновіча), а з 1940– 1941 гг. – Змітрака Бядулі (Самуіла Плаўніка).

У 1920-х гг. навуковыя сілы Беларусі канцэнтраваліся ў асноўным вакол **Інстытута Беларускай культуры (Інбелкульта),** які меў права ствараць архівы, музеі і бібліятэкі, праводзіць навуковыя канферэнцыі, арганізоўваць раскопкі і экспедыцыі. Першапачаткова ў 1921 г. у складзе Наркамасветы быў створаны Акадэмічны цэнтр, які аб’яднаў вучоных, што мелі дачыненне да вывучэння і аховы гісторыка-культурнай спадчыны, кіраваў дзейнасцю навукова-даследчых, мастацкіх устаноў, меў музейную, бібліятэчную і архіўную камісіі. Заснаваная ў 1925 г. у яго складзе Літаратурная секцыя і адпаведная Камісія збіралі рукапісы

беларускіх пісьменнікаў. Тут захоўваліся дакументы Аляксандра Прушынскага, Антона Лявіцкага і Паўлюка Труса. Гісторыка-археалагічная секцыя набыла рукапісы, што засталіся пасля смерці музыканта А. Чартовіча. Сюды былі перададзены М. Каспяровічам з Віцебска – рукапісы Івана Насовіча, Адамам Багдановічам з Яраслаўля – рукапісы сына Максіма, з Віцебскага музея – копіі лістоў Яна Баршчэўскага, з Бабруйска – сшытак з творамі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча («Гапон» і некалькі асобных вершаў). Пры мастацкай секцыі, якую ўзначальваў Язэп Дыла, у 1925 г. была арганізавана Гістарычна-музейная камісія, што актыўна збірала матэрыялы па гісторыі тэатра ў Беларусі і распрацавала дзеля гэтага спецыяльныя абвесткі.

У 1930-х гг. у БССР падчас рэпрэсій асабістыя архівы пісьменнікаў і дзеячаў культуры часта знішчаліся, канфіскоўваліся, асядалі ў архівах НКУС, ці станавіліся аб’ектам куплі-продажу. Так, у асабістым архіве літаратуразнаўцы Лукаша Бэндэ захаваліся дакументы рэпрэсаваных паэтаў і пісьменнікаў Сяргея Грахоўскага, Максіма Гарэцкага, Уладзіміра Дубоўкі, Янкі Журбы (Івана Івашына), Язэпа Пушчы (Іосіфа Плашчынскага) ды інш.

Адным з першых сховішчаў асабістых архіваў беларускіх грамадскіх, палітычных і культурных дзеячаў стаў **Беларускі музей імя Івана Луцкевіча ў Вільні**, арганізаваны ў 1921 г. У аддзеле рукапісаў музея знаходзіліся часткі асабістых архіваў Алаізы Пашкевіч (Цёткі), Вацлава Ластоўскага, Браніслава Тарашкевіча, Аляксандра Цвікевіча, Кляўдуша Душ-Душэўскага, Лявона Дубейкоўскага, Паўла Жаўрыда, братоў Івана і Антона Луцкевічаў, Аркадзя Смоліча ды інш. Таксама там апынуліся аўтографы, рукапісы беларускіх паэтаў, пісьменнікаў, мовазнаўцаў і фалькларыстаў Яна Чачота, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Адама Гурыновіча, Янкі Лучыны, Якуба Коласа, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Максіма Танка, Піліпа Пестрака, Змітрака Бядулі, Міхася Машары, Максіма Гарэцкага, Еўдакіма Раманава. Знаходзіліся тут і часткі фамільных архіваў Тышкевічаў (XVI–XIX стст.), Сапегаў (1571–1728), Радзівілаў (XVII–XVIII стст.), Кастравіцкіх (1600–1837), Касцюшкаў (1530–1906).

Паводле сведчання загадчыка музея Янкі Шутовіча, беларускія творцы пакідалі свае дакументы на часовае захоўванне, а потым мелі магчымасць забраць іх. У адпаведнасці з вопісам, што быў складзены супрацоўнікамі музея ў 1944 г., у скрынках №№ 28–31 захоўваліся дакументы амаль 70-ці дзеячаў, у тым ліку комплекс дакументаў, што застаўся пасля смерці Францішка Аляхновіча. Гэта адзін з найболь вядомых збораў дакументаў асабістага паходжання міжваеннага перыяда[12].

*4-ы этап: 50-80-я гг. XX ст. – стварэнне сістэмы камплектавання дзяржаўных архіваў дакументамі асабістага паходжання*. Другая сусветная вайна прынесла значныя страты дакументальнай архіўнай спадчыне Беларусі, якая скарацілася амаль удвая. Асноўныя цэнтры канцэнтрацыі асабістых архіваў – Дзяржаўная бібліятэка БССР, Акадэмія навук БССР і Беларускі музей імя Івана

[12] Падрабязней гл.: Іванова В. Віленскі беларускі фонд: гісторыя, склад і сумежныя дакументы // Запісы БІНІМ. – Вып. 43. – С. 470–501.

Луцкевіча ў Вільні – прыпынілі сваю працу. Фонды бібліятэкі, у т. л. і рукапісныя, былі амаль цалкам знішчаны. Вайна знішчыла багатыя калекцыі Рамуальда Зямкевіча, Юзава Галомбкі, архівы Міхала Бабpоўскага, паэтаў і пісьменнікаў Францішка Багушэвіча, Максіма Багдановіча, Вінцэся Каратынскага, грамадска-палітычнага дзеяча Алеся Бурбіса, архівіста і гісторыка Баляслава Брэжгі ды інш.

Дзяржаўныя архівы Беларусі ў першай палове XX ст. амаль не камплектаваліся асабістымі архівамі. Гэты працэс фактычна пачаўся толькі ў другой палове XX ст. У 1945 г. у аддзелы сакрэтных фондаў ЦДАКР усіх савецкіх рэспублік, у т. л. і БССР, паступілі спецыяльна распрацаваныя схемы агляду фондаў асабістага паходжання, дзе была дадзена характарыстыка іх асаблівасцяў, вызначаны спіс асоб, чые архівы браліся на дзяржаўны ўлік, што значна паспрыяла іх захаванню. На сакрэтным захоўванні ў ЦДАКР БССР знаходзіліся дакументы «буржуазных нацыяналістаў» К. Езавітава, В. Русака, У. Сядуры, Т. Грыба, Ант. Адамовіча, А. Салаўя.

У верасні 1945 г. у Гомельскім абласным дзяржаўным архіве захоўваўся адзін фонд асабістага паходжання Румянцавых-Паскевічаў. У 1946 г. пры разборы архіва, вернутага з г. Мыславіцы (Польшча) былі знойдзены рукапісы вершаў Янкі Купалы, якія ў далейшым былі перададзены ў музей паэта. Пазней фондамі асабістага паходжання пачаў камплектавацца Дзяржаўны архіў Мінскай вобл., куды першапачаткова былі прыняты дакументы былога Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў, фамільны архіў князёў Друцкіх-Любецкіх, а таксама асабісты фонд беларускага калекцыянера і публіцыста Аляксандра Ельскага. Да канца 1950-х гг. на захоўванні ў дзяржаўных архівах БССР знаходзіліся ў асноўным фамільныя фонды, некалькі асабістых фондаў грамадскіх дзеячаў, і цалкам адсутнічалі асабістыя фонды дзеячаў навукі і культуры.

У 1956 г. кіраўнік дзяржаўнай архіўнай службы БССР А.І. Азараў, упершыню ў складзе савецкай дэлегацыі ўдзельнічаў у III Міжнародным кангрэсе архіваў у Фларэнцыі, дзе таксама закраналася праблема захоўвання прыватных архіваў. У межах падрыхтоўкі да кангрэсу было зроблена кароткае паведамленне аб шляхах і стане захоўвання прыватных архіваў у БССР. У маі 1958 г. А. І. Азараў прыняў удзел у працы IV Міжнароднай канферэнцыі круглага стала архіваў у Вісбадэне і Франкфурце-на-Майне (ФРГ), дзе разглядаліся праблемы захоўвання архіваў літаратуры і мастацтва. У падрыхтоўцы даклада з аглядам стану захоўвання дакументаў асабістага паходжання ў БССР удзельнічалі беларускія архівісты. Напрыканцы 1950-х гг. у сувязі з пастаноўкай задачы канцэнтрацыі асабістых фондаў архіўнай службай БССР была праведзена праца па абследаванні розных сховішчаў, а вынікі выкладзены ў грунтоўным дакладзе Таісы Анатольеўны Трухінай.

Гэтыя падзеі бясспрэчна аказалі значны ўплыў на працу беларускіх архівістаў у накірунку захоўвання дакументаў асабістага паходжання, якая была шырока разгорнута пачынаючы з 1958 г., а яе кульмінацыяй стала стварэнне 9 чэрвеня 1960 г. **Цэнтральнага дзяржаўнага архіва літаратуры і мастацтва БССР** – першага архіва такога кшталту сярод саюзных рэспублік.

Першым асабістым фондам прынятым у ЦДАМЛ на захоўванне стаў фонд вядомага беларускага паэта, удзельніка нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі Міхася Машары. Пасля былі прыняты дакументы М. Васілька, М. Засіма, А. Жаўрука, Я. Брайцава ды інш. Дырэктар архіва Клара Сцяпанаўна Жорава звярнулася да грамадскасці Беларусі з заклікам уважліва ставіцца да захоўвання дакументаў па гісторыі беларускай літаратуры і мастацтва, спрыяць пошуку такіх дакументаў. У адной з справаздач дырэктар адзначала: *“З першых дзён працы мы пачалі збіраць асабістыя архівы пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў… Шляхі збірання былі самыя розныя: асабістыя кантакты, афіцыйныя звароты да прадстаўнікоў беларускай культуры праз друк, пошукі праз друк і радыё, набыццё ў спадчыннікаў, мікрафільмаванне. У пачатку працы мы зрабілі шэраг паведамленняў аб мэтах і задачах працы архіва на сходах творчых работнікаў саюзаў рэдакцый і тэатрах. Шляхам асабістых дамоўленасцяў атрымалі дакументальныя матэрыялы ад М. Танка, А. Русака, М. Машары, У. Дубоўкі, артыстаў З. Бандарчык, Т. Давыдава, М. Цурбакова і інш… Паэт С. Шушкевіч падказаў некалькі адрасоў асоб, якія маюць дакументы. Атрымалася адшукаць і прыняць у архіў 23 лісты Якуба Коласа… Адказны рэдактар Саюза пісьменнікаў І. Нісневіч расказаў аб тым, што ў Маскве жывуць родныя беларускіх кампазітараў Клумава і Палонскага”.*

У 1976 г. ЦДАЛМ набыў статус архіва-музея і атрымаў магчымасць браць на захоўванне музейныя прадметы і арганізоўваць выставы. У адрозненне ад ЦДАЛМ СССР, створанага на базе багатых калекцый Дзяржаўнага літаратурнага музея, ён не меў такой спадчыны.

У 1968 г. з мэтай захавання творчай спадчыны выдатных дзеячаў навукі і культуры **Фундаментальнай бібліятэцы Акадэміі навук БССР** было даручана арганізаваць працу па збіранню асабістых архіваў, якую ўзначаліла загадчык аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Лідзія Іванаўна Збралевіч. 1969–1970 гг. пад яе кіраўніцтвам былі здзейснены экспедыцыі на поўдзень Беларусі. Дзякуючы гэтаму на захоўванне паступілі асобныя дакументы Ўладзіслава Сыракомлі і Георгія Каніскага. Пошукам і апрацоўкай асабістых фондаў у сектары рукапісаў доўгі час займалася Яніна Міхайлаўна Кісялёва. У выніку на захоўванне былі прынятыя вялікія комплексы дакументаў Максіма Гарэцкага, Янкі Шутовіча, Адама Станкевіча, Ларысы Геніюш, Мікалая Улашчыка і інш.

У пасляваенны час у **аддзеле рукапісаў Дзяржаўнай бібліятэкі** зборам дакументаў дзеячаў літаратуры і мастацтва займалася загадчык Ніна Ватацы. Асобныя дакументы (лісты С. Маршака і С. Шувалава) пасля вайны былі знойдзены сярод кніг, вывезеных з Германіі. З сабраных рознымі шляхамі дакументаў дзеячаў навукі і культуры была сфарміравана калекцыя, у якую ўвайшлі дакументы Уладзіміра Пічэты, Мітрафана Доўнар-Запольскага, Еўдакіма Раманава, Яўгена Хлябцэвіча.

Актыўны працэс камплектавання абласных і занальных архіваў Беларусі асабістымі архівамі распачаўся толькі ў канцы 1970-х гг. Хоць Дзяржаўныя архівы Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей пачалі прымаць на захоўванне дакументы асабістага паходжання яшчэ ў 1950 і 1966 г. Пасля навуковай

канферэнцыі 1974 г. па праблемах камплектавання дакументальнымі крыніцамі дзяржаўных архіваў СССР, ЦДАКР БССР дзяржаўныя архівы ў Гродне, Лідзе, Наваградку, Глыбокім, Мінску распрацавалі праграмы па выяўленні і ўзяцці на ўлік асабістых архіваў дзеячаў навукі, культуры і палітычнай сферы. Камплектаванне абласных і занальных архіваў дакументамі асабістага паходжання ішло па двух асноўных накірунках. Ствараліся асабістыя фонды і фарміраваліся калекцыі з малакалькасных асабістых архіваў якія, як правіла, мелі назву «Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху і грамадзянскай вайны ў Расіі, Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і Вялікай Айчыннай вайны, партызанскага руху, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі». У іх склад уключаліся дакументы дзеячаў вобласці ці раёна.

Мэтанакіраваны збор дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Другой сусветнай вайны ажыццяўляўся камісіяй створанай пры ЦК КП(б)Б, якой у 1943 г. быў створаны БДМГВАВ. Дзяржаўны музей БССР (цяпер Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі) і абласныя краязнаўчыя музеі пачалі прымаць на захоўванне дакументы з асабістых архіваў у першай палове 1960-х гг. Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры (ДМГБЛ) і Дзяржаўны музей гісторыі тэатральнай і музыкальнай культуры (ДМГТМК) камплектаваліся адпаведна з 1987 і 1990 гг. Цікавасць шырокай грамадскасці да праблем захоўвання асабістых архіваў значна пашырылася ў канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг.

Беларускія архівісты, гісторыкі, супрацоўнікі музеяў і бібліятэк вырашалі задачу пошуку і ўліку асабістых архіваў дзеячаў беларускай навукі і культуры ў БССР, саюзных рэспубліках і за мяжой. Найбольш значную ролю ў гэтым адыгралі кіраўнік архіўнай службы БССР А. Азараў, кіраўнік аддзела камплектавання АУ Т. Трухіна, дырэктары архіва літаратуры і мастацтва Клара Жорава, Ганна Сурмач, Ганна Запартыка, загадчыца аддзела рукапісаў акадэмічнай бібліятэкі Лідзія Збралевіч, загадчыца аддзела рукапісаў Дзяржаўнай бібліятэкі Ніна Ватацы, навукоўцы Адам Мальдзіс, Генадзь Каханоўскі, Генадзь Кісялёў, Віталь Скалабан, Надзея Вусава ды інш.

Цікавасць шырокай грамадскасці да праблем захоўвання асабістых архіваў значна пашырылася ў канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. Паводле ацэнкі дырэктара ЦДАМЛМ БССР Ганны Сурмач, асабістыя архівы ў гэты перыяд набылі асаблівую вагу: *«Большасць людзей на працягу свайго жыцця збірае і захоўвае звесткі пра сябе... Яны выяўляюць неардынарнасць асобы, яе асаблівасць і непаўторнасць. Нішто не дасць такога поўнага ўяўлення пра чалавека, як яго асабісты архіў... Пісьмы, паштоўкі, фотаздымкі будуць нагадваць пра той асяродак, у якім праходзіла жыццё чалавека, захоўваць памяць аб дарагіх яму людзях, ці наадварот пра тое, што ўскладняла яго жыццё...»*

У гэты час пачалося рассакрэчванне дакументаў і пошук архіваў рэпрэсаваных дзеячаў, пачалася шырокая праца па збіранні асабістых архіваў дзеячаў культуры, што апынуліся па-за межамі дзяржавы. Дзякуючы намаганням пісьменніка Барыса Сачанкі, паэта Сяргея Панізніка, навукоўцаў Лідзіі Савік, Адама Мальдзіса, дзейнасці Камісіі «Вяртанне» пры Беларускім фондзе культуры, архівістаў Ганны Сурмач, Ганны Запартыкі, родных і саміх утваральнікаў у

Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ) былі перададзены архівы спевака Міхася Забэйды-Суміцкага з Прагі, паэта Майсея Сяднёва і спевака Данчыка з ЗША, паэта Адама Гурыновіча з Польшчы, паэта П. Сакола, мастака, пісьменніка В. Целеша і мастака М. Калініна з Латвіі, С. Яновіча з Польшчы, А. Алехніка з Аўстраліі.

З распадам сацыялістычнага лагера, з’яўлення новых форм уласнасці і аслаблення жорсткай цэнтралізацыі архіўнай справы пачаўся пошук новых крыніц інфармацыі, якія б спрыялі пабудове новых нацыянальных дзяржаў. Права кожнага чалавека пакінуць аб сабе памяць увасобілася ў стварэнні і дзейнасці ў Маскве цэнтра дакументацыі «Народны архіў» (1988–2006), адным з асноўных накірункаў працы якога быў збор дакументаў асабістага паходжання (ліставанне, мемуары, асабістыя дакументы і г. д.) шэраговых грамадзян краіны. Збор крыніц, што адлюстроўвалі г. зв. альтэрнатыўную гісторыю ў гэты час пачаў ажыццяўляцца шэрагам іншых грамадскіх аб’яднанняў.

### 1.3. Асноўныя віды архіваў асабістага паходжання: асаблівасці складу і сучаснае захоўванне

#### 1.3.1. Фонды асабістага паходжання ў складзе дзяржаўных сховішчаў Рэспублікі Беларусь

Дакументы асабістых архіваў сёння прымаюцца на захоўванне дзяржаўнымі архівамі, музеямі і бібліятэкамі Беларусі. Кожная з устаноў мае пэўныя крытэрыі адбору, спосабы і мэты захоўвання. У адпаведнасці з профілем камплектавання, які вызначаецца часам стварэння і формай дакумента, характарам і маштабам дзейнасці ўтваральніка, асабістыя архівы прымаюцца на дзяржаўнае захоўванне рэспубліканскімі, абласнымі і занальнымі архівам і атрымліваюць статус фондаў асабістага паходжання ці ўваходзяць у склад калекцыі. Профіль архіва вызначае спецыфіку і тэматыку архіўных дакументаў, іх папулярнасць сярод карыстальнікаў, архіваўтваральнікаў і архіваўладальнікаў, эфектыўнасць і накірункі выкарыстання дакументаў.

Вядучай установай у рэспубліцы, якая захоўвае асабістыя архівы дзеячаў беларускай культуры з’яўляецца **Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ),** які пачаў сваю працу ў 1960 г. Тут налічваецца больш за 550 фондаў і калекцый асабістага паходжання (асабістых і сямейных), уключаючы неапрацаваныя. На захоўванне штогод прымаецца 12–14 асабістых архіваў, што складае звыш 1700 адз. зах. Яны перадаюцца ў дзяржаўнае сховішча на ўмовах дарэння ці куплі-продажу. Разам з пісьмовымі дакументамі паступаюць музейныя прадметы і друкаваныя матэрыялы. Некаторыя фонды, як напрыклад фонды пісьменнікаў Янкі Брыля і Аляксея Кулакоўскага, на некаторы час былі зачынены для выкарыстання ў адпаведнасці з рашэннем утваральнікаў. Архівісты праводзяць працу па выяўленні асабістых архіваў і ўключэнні іх у склад недзяржаўнай часткі НАФ шляхам унясення ў спіс крыніц камплектавання архіва, які налічвае больш за 630 адзінак. У архіве захоўваюцца дакументы аб дзейнасці выдатных беларускіх паэтаў і пісьменнікаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Максіма Танка, Івана Мележа, Аркадзя Куляшова, Алеся Гаруна, мастакоў Валянціна Волкава, Арлена Кашкурэвіча, Яўгена Красоўскага, кампазітараў Яўгена Цікоцкага, Яўгена Глебава, Аляксея Туранкова, акцёраў Фларыяна Ждановіча, Ларысы Александроўскай, Аляксандры Клімавай, кінарэжысёра Уладзіміра Корш-Сабліна, мастака і пісьменніка Каруся Каганца, археографа Івана Грыгаровіча ды інш. Гэтыя матэрыялы адлюстроўваюць асноўныя накірункі развіцця беларускай літаратуры, мастацтва, навукі ў другой палове XIX–XX ст. Фонды БДАМЛМ актыўна выкарыстоўваюцца для навуковых і папулярных публікацый, арганізацыі выстаў, тэле- і радыёперадач. Яны з’яўляюцца найкаштоўнейшай крыніцай для даследчыкаў літаратуры і розных галін мастацтва, папулярызацыі творчай спадчыны, гістарычных даследаванняў. За 1995–2005 гг. толькі колькасць археаграфічных публікацый архіва склала каля 60-ці[13].

---

[13] Падрабязней гл.: Запартыка Г.В., Запартыка А.М. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Пачатак : (да 50-годдзя заснавання) // Беларускі археаграфічны штогоднік. – 2010. – Вып. 11. – С. 5–31.

Сучасны **Нацыяльны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ)** аб'яднаў фонды ЦДАКР БССР і Цэнтральнага партыйнага архіва КПБ. Пачатак камплектавання архіва дакументамі асабістага паходжання адносіцца да другой паловы 1940-х гг., калі на сакрэтнае захоўванне ЦДАКР паступілі дакументы беларускіх грамадска-палітычных дзеячаў у эміграцыі Кастуся Езавітава, Васіля Русака, Івана Ермачэнкі. У 1968 г. у партыйным архіве былі сабраныя зборы дакументаў Веры Харужай і Сяргея Прытыцкага. Сістэматычнае камплектаванне ЦДАКР дакументамі асабістага паходжання пачалося ў 1975 г. Першым фондам прынятым на захоўванне стаў фонд удзельніка грамадзянскай і Другой сусветнай войнаў М. Зецюкова (1977). У 1989 г. пры аддзеле ведамасных архіваў, камплектавання і экспертызы каштоўнасці была створана група асабістых фондаў, у 1995 г. – аддзел асабістых фондаў. У 2004 г. у архіве знаходзілася 44 фонды і калекцыі асабістага паходжанням (на студзень 2008 г. – 55). Гэта былі асабістыя фонды партыйных, дзяржаўных, грамадскіх дзеячаў краіны А. Аксёнава, М. Аўхімовіча, Ц. Кісялёва, П. Машэрава, гісторыкаў М. Арэхвы, А. Карпачова, З. Капыскага, В. Чапко, навукоўцаў М. Аляксандрава, У. Сікорскага, Ф. Фёдарава, архівістаў В. Жыгалава, Т. Лявонцьевай, М. Камінскага. Таксама трэба назваць калекцыі, якія аб'ядноўвалі малаколькасныя архівы вучоных, грамадска-палітычных дзеячаў ды інш. Права абмежавання доступу да дакументаў было выкарыстана старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь (1992–1994) Станіславам Шушкевічам, часткова гісторыкам Расціславам Платонавым. Штогод архіў папаўняецца на 4–5 асабістых фондаў (каля 700 адз. зах.), якія перадаюцца на ўмовах дарэння. Дакументы асабістых фондаў выкарыстоўваюцца пры арганізацыі выстаў, тэле- і радыёперадач, падрыхтоўцы публікацый, у меншай ступені – у чытальнай зале.

Сховішчам фондаў асабістага паходжання з'яўляецца **Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі (БДАНТД)**, які пачаў камплектавацца фондамі асабістага паходжання ў 1982 г. Тут захоўваецца 36 фондаў (больш за 3 тыс. адз. зах.) архітэктараў У. Караля, В. Волчака, В. Гусева, Г. Лаўрова, канструктараў Б. Шапашніка, М. Пігулеўскага, фізікаў Б. Кіта, Л. Барысаглебскага, калекцыя дакументаў І. Лангбарда ды інш. Дакументы актыўна выкарыстоўваюцца даследчыкамі-гісторыкамі архітэктуры і мастацтва, супрацоўнікамі рэстаўрацыйна-праектнага інстытута, студэнтамі, а таксама ў навуковых публікацыях. Так, за 2000 г. з ліку фондаў асабістага паходжання было выдадзена 660 адз. зах.

У **НГАБ** на сённяшні дзень захоўваецца 12 фамільных фондаў. Гэта фонды Радзівілаў, Румянцавых, Булгакаў, Горватаў, Друцкіх-Любецкіх, Яленскіх, Любамірскіх, Паскевічаў, Плятар-Зібергаў, Хмараў, Цеханавецкіх, Чарнышовых і асабістыя архівы Я. Іоэльсон, М. Кагановіча, М. Мялешкі, У. Брахоцкага. У НГАБ у Гродне знаходзяцца фамільныя фонды Булгарынаў, Слізняў і Быхаўцаў. Некаторыя з іх не маюць у сваім складзе дакументаў асабістага паходжання і могуць быць вызначаны як маёнткавы архіўны фонд. Дакументы фамільных фондаў выкарыстоўваюцца ў археаграфічных і навуковых публікацыях.

У Беларускім дзяржаўным архіве кінафотафонадакументаў (БДАКФФД) захоўваецца шэсць калекцый, заснаваных на дакументах асабістага паходжання.

У 1978 г. у Дзяржаўным архіве Мінскай вобл. пачала ствараცца «Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху і грамадзянскай вайны ў Расіі, Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і Вялікай Айчыннай вайны, партызанскага руху, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобласці». Яна налічае 462 адз. зах. (за 1917–2003 гг.). Большасць з іх была перададзена ўдзельнікамі апошняй вайны, якія працавалі пасля вайны ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, вайсковай сферы, юстыцыі. Захаваліся ўспаміны, пасведчанні, фотаздымкі, ліставанне, якія належаць удзельніку кастрычніцкіх падзей 1917 г. у Петраградзе І. Карасёву, удзельнікам апошняй вайны А. Сапунову, В. Кліменку, І. Якубенку ды інш. Калекцыя ўключае ў сябе дакументы 51 асобы і кожны год папаўняецца ў сярэднім на 12 адз. зах. Комплексы дакументаў асоб у складзе калекцыі невялікія па аб’ёму (у сярэднім па 8 адз. зах.). Выкарыстоўваюцца яны нячаста.

Дзяржаўныя архівы Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей пачалі прымаць на захоўванне дакументы асабістага паходжання ў канцы 1950 – пачатку 1960-х гг. У архівах Брэсцкай, Гомельскай, Магілёўскай абласцей малакалькасныя комплексы дакументаў асабістых архіваў былі аб’яднаны ў калекцыі. У архіве Віцебскай вобласці захоўваецца 38 самастойных асабістых фондаў, сярод якіх вызначаюцца фонды краязнаўцаў А. Падліпскага і В. Газіна, музеязнаўцы і педагога В. Зейлерта, грамадскага дзеяча А. Міндліна, цэлы шэраг фондаў акцёраў Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа. Таксама да іх належаць фонды грамадскіх і партыйных дзеячаў, што былі прынятыя на захоўванне ў партыйны архіў і сем калекцый, у складзе якіх можна вылучыць некалькі самастойных комплексаў асабістых дакументаў. Яны належалі лідэру рэгіянальнай аргані зацыі ЗГА «Бацькаўшчына» Ю. Сцяпанаву, удзельнікам апошняй вайны І. Янчанку, М. Кузьміну, М. Сімакову. У архіве Гродзенскай вобласці захоўваецца цяць асабістых фондаў (гісторыкаў Якава Мараша, Валерыя Чарапіцы, архівіста Аляксандра Плешавені, філосафа Аляксандра Макавельскага, гісторыка медыцыны Вітольда Бржэскага) і калекцыя, у склад якой уваходзяць дакументы 13 асоб. Колькасць адзінак захоўвання адной асобы ў складзе калекцый абласных архіваў, як правіла, не перавышае 50. Колькасць адзінак захоўвання асабістых фондаў вагаецца ад 35 (журналіст А. Песін, ДА Віцебскай вобл.) да 350 (Я. Мараш, В. Бржэскі, ДА Гродзенскай вобл.).

Дзяржаўныя архівы грамадскіх арганізацый (ДАГА) Магілёўскай, Гродзенскай і Гомельскай абласцей, створаныя ў 1996 г., пачалі камплектаванне асабістымі архівамі грамадска-палітычных (партыйных) дзеячаў адпаведна ў 1996, 2000 і 2001 гг. У ДАГА Гомельскай вобл. была створана калекцыя з дакументаў пяці асоб у сярэднім па 5–6 адз. зах. У іншых двух архівах захоўваецца восем фондаў, якія налічваюць ад 5 да 70 адз.зах.

Занальныя дзяржаўныя архівы (ЗДА) пачалі камплектавацца дакументамі асабістага паходжання з 1970 г. (ЗДА ў г. Рэчыца), але найбольш актыўны перыяд прыйшоўся на сярэдзіну 1980-х гг. (ЗДА ў Кобрыне, Барысаве, Слуцку, Навагрудку). Другая хваля актыўнага прыёму на захоўванне асабістых фондаў адносіцца да пачатку новага стагоддзя (ЗДА ў Глыбокім, Оршы, Бабруйску,

Крычаве, Лідзе). ЗДА ў Маладзечне пачаў камплектавацца фондамі асабістага паходжання ў 1986 г. Першым асабістым фондам архіва стаў фонд гісторыка Генадзя Каханоўскага. Архіў захоўвае 10 асабістых фондаў, штогод папаўняецца на 5 адз. зах. з ліку дакументаў асабістага паходжання, фонды вызначаюцца нешматлікасцю (у сярэднім па 20 адз. зах.) і практычна не выкарыстоўваюцца. Фонды паэта, перакладчыка і краязнаўцы П. Бітэля, паэтэсы Г. Новік, паэта-франтавіка В. Носава, урачоў Ф. і Э. Світа, рэдактара і грамадскага дзеяча М. Казлоўскага, адлюстроўваючы асноўныя сферы жыцця і дзейнасці асобы, могуць выкарыстоўвацца для характарыстыкі культурнага жыцця горада Маладзечна і раёна, папулярызацыі яго гісторыі, вывучэння гісторыі апошняй вайны, гісторыі беларускай навукі і г. д.

Самастойныя асабістыя архіўныя фонды створаны таксама ў ЗДА ў Оршы, Рэчыцы, Навагрудку. Кожны з фондаў занальных архіваў налічвае ад 8 (паэт і перакладчык П. Бітэль, ЗДА ў г. Маладзечна) да 108 адз. зах. (удзельнік вайны, грамадскі дзеяч раёна Ф. Цімкаева, ЗДА ў г. Оршы). Калекцыі могуць уключаць у сябе дакументы больш 20 асоб, колькасць адзінак захоўвання, што тычацца адной асобы, вагаецца ад 4 да 130 (адпаведна фонды настаўніцы Л. Цімкевіч і рэжысёра В. Нагорнай, ЗДА ў г. Полацку).

Асабістыя архівы прымаюцца на захоўванне ў архівыарганізацый і навуковыя архівы, якія адносяцца да ліку ўстаноў, што захоўваюць дакументы Нацыянальнага архіўнага фонду. Дакументальныя зборы Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору і Музея старажытнабеларускай культуры ўтрымліваюць часткі асабістых архіваў этнографаў, мастацтвазнаўцаў, краязнаўцаў. Маюцца дадзеныя аб архівах чатырох асоб.

У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы Нацыянальнай акадэміі навук сабрана больш за 60 асабістых архіваў і калекцыя асабістага паходжання, у якіх утрымліваецца больш 40 тыс. адз. зах. З іх 45 фондаў даступныя для выкарыстання і каля 15 фондаў яшчэ не апрацаваны (П. Панчанкі, І. Чыгрынава, В. Сербенты ды інш.). У склад «Калекцыі матэрыялаў па гісторыі навукі і культуры» уваходзяць часткі асабістых архіваў больш 20 асоб. У аддзеле захоўваюцца асабістыя фонды былога прэзідэнта Акадэміі навук Беларусі акадэміка В. Купрэвіча (неапрацаваны), акадэмікаў А. Вечара, М. Томіна, Г. Гарэцкага, беларускіх вучоных-гісторыкаў, археолагаў і этнографаў М. Грынблата, С. Сахарава, М. Улашчыка, грамадскіх дзеячаў Я. Дылы, У. Пігулеўскага, А. Станкевіча, пісьменнікаў і грамадска-культурных дзеячаў У. Дубоўкі, Л. Геніюш, У. Караткевіча, А. Пальчэўскага, Ю. Гаўрука, П. Глебкі, мастака Я. Драздовіча ды інш. Кожны з фондаў уяўляе сабой цэласны і грунтоўны комплекс дакументаў, які ўсебакова адлюстроўвае дзейнасць асобы.

У 1991 г. у сістэме Міністэрства культуры БССР дзейнічаў 141 музей, дакументальная частка (ці частка, што адносіцца да дакументаў НАФ) у зборах 107 з гэтых музеяў налічвала больш за 300 тысяч адз. зах.

### 1.3.2. Архівы беларускай эміграцыі

Пачынаючы з часоў падзелаў Рэчы Паспалітай з тэрыторыі Беларусі эмігравала значная колькасць літаратурных і палітычных дзеячаў, творцаў, навукоўцаў і шэраговых асобаў. На працягу больш як двух стагоддзяў назіраліся некалькі хваляў эміграцыі. Можна вылучыць раннюю эміграцыю XVIII – першай паловы XIX ст., эканамічную эміграцыю канца XIX – пачатку XX ст., міжваенную эміграцыю, а таксама эміграцыю падчас і пасля Другой сусветнай вайны. Адну з першых хваляў эміграцыі склалі ўдзельнікі паўстання 1830–1831 гг. Агульная іх колькасць у краінах Заходняй Еўропы і ўсяго свету вагалася ад 8 да 10 тыс. чал., з якіх ад 1500 – да 1700 чал. з'яўляліся ўраджэнцамі сучасных Беларусі і Літвы

Менавіта прадстаўнікі гэтай хвалі Аляксандр Галынскі і Леан Вадзінскі выступілі з ідэяй стварэння эміграцкай Польскай бібліятэкі ў Парыжы. Бібліятэка была адкрыта ў 1838 г., і акрамя кнігазбору ў ёй захоўваліся рукапісы. У 1841 г. сюды былі перададзены дакументы Юльяна Нямцэвіча, у 1852 г. – 36 лістоў Іяхіма Лялевеля, у 1860-я гг. Яўстафі Янушкевіч перадаў лісты і ўспаміны свайго брата Адольфа. У 1844 г. пры бібліятэцы быў створаны тайны Нацыянальны архіў, куды перадаваліся дакументы паўстання 1830–1831 гг., а ў 1903 г. Уладзіслаў Міцкевіч стварыў пры бібліятэцы музей свайго бацькі Адама Міцкевіча.

Матэрыялы Польскай бібліятэкі і музея Адама Міцкевіча ў Парыжы, якія тычацца гісторыі Беларусі, апісаны і анатаваны беларускімі даследчыкамі. Сярод іх вызначаюцца комплексы дакументаў Напалеона Орды, Іяхіма Лялевеля, Ігната Дамейкі, Юльяна Нямцэвіча, Тамаша Зана, якія з'яўляюцца часткамі іх асабістых архіваў.

З Францыяй у пазнейшыя часы звязана гісторыя архіву БНР, што знаходзіўся ў Міколы Абрамчыка. У прыватнай уласнасці тут захоўваецца архіў мастака Уладзіміра Шыманца.

У ЗША пражывае каля 600–650 тыс. выхадцаў з Беларусі, што пераехалі сюды пераважна ў XX ст. Асабістыя архівы грамадскіх дзеячаў, навукоўцаў, літаратурных дзеячаў Мікалая Лапіцкага, Янкі Касяка, Янкі Запрудніка і інш. знаходзяцца сёння ў бібліятэцы Рутгэрскага ўніверсітэта. Дакументы вядомага польскага этнографа, уладальніка калекцыі фотаздымкаў Палесся 1934–1936 гг. Юзафа Абрэмбскага (Joseph Obrebski, J. Obrębski) – у архіве Масачусацкага ўніверсітэта (Амхерст). Матэрыялы Вітаўта Кіпеля, Васіля Пунтуса, Вінцэнта і Раісы Жук-Грышкевічаў, Багдана Андрусішына – у складзе беларуска-амерыканскай калекцыі Даследчыцкага цэнтра гісторыі эміграцыі ўніверсітэта Мінесоты. Асабістыя архівы Антона Адамовіча, Юркі Віцьбіча, Яўгена Кавалеўскага, Янкі Юхнаўца – у Нью-Ёркскай Публічнай бібліятэцы, празаіка Васіля Каваля (1907–1937) – у складзе Смаленскага рукапіснага збору ў Нацыянальным архіве ЗША. Дакументы палітычнага і грамадскага дзеяча Аляксандра Прушынскага, польскага гісторыка беларускага паходжання Мікалая Іванова, а таксама Юрыя Сабалеўскага, Івана Любачкі – у Архіве Гувераўскага Інстытута (Стэнфардскі ўніверсітэт, Каліфорнія). Комплексы дакументаў асабістых архіваў, што захоўваюцца ў пералічаных установах часта маюць толькі

павярхоўнае, першаснае апісанне Значную каштоўнасць маюць дакументы сховішча створанага пры царкве св. Ефрасінні Полацкай у Саўт-Рыверы. Гэты горад доўгі час з'яўляўся асяродкам прыхільнікаў Беларускай Цэнтральнай Рады – аднаго з крылаў беларускай палітычнай эміграцыі. Тут захоўваюцца архівы Радаслава Астроўскага, Нікандра Мядзейкі, Аляксандра Русака ды інш., што ўтрымліваюць у асноўным дакументы аб дзейнасці БЦР. Існуе таксама шэраг сховішчаў грамадскіх і навуковых аб'яднанняў беларусаў у ЗША. Трэба назваць Беларускі Інстытут навукі і мастацтва (БІНІМ), арганізаваны ў 1951 г., які гуртуе вакол сябе актыўныя беларускія інтэлектуальныя кадры (дырэктар – доктар Вітаўт Кіпель). Таксама неабходна прыгадаць Фундацыю імя Пётры Крэчэўскага, заснаваную ў 1959 г. пад патранатам Рады БНР, мэтай якой было захаванне ў ЗША беларускай культуры і традыцый, стварэнне Беларускага замежнага архіва (архівіст – Ганна Сурмач). У пачатку 1950-х гг. была зроблена спроба стварэння Усебеларускага архіву, якая аднак не была даведзена да канца.

Асноўным цэнтрам захоўвання асабістых архіваў беларусаў у Вялікабрытаніі на сённяшні дзень з'яўляецца Беларуская бібліятэка і музей імя Францішка Скарыны ў Лондане – найбуйнейшы асяродак канцэнтрацыі беларускай дакументальнай спадчыны за мяжой. На сённяшні дзень тут захоўваюцца архівы святароў Льва Гарошкі, Язэпа Германовіча, Тамаша Падзявы, Пятра Татарыновіча, Чэслава Сіповіча, паэтаў, пісьменнікаў і публіцыстаў Кастуся Акулы, Уладзіміра Сядуры, Аўгена Протаса, Юркі Віцьбіча, Сакрата Яновіча, кампазітара Мікалая Шчаглова-Куліковіча, музыказнаўцы Гая Пікарды.

Некаторыя дзеячы беларускай эміграцыі перадалі свае асабістыя архівы на захоўванне ў Нацыянальны архіў Канады. У 1972 г. у складзе рукапіснага аддзелу быў створаны г. зв. Нацыянальны этнічны архіў. Менавіта тут захоўваецца фонд грамадскага і культурнага дзеяча эміграцыі ў Канадзе, паэта і пісьменніка Міколы Сільвановіча (псеўд. Мікола Вярба) (1917–1975), дзеяча культуры і даследчыка гісторыі эміграцыі прафесара літаратуры Янкі Садоўскага (1926–1982), паэта і пісьменніка Кастуся Акулы (1925– 2008), грамадскай дзеячкі Раісы Жук-Грышкевіч (1925–2009). Першыя два фонды цалкам апрацаваны, складзены вопісы, якія даступныя ў інтэрнэце.

Значная колькасць архіваў беларускай эміграцыі былі перададзеныя на захоўванне ў БДАМЛМ[14].

### 1.3.3. Сучасныя тэндэнцыі захоўвання асабістых архіваў

Асабістыя архівы могуць разглядацца як неабходны аспект ведаў чалавека пра самога сябе, уласную сям'ю і час у які жыве чалавек – усяго таго, што патрэбна

[14] Запартыка Г. Дакументы беларускай эміграцыі ў фондах Беларускага дзяржаўнага архіва–музея літаратуры і мастацтва // Аўтограф. – 2020. – Вып. 1. – С. 107–117; Гардзіенка Н.С. Асаблівасці працы Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва па камплектаванні дакументамі з архіваў беларускай эміграцыі // Архивы и война. К 75-летию Победы над фашизмом [Электронный ресурс]: материалы междунар. науч. конф., Минск, 4 нояб. 2020 г. / Белорус. гос. ун-т; под общ. ред. А. Г. Кохановского; науч. ред. М. Ф. Шумейко. – Минск: БГУ, 2021. – С. 40-46.

для штодзённага жыцця. Дакументы асабістага архіва якія ілюструюць этапы жыцця чалавека з часам набываюць сімвалічную функцыю. Асабістыя архівы павінны атрымаць больш шырокае значэнне ў грамадстве як магчымасць стварэння, утрымання і выкарыстання дакументаў асобамі і сем'ямі. У тым ліку захоўвання старых дакументаў, якія рызыкуюць быць страчанымі у эпоху Інтэрнэта, а таксама магчымасцяў для працы з новымі дакументальнымі формамі. Асабістыя архівы існуюць для захоўвання правоў, перадачы інфармацыі, захоўвання артэфактаў і памяці, канструявання ідэнтычнасці. Гэта крыніца эмацыйных ведаў.

Архівы асабістага паходжання выходзяць далёка за рамкі інстытуацыянальных правоў і стандартаў. Таксама маюць велізарнае значэнне для захавання памяці грамадства. Апошні час вызначаецца для архівістаў неабходнасцю падзяліць адказнасць за іх захаванне з грамадскасцю.

Прага да збірання і захоўвання – гэта жыццёвая патрэба, якая дае магчымасці зразумець саміх сябе, камунікаваць з іншымі і пакінуць нешта пасля сябе. Праз захаванне чалавек забяспечвае разуменне продкаў і іх мінулага, даючы асобе “доказы уласнага існавання”. Сямейныя запісы выклікаюць цёплыя ўспаміны членаў сям'і, асабліва тых, каго ужо няма побач. Лі Дзілвах вызначае збіранне як *“наратыўную дзейнасць, практыку ў якой аб'екты з'яўляюцца пэўным знакам для асобы (ці супольнасці) і патрабуюць у наратара (збіральніка) стварэння сэнсу. Створаныя калекцыі з'яўляюцца часткай культурнай памяці”.* Інстынкт захоўвання асабістых і сямейных дакументаў настолькі моцны, што прафесіяналы мусяць яго падтрымліваць, і пераасэнсаваць якім чынам можна выкарыстаць гэта жаданне для лепшага выканання грамадскай архіўнай місіі і для магчымасці дасягнення кожнай асобай уласных архіўных мэтаў.

Дакументальныя запісы ствараліся нават падчас вельмі цяжкіх і трагічных падзей, напрыклад Халакосту. Сотні людзей пакінулі дзённікі, эссэ, лісты, тэстаменты вершы і інш. Адваротны працэс – страта дакументаў – пераўтвараецца ў страту памяці і ідэнтычнасці.

Асноўныя праблемы сучаснага захоўвання дакументаў асабістага паходжання:

1. Замена традыцыйных дакументаў асабістага паходжання лічбавымі эквіваленттамі (электронная пошта, сацыяльныя сеткі, блогі, віртуальныя выразкі, інтэрнэт фотаальбомы, відэа YouTube, сямейныя сайты) і адсутнасць сталых методык іх захоўвання;
2. Адсутнасць цэнтраў захоўвання сямейных архіваў (як традыцыйных так і электронных) ў іх шырокай масавай форме;
3. Праблема стварэння уласных тэкстаў і дакументавання працэсаў;
4. Адсутнасць шырокай архіўнай свядомасці;
5. Адсутнасць методык захавання для шырокага выкарыстання.

Прапановы па вырашэнні:

1. Зразумець рамантыку дакумента асабістага паходжання і прапанаваць гэты метад шырокай грамадскасці. Вельмі часта архівісты звяртаюць увагу больш на тэхнічныя бакі захоўвання. Можна нагадаць архівістам аб патрэбе быць

уважлівым да рамантыкі дакументаў. Дапамагчы ў гэтым можа – зачараванасць архівіста дакументам створаным асобай і яе продкамі, стварэнне *рамантыкі дакумента*.

Рамантыка канкрэтных відаў дакументаў асабістага паходжання:

•Дзённік – найбольш асабісты дакумент. Стварэнне дзённіка можа разглядацца як мастацтва, якое адлюстроўвае сучаснасць і захоўвае гісторыю;.

•Ліставанне. Дакументы, якія у свой час былі каштоўнымі для кагосьці і могуць быць каштоўнымі у далейшым.

•Вусныя успаміны – пачуць мінулае. Ставарецца гісторыя індывідаў і груп, якія засталіся без дакументаванай гісторыі.

•Вэб-старонкі. Мінулае онлайн. Стварэнне сямейных сайтаў з сабранымі у іх дакументамі сям'і, якія можна выкарыстаць для прафесійных даследаванняў. Патрэбная дапамога архівістаў у распрацоўцы правіл стварэння сайтаў такога кшталту, для таго каб былі ўлічаны ўсе метададзеныя патрэбныя для крыніцазнаўчай ацэнкі дакумента.

2. Шырокая праца з інфармацыяй, уключэнне ў сферу інтарэсаў архівістаў новых форм дакументаў.

3. Увага да працэсу асабістага дакументавання. Хоць інфармацыйныя спецыялісты дамагліся пэўных поспехаў на працягу многіх гадоў, разглядаючы некаторыя з гэтых пытанняў на прыкладзе дакументаў дзяржаўных ведамстваў, вельмі мала намаганняў было зроблена, каб навучаць насельніцтва стаць захавальнікамі сваіх сямейных архіваў.

4. Архівісты мусяць ствараць праграму захоўвання, а не займацца захоўваннем як такім. Ствараць новыя механізмы для асветы грамадскасці ў накірунку захоўвання асабістых архіваў. Распрацоўка папулярных дапаможнікаў і відэаролікаў, правядзенні семінараў і трэнінгаў для грамадскасці.

5. Калі ў мінулым архівісты займаліся камплектаваннем і наданнем фізічнага парадку, то цяпер яны павінны працаваць з прыватнымі асобамі, для забеспячэння захоўвання неабходнай колькасці асабістых і сямейных архіваў. Магчыма распрацоўка новай навуковай дысцыпліны – кіраванне дакументамі асабістага паходжання (асабісты інфармацыйны мэнэджмэнт). Гэта тэорыя і практыка дзейнсці людзей скіраваная на камплектаванне, арганізацыю, захоўванне і выкарыстанне інфармацыі для штодзённых патрэбаў. З'яўленне прафесіі архіўных ментараў, якія працуюць з грамадскасцю для фарміравання асабістых і фамільных архіваў, у тым ліку у лічбавым фармаце.

6. Распрацоўка новых падыходаў да экспертызы каштоўнасці дакументаў асабістага паходжання ў электронным выглядзе.

### 1.3.4. Сямейныя архівы ў кантэксце сучасных праблем асабістага дакументавання

Сямейныя архівы з'яўляюцца месцам захавання і фарміравання сямейнай і індывідуальнай ідэнтычнасці праз матэрыяльныя аб'екты. Многія сем'і назапашваюць архівы, якія непасрэдна кажуць пра іх свядомасць. Гэта розныя матэрыялы – фотаздымкі, прадметы, дакументы, – якія захоўваюцца на гарышчах,

у гаражах і шафах, а ўсё часцей – і на камп'ютарах. Гэта не толькі дакументы ў класічным разуменні, але хатняя прастора, асяроддзе, гаспадарка, якая аб'ядноўвае ўсіх членаў сям'і, як тых што жывуць разам, так і тых, што геаграфічна адмежаваны. Таксама гэта матэрыяльныя рэчы (коўдры, цацкі, прылады і нават расліны), усё што можа ўздзейнічаць і спрыяць фарміраванню сямейнай ідэнтычнасці. З іншага боку яно можа быць нязначным і незаўважным для іншых супольнасцей і індывідаў. Сямейны архіў уключае і незафіксаваныя сямейныя ўспаміны, сумесную аўтабіяграфічную памяць, якая ўплывае на індывідуальныя ўспаміны кожнага члена сям'і. Склад і значэнне сямейнага архіва такім чынам неструктураваны і нефармалізаваны, часам выпадковы і нематэрыяльны.

Сямейны архіў можа выступаць як стыхійны збор, але і як плён дзейнасці *сямейнага архівіста*. У такой якасці найчасцей выступаюць жанчыны. Для іх больш важная эмацыянальная прывязка да рэчаў і дакументаў, для мужчын – іх матэрыяльная, эканамічная ці юрыдычная значнасць. Брытанская прафесар-музеязнаўца Сьюзан Пірс, падкрэслівае, што культура стварэння сямейных архіваў з'яўляецца матрылінейнай. У большасці выпадкаў сямейны архіў гэта таксама нетыповая калекцыя, бо яго фарміраванне больш плаўнае, павольнае і нефармальнае. Аб'екты сямейнага архіва надзвычай важныя ў фарміраванні ідэнтычнасці з асаблівым акцэнтам на будучыню. З іх дапамогай людзі будуюць значэнні і ствараюць мэты свайго далейшага існавання.

Сямейны архіў таксама прапануе гісторыкам ключавыя зыходныя матэрыялы для глабальных ці нацыянальных падзей, на больш інтымным узроўні. Знаёмства з дакументамі сямейных архіваў (на прыкладзе лістоў загінулага ў Халакосце сваяка) можа мець вынікам наладжванне бягучых сямейных, сацыяльных і міжасобасных адносін. Тым не менш, такім архівам не хапае вялікай гістарычнай глыбіні, і яго лепш выкарыстоўваць у спалучэнні з традыцыйнымі гістарычнымі і этнаграфічнымі крыніцамі.

Сямейныя архівы розных сацыяльных груп могуць мець пэўныя адрозненні. Напрыклад, памяць вяскоўцаў, у адрозненне ад памяці гараджан, традыцыйна перадавалася вусна, нават у другой палове ХХ ст. Вопыт перадаваўся праз мову, спевы, казкі, байкі з вуснаў старэйшых дзеці выхоўваліся ў любові да зямлі і працы, павагі да старэйшых, атрымоўвалі пачаткі ведаў у розных галінах навук. Гэты механізм камунікатыўнай памяці пачаў паступова разбурацца толькі ў пасляваенны час, калі жыхары, народжаныя ў вёсцы ў 1940–1950-х гг., сталі масава з'язджаць у гарады, дзе перад імі паўстала неабходнасць фарміравання новай гарадской ідэнтычнасці з іншай мовай, культурай і светабачаннем. У гэты ж перыяд, больш актыўным становіцца і дакументаванне ў межах сямейных і асабістых архіваў. Гэты працэс звязаны таксама і з ростам матэрыяльнага дабрабыту, культуры і свядомасці.

Самым распаўсюджаным відам дакументаў у сямейных архівах вяскоўцаў з'яўляецца фотаздымак, копіі і арыгіналы афіцыйных дакументаў, пасведчанні аб

адукацыі і узнагароджаннях, сшыткі с запісамі рэцэптаў, замоваў і інш., сямейныя рэліквіі (артэфакты)[15].

[15] Падрабязней гл.: Іванова В. Сямейныя архівы беларускіх вяскоўцаў і іх лёсы падчас Другой сусветнай вайны // Архивы и война. К 75-летию Победы над фашизмом [Электронный ресурс]: материалы междунар. науч. конф., Минск, 4 нояб. 2020 г. / Белорус. гос. ун-т; под общ. ред. А.Г. Кохановского; науч. ред. М.Ф. Шумейко. – Минск: БГУ, 2021. – С. 47–54.

### 1.4. Методыка працы з дакументамі асабістага паходжання

#### 1.4.1. Камплектаванне і экспертыза каштоўнасці дакументаў асабістага паходжання. Грашовая ацэнка

Кожны дзяржаўны архіў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з профілем ажыццяўляе прыём на пастаяннае захоўванне дакументаў асабістага паходжання дзяржаўных, палітычных і грамадскіх дзеячаў, вучоных, паэтаў, пісьменнікаў, літаратуразнаўцаў, мастакоў, скульптараў, архітэктараў, мастацтвазнаўцаў, фатографаў, акцёраў, рэжысёраў, спевакоў, музыкантаў, фалькларыстаў, бібліёграфаў, архівістаў, калекцыянераў, спартсменаў, удзельнікаў і сведак гістарычных падзей. Камплектаванне дзяржаўнага архіва дакументамі асабістага паходжання адбываецца паэтапна і ўключае:

- ініцыятыўны пошук крыніц;
- тлумачальную працу з уладальнікамі дакументаў;
- адбор і папярэдні ўлік дакументаў шляхам складання здатачнага (расцэначнага) вопісу дакументаў.

Асаблівасці камплектавання архіва дакументамі асабістага паходжання:

- паступленне ў архіў неапісаных дакументаў;
- паступленне дакументаў у адзін фонд з розных крыніц;
- неабмежаваны па часе перыяд камплектавання;
- нераўнамернасць паступленняў па колькасці дакументаў.

Дакументы асабістага паходжання могуць перадавацца на захоўванне ад асобаў, якія перадаюць свае архівы, ад спадчыннікаў, зібіральнікаў, творчых саюзаў і іншых арганізацый. Звесткі пра асоб, дакументы якіх могуць быць уключаны ў недзяржаўную частку НАФ Рэспублікі Беларусь, бяруцца з навуковай і даведачнай літаратуры, СМІ, праз уласныя кантакты.

На кожную асобу, чые дакументы ўключаюцца ў недзяржаўную частку НАФ Рэспублікі Беларусь, *са згоды уладальніка*, складаецца картка. Усе карткі канцэнтруюцца ў картатэцы ўліку асоб, дакументы якіх уключаны ў недзяржаўную частку НАФ Рэспублікі Беларусь. З 2003 г. у “АІС Архіва” працуе тыпавы праграмны модуль “Асабістыя фонды”, які прызначаны для аўтаматызацыі працэса камплектавання дзяржаўных архіваў асабістымі фондамі, у тым ліку для вядзення электронных картак ўліку асоб, дакументы якіх уключаны ў недзяржаўную частку НАФ Рэспублікі Беларусь.

Табл. 1. Уліковая картка дакументаў недзяржаўнай часткі НАФ, якія знаходзяцца ва ўласнасці грамадзян

Фондаўтваральнік (прозвішча,уласнае імя, імя па бацьку( калі такое ёсць), кароткія біяграфічныя звесткі)

Уладальнік дакументаў (прозвішча,уласнае імя,імя па бацьку(калі такое ёсць), адрас, E-mail, нумар тэлефона)

Склад дакументаў НАФ, якія знаходзяцца ва ўласнасці грамадзяніна_______________

Крыніцы інфармацыі ________________________________________________________

Наяўнасць дакументаў у іншых дзяржаўных сховішчах ___________________________

| Дата правядзення перамоў | Кім праведзены перамовы | Форма правядзення перамоў | Вынікі правядзення перамоў |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |

Дата складання карткі Подпіс

Экспертыза каштоўнасці дакументаў асабістага паходжання праводзіцца паэтапна – на стадыі камплектавання, на стадыі распрацоўкі навукова-даведачнага апарату (НДА) (вопісаў і каталогаў і інш.), на стадыі захоўвання (ў выпадку выяўлення міжфондавай дублетнасці і залішняй варыянтнасці дакументаў у фондах 3-й катэгорыі).

Крытэрыі каштоўнасці дакументаў асабістага паходжання падзяляюцца на дзве групы:

1. крытэрыі значнасці дзейнасці асобы і каштоўнасці ўсяго комплексу дакументаў, які ўтварыўся ў працэсе жыцця і дзейнасці асобы:

1.1. Значэнне дзяржаўнай, грамадска-палітычнай, творчай, навуковай і іншай дзейнасці фондаўтваральніка;

1.2. Гісторыя стварэння, гістарычныя ўмовы ўзнікнення, склад і змест комплексу дакументаў;

1.3. Ступень захаванасці і паўнаты комплексу дакументаў;

1.4. Узаемасувязь з іншымі фондамі асабістага паходжання, якія захоўваюцца ў дзяржаўным архіве.

2. крытэрыі каштоўнасці кожнага асобнага дакумента:

2.1. Значнасць зместу дакумента, яго інфармацыйная, гістарычная, навуковая, мастацкая каштоўнасць;

2.2. Фізічныя характарыстыкі і захаванасць дакумента;

2.3. Унутрыфондавыя і міжфондавыя ўзаемасувязі дакумента.

Крытэрыі экспертызы каштоўнасці прымяняюцца комплексна.

Пры грашовай ацэнцы дакументаў асабістага паходжання ўлічваюцца наступныя іх памеры:

рукапіс прозы – 1 стар.;

рукапіс верша – 16–20 радкоў;

пісьмы – 1–2 стар.;

дароўны надпіс – 3–10 радкоў;

фатаграфія – 9×12 см.

Да крытэрыяў вызначэння кошту дакументаў адносяцца:

1. Змест, мастацкая альбо навуковая вартасць дакумента;
2. Значэнне дзейнасці (творчасці) аўтара;
3. Час узнікнення дакумента;
4. Неапублікаванасць дакументаў;
5. Аўтаграфічнасць дакумента;
6. Маргіналіі на дакументах;
7. Рэдкасць дакумента;
8. Значнасць (вядомасць) дзейнасці адрасата;
9. Знешнія асаблівасці дакумента;
10. Фізічны стан дакумента;
11. Букіністычны і аўкцыённы кошт дакументаў.

*Напрыклад:*

*Базавы кошт рукапісу аповесці XX ст. аўтара другой катэгорыі з 19 стар. пры базавай велічыні старонкі 2,0 руб. будзе складаць 2,0 х 19 = 38, 0 руб.*[16]

*Базавы кошт рукапісу 1 старонкі, напісанай Ф. Багушэвічам ў XIX ст. – да 500 р. Канчатковы кошт дакумента вызначаецца яго базавым коштам памножаным на велічыню (працэнт) у адпаведнасці з крытэрыямі 4, 6, 7, 9, 10.*[17]

З мэтай папярэдняга аператыўнага ўліку дакументаў асабістага паходжання, а таксама фіксацыі расцэнкі на дакументы, якія набываюцца дзяржаўным архівам шляхам пакупкі, складаецца **здатачны (расцэначны) вопіс**. Вопіс адначасова адлюстроўвае і вынікі адбору дакументаў на пастаяннае захоўванне. Сістэматызацыя дакументаў асабістага паходжання ў працэсе іх адбору на пастаяннае захоўванне праводзіцца па тыпавой схеме сістэматызацыі дакументаў асабістага паходжання. Дакументы аб’ядноўваюцца ў групы па намінальным, тэматычным, карэспандэнцкім і іншых прынцыпах. Пры фарміраванні здатачнага (расцэначнага) вопісу рэкамендуецца, у адрозненне ад тыпавой схемы, дакументы да біяграфіі фондаўтваральніка размяшчаць у пачатку вопісу. Комплексы дакументаў, аб’яднаныя самім фондаўтваральнікам або іх уладальнікам, на стадыі адбору на пастаяннае захоўванне не перасістэматызоўваюцца.

На стадыі адбору дакументаў на пастаяннае захоўванне і складання здатачнага вопісу дапускаецца раздзел «Россып», куды змяшчаюцца паасобныя

---

[16] Дадзеныя на 2003 год.

[17] Падрабязней гл.: Метадычныя рэкамендацыи па грашовай ацэнцы дакументащ асабистых архиващ дзеячащ литаратуры, мастацтва, культуры (2003)

лісты рукапісаў, канверты без пісьмаў і інш. За дакумент лічыцца адна папка аб’ёмам да 100 лістоў. Здатачны вопіс завяршаецца выніковым запісам аб колькасці дакументаў, уключаных у вопіс (лічбай і прапіссю). Расцэначны вопіс складаецца па той жа схеме, што і здатачны, але мае дадатковую графу “Ацэнка”.

На пастаяннае захоўванне ў складзе фондаў асабістага паходжання не прымаюцца:

1. Дублеты, машынапісныя, фотакопіі і варыянты твораў;
2. Разрозненыя лісты, планы, чарнавікі;
3. Гранкі і вёрстка твораў без правак і памет;
4. Запісы і канспекты праслуханых лекцый, выступленняў, семінарскіх заняткаў;
5. Вучнёўскія сшыткі, школьныя альбомы, дзіцячыя альбомы з запісамі і інш.;
6. Запісныя кніжкі з запісамі гаспадарчых выдаткаў, тэлефонаў, адрасоў без указання асоб і інш.;
7. Копіі архіўных дакументаў, выраблены па фондах таго ж дзяржаўнага архіва
8. Дзіцячыя пісьмы, пісьмы гледачоў, чытачоў з віншаваннямі і просьбамі да-слаць фатаграфіі і інш.
9. Пісьмы малавядомых карэспандэнтаў з віншаваннямі са святамі;
10. Заявы і пісьмы па бытавых, маёмасных пытаннях;
11. Рахункі і квітанцыі, запісы аб гаспадарчых выдатках і інш.

Дакументы, якія ў выніку экспертызы каштоўнасці не могуць быць прыняты на пастаяннае захоўванне, уключаюцца ў акт аб вяртанні ўласніку або ў акт аб знішчэнні, калі ўласнік адмовіўся ад вяртання дакументаў ці на момант завяршэння экспертызы дакументы не мелі або страцілі ўласніка. Акты разам са здатачным (расцэначным) вопісам разглядаюцца на ЭМК і зацвярджаюцца яго кіраўнікам. Дакументы, уключаныя ў акт аб вяртанні, перадаюцца ўласніку пад распіску. Распіска або накладная аб прыёме дакументаў на ўтылізацыю змяшчаецца ў справу фонду.

Дакументы асабістага паходжання паступаюць у дзяржаўны архіў шляхам дарэння, атрымання ў спадчыну ці пакупкі. Уладальнік дакументаў падае на імя кіраўніка архіва заяву. Па рашэнні ЭМК дзяржаўнага архіва на падставе здатачнага (расцэначнага) вопісу, які складаецца ў выніку правядзення экспертызы прымаецца рашэнне аб прыёме дакументаў на пастаяннае захоўванне. Заключаецца **дагавор дарэння ці дагавор куплі-продажу** *(формы ў дадатках 9, 10 Метадычных рэкамендацый па рабоце архіваў з дакументамі асабістага паходжання (2015)*. Уладальнік мае права:

- абмежаваць доступ да дакументаў на тэрмін 75 гадоў з дня іх стварэння;
- адмяніць раней устаноўленае абмежаванне доступу да дакументаў;
- прасіць зрабіць копіі дакументаў за кошт архіва.

Пры прыёме дакументаў асабістага паходжання аддзелам дзяржаўнага архіва, на які ўскладзены задачы іх камплектавання, уладальніку выдаецца распіска, дзе фіксуецца кім, ад каго і ў якой колькасці атрыманы дакументы.

Кожнае паступленне дакументаў ад грамадзян, да вырашэння пытання аб іх прыёме на пастаяннае захоўванне, ставіцца на ўлік у аддзеле фарміравання НАФ, ці іншым аддзеле дзяржаўнага архіва, на які ўскладзены задачы па іх камплектаванні. Для гэтага аддзел вядзе кнігу ўліку паступленняў і карткі ўліку паступленняў.

Пры паступленни дакументаў асабістага паходжання ў дзяржаўны архіў вызначаецца (працэс фандзіравання):

- від фонда (асабісты, сямейны, родавы, персанальны збор, альбо калецыя)
- храналагічныя межы фонда (дада нараджэння і смерці фондаўтваральніка(ў)
- крайнія даты фонда (дата самага ранняга і самага позняга дакумента фонда)
- назва фонду (прозвішча, імя, імя па бацьку фондаўтваральніка з указаннем роду дзейнасці, прафесіі або пасады, храналагічныя межы)

Напрыклад:

*Машэраў Пётр Міронавіч – партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР (1918–1980)*

*Максім Танк (Скурко Яўген Іванавіч) – народны пісьменнік Беларусі (1912–1995)*

У залежнасці ад значнасці дзяржаўнай, палітычнай, грамадскай, навуковай, творчай дзейнасці фондаўтваральніка, якаснага і колькаснага складу дакументаў фондам асабістага паходжання надаецца **адна з трох катэгорый**. Катэгорыя ўплывае на дэталізацыю пры навуковым апісанні фонду, каталагізацыі, стварэнні іншых архіўных даведнікаў. Фонд 1-й катэгорыі ўтрымлівае ўнікальныя і асабліва каштоўныя дакументы, якія адлюстроўваюць жыццё і дзейнасць выдатных дзяржаўных, палітычных, грамадскіх дзеячаў, дзеячаў навукі, літаратуры, мастацтва. Фонд 2-й катэгорыі ўтрымлівае дакументы, якія адлюстроўваюць жыццё і дзейнасць вядомых дзяржаўных, грамадскіх, палітычных дзеячаў, дзеячаў навукі, літаратуры, мастацтва, а таксама гістарычныя падзеі і факты; 2-я катэгорыя можа прысвойвацца і фондам выдатных дзеячаў, калі колькасць дакументаў у іх фондах мінімальная. Фонд асабістага паходжання 3-й катэгорыі ўтрымлівае дакументы, якія адлюстроўваюць жыццё і дзейнасць менш вядомых дзеячаў.

Аб'ём адзінкі захоўвання для фондаў 1-й і 2-й катэгорый не павінен перавышаць 100 лістоў. Для ўнікальных і асабліва каштоўных – 40–60 лістоў. Для малюнкаў і чарцяжоў – 10–15 лістоў. Для фатаграфій – 10–20 лістоў. Аб'ём адзінкі захоўвання можа залежаць ад фізічнага стану дакументаў, іх памераў, тэхнікі выканання мастацкіх прац і інш. Максімальны аб'ём дакументаў (лістоў) у адзінках захоўвання фондаў 3-й катэгорыі: для рукапісаў – 200 лістоў, для малюнкаў – 10 лістоў, для фатаграфій – 30 дакументаў. Пры фарміраванні адзінак захоўвання дадаткі не аддзяляюцца ад асноўных дакументаў. Калі адзінкі захоўвання сфарміраваны фондаўтваральнікам і гэта не пярэчыць іх асноўным прынцыпам фарміравання і навуковага апісання, аўтарская сістэма захоўваецца. Вокладкі, канверты, папкі, афармленыя фондаўтваральнікам і з яго паметамі, а таксама тыя, што маюць мастацкую і гістарычную каштоўнасць, пакідаюцца ў

фондзе і змяшчаюцца ў адзінку захоўвання разам з дакументам, да якога адносяцца, або складаюць самастойную адзінку захоўвання, калі дакументы з канверта, папкі і г. д. расфарміраваны па розных адзінках[18].

### 1.4.2. Стварэнне навукова-даведачнага апарата да фондаў асабістага паходжання. Архіўны вопіс і каталог.

Віды архіўных даведнікаў якія забяспечваюць эфэктыўны пошук інфармацыі ў складзе фондаў асабістага паходжання, з'яўляюцца тыповымі для ўсіх архіваў у незалежнасці ад віда дакументаў. Некаторыя адметнасці праяўляюцца толькі пры складанні апісальных артыкулаў.

Асноўным даведнікам з'яўляецца **архіўны вопіс**, які складаецца з тытульнага ліста, прадмовы, зместа, асноўнай табліцы і пры неабходнасці – спіса скарачэнняў, паказальніка, пераводнай табліцы. Апісальны артыкул вопісу мае пяць стандартных асноўных элементаў: парадкавы нумар адзінкі захоўвання па вопісу, загаловак адзінкі захоўвання, даты (крайнія даты) дакументаў, колькасць лістоў, колькасць дакументаў. У вопісе фонда арганізацыі колькасць дакументаў у складзе адзінкі захоўвання звычайна не вызначаецца.

*Прадмова* – уступная частка да вопісу, якая заклікана даць агульныя звесткі пра фондаўтваральніка, склад, змест, паходжанне фонду. Прадмова да вопісу фонду асабістага паходжання складаецца з дзвюх частак: біяграфічнай і археаграфічнай. У *біяграфічнай частцы* прадмовы даецца асабістая і творчая біяграфія фондаўтваральніка, адзначаецца яго роля ў грамадстве, навуцы, літаратуры і г. д. Пры напісанні біяграфічнай часткі неабходна звярнуцца да дакументаў фонду (аўтабіяграфій, бібліяграфій, дзённікаў, успамінаў, запісных кніжак і г. д.), а таксама да энцыклапедычных даведнікаў, манаграфій, іншых навуковых прац. *Археаграфічная частка* прадмовы прысвячаецца гісторыі фонду, характарыстыцы яго дакументаў, структуры вопісу. У археаграфічнай частцы раскрываюцца асноўныя асаблівасці фандавання і сістэматызацыі дакументаў фонду. Пры характарыстыцы дакументаў фонду ўказваюцца іх аб'ём, храналагічныя межы, паўната фонду, ступень захаванасці. Пры характарыстыцы структуры вопісу даюцца асаблівасці сістэматызацыі дакументаў і адзінак захоўвання ў фондзе

Загаловак адзінкі захоўвання у фондзе асабістага паходжання можа мець наступныя *асноўныя элементы*:

- від дакумента (дакументаў);
- аўтар дакумента (прозвішча асобы, назва ўстановы);
- адрасат дакумента (прозвішча асобы, назва ўстановы);
- змест дакумента (тэма, пытанне, назва твора і інш.).

---

[18] Падрабязней пра фарміраванне адзінак захоўвання гл. раздз. 10 Метадычных рэкамендацый па рабоце архіваў з дакументамі асабістага паходжання (зацверджаны загадам дырэктара Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 28.12.2015 № 48)

Да *дадатковых элементаў* загалоўка адносяцца:

- абазначэнне ступені паўнаты дакумента;
- способу перадачы, капійнасці;
- знешніх асаблівасцяў дакументаў;
- анатацыя ўнікальных, рэдкіх, асабліва каштоўных і іншых дакументаў.

*Напрыклад:*

*У. С. Караткевіч. "Нельга забыць". Раман. Урывак. Варыянт. Аўтограф. [1970–1980-я гг.]*

*Неўстаноўлены аўтар. "Узвійся ў гору, мой саколе!" Верш. Рукапіс.*

*В. Ц. Тураў. "Людзі на балоце". Кінасцэнарый па аднайменнай трылогіі І. П. Мележа. Машынапіс з аўтарскай праўкай.*

*Г. М. Вагнер. "Ранак". Опера. Партытура. Аўтограф.*

*В. В. Волкаў. Серыя эцюдаў да карціны "Мінск 3 ліпеня 1944 года". Палатно, алей.*

*Фатаграфія І. А. Матусевіча ў ролі Дзям'яна з фільма В. А. Нікіфарава "Фруза" («Беларусьфільм»).*

*Пісьмы Танка Максіма (Скурко Яўгена Іванавіча). Пасля 1945 г.*

*Дароўны надпіс Шастаковіча Дзмітрыя Дзмітрыевіча Л. П. Александроўскай на лістку блакнота.*

*Дакументы аб працы А. А. Куляшова галоўным рэдактарам кінастудыі "Беларусьфільм": пасведчанне, службовыя запіскі, чарнавікі пратаколаў.*

Выбар схемы сістэматызацыі адзінак захоўвання фонду асабістага паходжання вызначаецца характарам дзейнасці фондаўтваральніка, складам і аб'ёмам дакументаў фонду.

*Тыпавая схема сістэматызацыі фонду дзеяча літаратуры (навукі)*

1. Рукапісы фондаўтваральніка

1.1. Раманы, аповесці

1.2. П'есы, сцэнарыі, лібрэта

1.3. Апавяданні, нарысы, нататкі

1.4. Паэмы, вершы

1.5. Артыкулы, даследаванні, манаграфіі

1.6. Даклады, рэцэнзіі, інтэрв'ю

1.7. Аўтабіяграфіі, успаміны, дзённікі

1.8. Пераклады

1.9. Выпіскі, чарнавыя запісы, спісы

1.10. Малюнкі фондаўтваральніка, нотныя рукапісы (калі, акрамя літаратурнай дзейнасці, ён займаўся іншымі відамі творчасці)

2. Запісныя кніжкі фондаўтваральніка

3. Пісьмы фондаўтваральніка

3.1. Асобным адрасатам (вядомым дзяржаўным і грамадскім дзеячам, дзеячам навукі, літаратуры і мастацтва, сваякам, сябрам, знаёмым)

3.2. Асобам, пісьмы якіх аб’яднаны па тэматычным прынцыпе (чытачам, выбаршчыкам і інш.)

3.3. Установам, арганізацыям па асабістых і творчых пытаннях

4. Пісьмы фондаўтваральніку

4.1. Асобных карэспандэнтаў (вядомых дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, дзеячаў навукі, літаратуры і мастацтва, сваякоў, сяброў, знаёмых)

4.2. Карэспадэнтаў, пісьмы якіх аб’яднаны па тэматычным прынцыпе (пісьмы чытачоў, школьнікаў, выбаршчыкаў)

4.3. Ад устаноў і арганізацый па арганізацыйна-творчых пытаннях

5. Дароўныя надпісы фондаўтваральніка розным асобам

6. Дароўныя надпісы фондаўтваральніку ад розных асоб

7. Дакументы да біяграфіі фондаўтваральніка

7.1. Асабістыя дакументы

7.2. Дакументы службовай дзейнасці

7.3. Дакументы грамадскай дзейнасці

7.4. Дакументы літаратурнай (навуковай) дзейнасці

7.5. Дакументы юбілейных дат фондаўтваральніка, узнагарод, ганаровых званняў

8. Дакументы маёмасна-гаспадарчага і бытавога характару

9. Дакументы пра фондаўтваральніка

9.1. Манаграфіі, нарысы, артыкулы і іншыя дакументы, прысвечаныя жыццю і творчасці фондаўтваральніка

9.2. Рэцэнзіі на творы і навуковыя працы фондаўтваральніка

9.3. Артыкулы, рэцэнзіі і іншыя дакументы з упамінаннем пра фондаўтваральніка

9.4. Успаміны пра фондаўтваральніка

9.5. Пісьмы розных асоб з упамінаннем пра фондаўтваральніка

9.6. Дакументы аб ушанаванні памяці фондаўтваральніка

9.7. Дакументы аб пасмяротных выданнях твораў фондаўтваральніка

10. Дакументы, сабраныя фондаўтваральнікам для сваіх прац і па цікавых для яго тэмах

11. Выяўленчыя дакументы

11.1. Індывідуальныя фатаграфіі фондаўтваральніка

11.2. Маляваныя партрэты фондаўтваральніка

11.3. Фатаграфіі членаў сям’і фондаўтваральніка

11.4. Фатаграфіі фондаўтваральніка ў групах з рознымі асобамі

11.5. Фатаграфіі розных асоб з дароўнымі надпісамі фондаўтваральніку

11.6. Ілюстрацыі да твораў фондаўтваральніка

11.7. Фатаграфіі кадраў з фільмаў і сцэн са спектакляў, пастаўленых паводле твораў фондаўтваральніка

11.8. Выяўленчыя дакументы, сабраныя фондаўтваральнікам (рэпрадукцыі, паштоўкі і інш.)

11.9. Фатаграфіі розных асоб, якія адклаліся ў фондзе

12. Дакументы членаў сям'і фондаўтваральніка

13. Калекцыі і зборы

*Схема сістэматызацыі фонду кампазітара Ю. У. Семянякі*

1. Нотныя рукапісы
1.1. Сцэнічныя творы
1.1.1. Оперы
1.1.2. Аперэты
1.1.3. Музыка да спектакляў
1.2. Інструментальныя творы
1.3. Вакальныя творы
1.3.1. Вакальна-сімфанічныя творы
1.3.2. Песні для хору з фартэпіяна
1.3.3. Песні для голасу з фартэпіяна, прыпеўкі
2. Рукапісы Ю. У. Семянякі
3. Пісьмы да Ю. У. Семянякі
4. Дакументы да біяграфіі Ю. У. Семянякі
4.1. Асабістыя дакументы
4.2. Дакументы творчай, службовай і грамадскай дзейнасці
4.3. Дакументы аб святкаванні юбілеяў, аб узнагародах, прысваенні званняў
5. Дакументы пра Ю. У. Семяняку
6. Выяўленчыя дакументы

Унутры раздзелаў сістэматызацыя адбываецца ў залежнасці ад заначнасці віда і аб'ёма дакумента (намінальны прынцып), у храналагічнай паслядоўнасці, па аўтарскай прыкмеце і ступені аўтаграфічнасці, тэматыцы і інш.

**Каталагізацыя дакументаў** асабістага паходжання можа ажыццяўляцца ў працэсе іх навуковага апісання, а таксама мэтава адпаведным структурным аддзелам архіва. Пры планаванні фондаў для каталагізацыі ўлічваюцца: катэгорыя фонду, значнасць зместу дакументаў фонду, інтэнсіўнасць выкарыстання фонду. Адпаведна абіраецца форма каталагізацыі: падакументная, паадзінкавая ці групавая.

Асноўны від каталога для дакументаў асабістага паходжання – гэта імянны. У імянным каталозе карткі класіфікуюцца па алфавіце прозвішчаў асоб, якія з'яўляюцца аўтарамі дакументаў або суб'ектамі інфармацыі дакументаў. Інфармацыя для імяннога каталога фіксуецца на імянных каталожных картках. Карткі запаўняюцца разборліва рукапісным або машынапісным спосабам. Забараняюцца выпраўленні, запісы між радкоў і г. д. Звесткі, якія ўстаноўлены ці дапоўнены ў працэсе каталагізацыі, даюцца ў квадратных дужках, у выпадках сумнення – з пытальнікам.

Картка імяннога каталога ўключае наступныя элементы:

- назву дзяржаўнага архіва;
- прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое ёсць) аб'екта інфармацыі;
- змест дакумента (тэма, назву, жанр дакумента, ступень паўнаты дакумента, мову дакумента);
- крайнія даты (дата) дакумента, дату падзеі, месца падзеі;
- спосаб перадачы дакумента;
- назву фонду;
- шыфр дакумента.

Прозвішча, імя, імя па бацьку пішуцца поўнасцю ў верхнім радку. Калі ў працэсе каталагізацыі немагчыма ўстанавіць імя і імя па бацьку, ініцыялы пішуцца на адлегласці, каб у будучым можна было поўнасцю ўпісаць імя і імя па бацьку. Замежныя прозвішчы і імёны даюцца ў беларускай (рускай) транскрыпцыі, а ў круглых дужках на мове арыгінала. Выключэннем з'яўляюцца транскрыпцыйныя замацаванні іншамоўных прозвішчаў і імёнаў у беларускай і рускай мовах (Гюго Віктор, Шэкспір Уільям, Гётэ Іаган Вольфганг, Гейнэ Генрых). Калі дакумент мае двух і больш аўтараў, на кожнага аўтара складаецца асобная картка, прозвішчы на якіх ставяцца ў адпаведнай паслядоўнасці. Калі дакумент падпісаны дзвюма і больш асобамі, картка складаецца на кожную асобу. Выключэннем могуць быць групы асоб, якія маюць абагульняючыя прыкметы: чытачы, школьнікі, гледачы, вайскоўцы і г. д. У такіх выпадках картка складаецца толькі на адрасата дакумента.

Калі аўтар вядомы пад псеўданімам і пад сапраўдным імем, на першае месца выносіцца імя, якім падпісаны твор, і складаюцца *адсылачныя карткі* ад прозвішча да псеўданіма і наадварот.

Від дакумента ўказваецца пасля назвы і тэматыкі дакумента у апісальным артыкуле (загалоўку) карткі (загад, ліст, пратакол, дароўны надпіс і г. д.). Від дакумента пішацца так, як ён прыводзіцца ў самім дакуменце, з захаваннем тэрміналогіі дадзенай эпохі (рэвізская сказка, фармулярны спіс, абвестка і г. д.). Ступень паўнаты (без пачатку, без канца, адсутнічаюць лісты і г. д.) указваецца ў выпадках страты некаторых фрагментаў дакументаў. Поўны тэкст дакумента не агаворваецца. Мова дакумента ў картцы ўказваецца для дакументаў на замежных мовах. Беларуская і руская мовы не агаворваюцца.

Крайнія даты групы дакументаў і даты дакументаў пішуцца ў наступным парадку: год, месяц, дзень месяца – арабскімі лічбамі. Крайнія даты пішуцца праз працяжнік. Калі дата дакумента ўстанаўліваецца ў працэсе каталагізацыі, яна заключаецца ў квадратныя дужкі. Шыфр дакумента складаецца з нумароў фонду, вопісу, адзінкі захоўвання (адзінак захоўвання), нумара ліста (лістоў).

Прыклады анатавання дакумента ў імяннoй каталожнай картцы:

*Семяжон Язэп (Семяжонаў Іосіф Ігнатавіч).*
*"Кароль Лір". Трагедыя У. Шэкспіра. Сцэны у перакладзе з англ. мовы. Аўтограф.*

*Тураў Віктар Цімафеевіч.*
*“Людзі на балоце”. Літаратурны сцэнарый па аднайменнай трылогіі І. Мележа. Машынапіс.*

*Лейтман Леў Мееравіч.*
*“Вуліца ў Мінску”. Пейзаж. Эскіз. Папера, акварэль. 1981–1985*

*Дудараў Аляксей Ануфрыевіч.*
*“Белыя росы”. Літаратурны сцэнарый мастацкага фільма, знятага І. М. Дабралюбавым на кінастудыі «Беларусьфільм».*

*Дубоўка Уладзімір Мікалаевіч.*
*Пісьмы да Бабарэкі Адама Антонавіча. 1928–1935. 153 пісьмы. 315 л.*

**1.4.3. Забеспячэнне захаванасці і улік дакументаў асабістага паходжання. Асаблівасці захоўвання кніг і музейных прадметаў.**

Дакументы асабістага паходжання, якія ўтвараюць адзінку захоўвання, *не падшываюцца і не пераплятаюц*ца, а ўкладваюцца ў канверт (папку) у разгорнутым выглядзе. Скрэпкі і ўсе металічныя прадметы здымаюцца. Для дакументаў нестандартных фарматаў вырабляецца канверт (папка), адпаведны памеру дакумента. Унікальныя і асабліва каштоўныя дакументы заключаюцца ва ўнутраныя вокладкі, а фатаграфіі і візітныя карткі – *у канверты*. Творы выяўленчага мастацтва заключаюцца ў паспарту і пракладваюцца мікалентнай паперай. З мэтай замацавання парадку размяшчэння дакументаў у адзінцы захоўвання, забеспячэння іх захаванасці і ўліку ўсе лісты ў адзінках захоўвання нумаруюцца. Не падлягаюць нумарацыі чыстыя лісты, унутраныя вокладкі, лісты з завяральнымі надпісамі. Лісты нумаруюцца арабскімі лічбамі ў валавым парадку ў правым верхнім вугле ліста, не закранаючы тэксту дакумента. Вышыня лічбаў не павінна перавышаць 5 мм. Фатаграфіі і малюнкі нумаруюцца на адваротным баку дакумента. Ліст, разарваны на некалькі частак, нумаруецца як адзін ліст. Для больш надзейнай іх захаванасці кожная з гэтых частак нумаруецца пад адной лічбай, аб чым робіцца адпаведны запіс у завяральным надпісе. На лісце з некалькімі наклейкамі нумаруецца кожная з іх. Пры нумарацыі альбомаў з фатаграфіямі нумаруюцца ў валавым парадку лісты альбома (у першую чаргу), калі яны маюць надпісы, і кожная фатаграфія. Гэта адносіцца і да альбомаў з выразкамі, праграмамі і інш. Лісты альбомаў без надпісаў не нумаруюцца. Пасля заканчэння нумарацыі лістоў да адзінкі захоўвання складаецца ліст-завяральнік.

На пастаяннае захоўванне ў складзе фондаў асабістага паходжання прымаюцца наступныя **друкаваныя выданні**:

- творы, навуковыя працы, выданні фондаўтваральніка; зборнікі, часопісы, газеты, каталогі з публікацыямі фондаўтваральніка;
- літаратура пра фондаўтваральніка;
- кнігі з дароўнымі надпісамі і аўтарскімі паметамі;

- асабістыя бібліятэкі вядомых дзяржаўных, грамадска-палітычных дзеячаў, дзеячаў навукі, літаратуры, мастацтва і іншых галін;
- калекцыі друкаваных выданняў, сабраныя фондаўтваральнікам;
- даведачныя выданні па профілі архіва.

Правілы ацэнкі і прыёму друкаваных выданняў адпавядаюць правілам, установленым у дзяржаўным архіве для дакументаў асабістага паходжання. Друкаваныя выданні перадаюцца аддзелам фарміравання НАФ ў аддзел навуковага апісання дакументаў ці аддзел, які забяспечвае працу архівасховішча друкаваных выданняў. Перадача ажыццяўляецца па спісах, якія складаюцца асобна:

- на кнігі фондаўтваральніка;
- на кнігі з дароўнымі надпісамі;
- на кнігі на замежных мовах;
- на часопісы і газеты.

Інвентарызацыя паступленняў друкаваных выданняў вядзецца ў агульных інвентарных кнігах. Кнігі з дароўнымі надпісамі, унікальныя і рэдкія могуць інвентарызавацца ў асобных кнігах. Выданні з аўтографамі ў інвентарнай кнізе пазначаюцца літарай “а” праз злучок за інвентарным нумарам. Інвентарныя нумары кніг прастаўляюцца ў спісах, па якіх яны з аддзела фарміравання НАФ перадаюцца ў архівасховішча друкаваных выданняў. Адзін экзэмпляр спісаў далучаецца да вопісаў фондаў, другі захоўваецца ў аддзеле, які забяспечвае працу архівасховішча друкаваных выданняў.

Захоўванне друкаваных выданняў ажыццяўляецца па парадку інвентарных нумароў. Мерапрыемствы па забеспячэнні захаванасці друкаваных выданняў праводзяцца адпаведна дзеючым правілам работы дзяржаўных архіваў.

**Музейныя прадметы**, якія паступаюць з фондамі асабістага паходжання, могуць складаць рэчы, мемарыяльныя прадметы, музычныя інструменты, творы выяўленчага мастацтва, гуказапісы, кінафільмы і інш. На музейныя прадметы, якія паступаюць з фондам асабістага паходжання, складаецца спіс установленага ўзору, адзін экзэмпляр якога захоўваецца ў музейнай частцы, а другі далучаецца да вопісу фонду. Спіс складаецца з назвы прадмета, даты яго стварэння, апісання знешніх асаблівасцяў. Пасля інвентарызацыі атрыманых прадметаў у спіс уносяцца іх інвентарныя нумары. На кожны музейны прадмет заводзіцца інвентарная картка, дзе павінны прысутнічаць фатаграфія прадмета і поўнае яго апісанне. Паступленне музейных прадметаў фіксуецца ў кнізе рэгістрацыі паступленняў, пасля чаго праводзіцца іх інвентарызацыя (навуковая рэгістрацыя) у інвентарныя кнігі. Прадметам, уключаным у кнігу паступленняў і інвентарную кнігу, прысвойваюцца нумар паступлення і інвентарны нумар. Музейныя прадметы захоўваюцца ў спецыяльна выробленых скрынках і шафах, у адасобленым памяшканні. Выдача музейных прадметаў для экспанавання ў межах архіва ажыццяўляецца па кнізе выдачы.

### 1.5. Архівы вуснай гісторыі як асобны від архіваў асабістага паходжання

#### 1.5.1. Этапы развіцця вуснай гісторыі і архіваў вуснай гісторыі

*Вусная гісторыя (ВГ)* з'яўляецца грунтоўным накірункам гістарычных і архівазнаўчых даследаванняў, у рэчышчы якога склалася надзвычай аб'ёмная гістарыяграфія. Вусная гісторыя – гэта накірунак заснаваны на метадзе стварэння вуснага ўспаміну, як аўтабіяграфічнай (тэматычнай) гістарычнай крыніцы, і яго аналізе з дапамогай міждысцыплінарных методык. Вусная гісторыя таксама можа разглядацца як сацыяльная практыка, якая дазваляе праз індывідуальныя суб'ектыўныя ацэнкі зафіксаваць, даследаваць і перадаць наступным пакаленням калектыўную памяць пра падзеі мінулага.

Архівазнаўчы аспект пытання нельга разглядаць у адрыве ад асноўных этапаў і працэсаў развіцця вуснай гісторыі, яе асноўных школ і падыходаў. Алістэр Томпсан, старшыня вуснагістарычнай асацыяцыі Аўстраліі, у сваім артыкуле 2007 г.[19] вылучыў 4 асноўныя парадыгмы (этапы) трансфармацыі вуснагістарычнага накірунку:

- канец 1940-х – 1960-я гг. – пасляваенны рэнесанс памяці як крыніцы «народнай гісторыі» – ўзнікненне ВГ як накірунку гістарычных даследавання;
- з канца 1970-х гг. – развіццё «постпазітывісцкіх» падыходаў да памяці і суб'ектыўнасці;
- з канца 1980-х гг. – трансфармацыя ўяўленняў аб ролі вуснага гісторыка як інтэрв'юера і аналітыка, атрыманне вуснай гісторыяй самастойнай значнасці і пераадоленне страху перад суб'ектыўнасцю вуснагістарычных крыніц;
- канец 1990-х – пачатак 2000-х гг. – лічбавая рэвалюцыя і значнае павелічэнне магчымасцяў вуснай гісторыі.

Асноўнымі фактарамі, якія на думку А. Томпсана ўздзейнічалі на працэс развіцця вуснай гісторыі сталі павышэнне ролі вусных успамінаў, у шэрагу палітычных і прававых практык, гуманітарных даследаваннях (у т.л. гістарычных), міждысцыплінарнасць.

Лінда Шопс вылучыла тры этапы эвалюцыі вуснай гісторыі:

яе паходжанне як архіўнай справы – *архіўны этап*;

яе развіццё як сродка дэмакратызацыі гістарычных дакументаў і спосабаў напісання гісторыі – *дэмакратызацыйны этап;*

яе прадстаўленне як комплекса інтэллектуальных і сацыяльных практык – *міждысцыплінарны этап*. Гэтыя ж этапы аналізуюцца і ў даследаваннях беларускіх навукоўцаў[20].

---

[19] Thomson, A. Four paradigm transformations in oral history // Oral History Review. 2007. – Vol. 34, No. 1. – Pp. 49–70; Dunaway David King The Development of Oral History in the United States: the evolution toward interdisciplinary. 2018 // https://www.redalyc.org/journal/3381/338158055007/html/#fn9.

[20] Самахвалаў Д. С. Архівы «вуснай» гісторыі ў ЗША // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 16. / гал. рэд. Э.М. Савіцкі [і інш.] – Мінск, 2015 – С. 278–284; Бутько, В.Н. «Устная история» в контексте изучения личности / В.Н. Бутько // Роль личности в истории: реальность и проблемы изучения: науч. сб. (по материалам 1-й Международной научно-практической Интернет-конференции) / редкол. В. Н. Сидорцов (отв. ред.) [и др.]. – Минск: БГУ, 2011. – С. 162–166; Іванова В. Архівы вуснай гісторыі: этапы станаўлення, традыцыйныя практыкі і

Першыя архівазнаўча-вуснагістарычныя даследаванні пачатку 1950-х гг. пачыналіся з вызначэння паняцця *вусная гісторыя – як "ўспаміну, які быў запісаны з дапамогай прафесійнага інтэрв'юера-гісторыка ў адпаведнасці з прызнанымі этычнымі і працэдурнымі стандартамі збору і транскрыбацыі запісаў".* Без такіх стандартаў вусная гісторыя не магла існаваць. Яны былі патрэбныя як сродак зрабіць успаміны надзейнымі крыніцамі для гісторыі і біяграфіі XX ст. Першы такі стандарт быў прыняты ў 1954 г. Амерыканскай асацыяцыяй дзяржаўнай і лакальнай гісторыі ў Мэдысане (штат Вісконсін) "Стандарты запісу ўспамінаў з дапамогай запісваючага абсталявання" ("Standards for the Manufacture of Reminiscences With a Recording Device") – і стаў першым дакументам з 14 пунктаў, дзе акрэсліваліся мінімальныя абавязкі архівістаў і гісторыкаў у галіне вуснай гісторыі. Этап збору інтэрв'ю стаў полем увагі і гісторыкаў і архівістаў. На ім закладваліся інфармацыйныя магчымасці будучага архіўнага дакумента. *Упершыню архівіст мог наўпрост уплываць на працэс стварэння дакумента.* У рэчышчы працы традыцыйных архіваў задачы архівіста пачыналіся з пошуку і адбору на захоўванне ўжо створаных дакументаў, а ўздзеянне на працэс дакументавання быў мінімальным (праз метадычнае кіраўніцтва) ці адсутнічаў цалкам.

У 1948 г. амерыканскі журналіст і гісторык Алан Нэвінс упершыню стварыў праект па вуснай гісторыі пры Калумбійскім універсітэце. У 1950-х гг. самымі распрацаванымі і найбольш фінансаванымі былі праекты вуснай гісторыі ў Калумбійскім універсітэце і Архіве Форда ў Дырборне (Мічыган). У 1966 г. прадстаўнікі 44 вуснагістарычных праектаў сабраліся разам па запрашэнні Каліфарнійскага ўніверсітэта ў Лос-Анджэлесе (UCLA) і арганізавалі вуснагістарычную асацыяцыю (ОНА) для абмену інфармацыі аб мэтах, тэхніках і праблемах вуснай гісторыі. Узначаліў яе Алан Нэвінс. Першы падручнік па вуснай гісторыі быў апублікаваны ў 1972 г. Вілай Баўм з офіса вуснай гісторыі пры Каліфарнійскім універсітэце і тычыўся практыкі выкарыстання вуснай гісторыі. Вілла Баўм правяла тыпалагізацыю вялікай колькасці вуснагістарычных праектаў і ўмоўна падзяліла іх на пяць тыпаў згодна выконваемых функцый:

1. агульныя праекты, якія звычайна рэалізоўваліся ўніверсітэтамі і былі звязаныя з вялікімі сховішчамі традыцыйных дакументаў. Найвялікшым з іх у ЗША з'яўляўся Офіс даследаванняў вуснай гісторыі пры Калумбійскім універсітэце. Другі – гэта Рэгіянальны офіс вуснай гісторыі (ROHO), які працаваў як аддзел Бібліятэкі Бэнкрафта (Універсітэт Каліфорніі, Бэрклі);
2. асобныя тэматычныя праекты пастаянныя альбо часовыя. Прыкладам могуць быць прэзідэнцкія бібліятэкі, ваенна-гістарычныя праекты ваенна-марскога інстытута і акадэміі паветраных сілаў, прафесійныя гістарычныя праекты Нацыянальнай мэдыцынскай бібліятэкі, Амерыканскай псіхіятрычнай асацыяцыі, Амерыканскага інстытута фізікі і інш., праекты вуснай гісторыі

сучасныя тэндэнцыі захоўвання // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 23. / гал. рэд. Э.М. Савіцкі [і інш.] – Мінск, 2022. – С. 46–57.

этнічных групп (пяцігадовы праект Дорыс Дьюк па гісторыі карэнных народаў Амерыкі (1966–1972) ў 7 універсітэтах) і інш.;

3. рэгіянальныя гістарычныя праекты. Вуснагістарычны праект універсітэта Невады (арганізаваны бібліятэкай) з 1969 г. збіраў матэрыял для таго каб прадставіць Неваду у кантэксце Заходне-амерыканскай гісторыі;

4. адукацыйныя праекты, для якіх асноўнай мэтай была інстытуалізацыя метадалогіі вуснай гісторыі як формы гістарыяграфіі, а калекцыі саміх успамінаў разглядаліся як другасныя;

5. асобныя валанцёрскія праекты лакальных гістарычных супольнасцей, бібліятэк альбо музеяў. Мэта – гэта захаванне інфармацыі аб уласнай супольнасці. Некалькі такіх супольнасцей з'яўляюцца членамі ОНА.

Брытанскі вусны гісторык Пол Томпсан у сярэдзіне 1970-х гг. акрэсліваючы асаблівасці вуснагістарычнага накірунку ў Паўночнай Амерыцы і параўноўваючы яго з брытанскай школай адзначаў большую скіраванасць на працу з транскрыптамі[21], якія з'яўляліся асноўнай адзінкай архіўнага захоўвання. У той час як брытанская школа выкарыстоўвала найперш *самі запісы*, а само развіццё вуснай гісторыі шло не столькі ў сацыяльным кантэксце (як амерыканская школа), колькі ў *навуковым накірунку* даследаванняў сацыяльнай гісторыі. Акрамя таго вуснагістарычныя дакументы як ў Брытаніі так і ў Францыі традыцыйна разглядаюцца як частка *гукавых (аўдыёвізуальных) архіваў.*

У апошняе дзесяцігоддзе галоўнай тэндэнцыяй стала вывучэнне накірункаў *дыгіталізацыі і онлайн доступу да вусных успамінаў (алічбоўкі, захоўвання, інтэлектуальнай уласнасці, анлайн доступу)*. Гэтай тэме быў прысвечаны цэлы выпуск "Oral History Rewiew" у 2013 годзе. Лічбавае захоўванне вусных успамінаў патрабуе выканання пэўных правілаў: рэзервовае капіраванне, рэгулярны перазапіс, праверка функцыянальнасці носьбіта і якасці запісу, міграцыя фарматаў запісу, захоўванне метададзеных файлаў. Архіваванне у гэтым выпадку з'яўляецца толькі першым крокам на шляху працы з вуснымі успамінамі. Інтэрв'юеры, ужо на этапе распрацоўкі праекта могуць выбіраць устойлівы фармат запісу, зручны архіў для супрацоўніцтва альбо захоўваць запісы самастойна.

Каля 400 вуснагістарычных (амерыканскіх, канадскіх, брытанскіх праектаў выставілі свае відэа-, аўдыа калекцыі і калекцыі транскрыптаў анлайн (http://wiki.ohda.matrix.msu.edu/index.php/Sites). Пераважная большасць запісаў даступная толькі супрацоўнікам, пасля рэгістрацыі, ці з'яўляюцца часткай больш грунтоўных збораў бібліятэк, музеяў і універсітэтаў. Але ёсць таксама і каля дзесятка адкрытых праектаў (у тым ліку самых вядомых сховішчаў вуснай гісторыі):

• з камбаджыйскімі жанчынамі, якія перажылі рэжым чырвоных кхмераў (1975–1979) (http://cambodianwomenoralhistory.squarespace.com);

• 500 гадзін запісаў па гісторыі карпарацыі Карнегі (1966–1997) (http://www.columbia.edu/cu/lweb/digital/collections/oral_hist/carnegie/);

---

[21] Тэрміналогію гл. ў раздзеле 5.3.

• “Размовы з гісторыяй” – каля 600 інтэрв’ю, што запісваліся з 1982 па 2019 гг. (Каліфарнійскі універсітэт, Берклі). Гэта жывыя і неадрэдагаваных відэаінтэрв'ю з выбітнымі асобамі са ўсяго свету (дыпламатамі, дзяржаўнымі дзеячамі, вайскоўцамі, навукоўцамі, гісторыкамі, пісьменнікамі і інш.) (http://globetrotter.berkeley.edu/conversations);

• “Пераажыць вайну” (Бібліятэка Кангрэса) – каля 3 тыс. успамінаў ветэранаў Другой сусветнай 1939–1945, Карэйскай 1950–1953 гг., В’етнамскай (1961–1975) войнаў, вайны ў Персідскім заліве (1991), Іракскай (2003–2011) і Афганскай (2001–2021) войнаў і інш. праекты.

Самым вялікім онлайн-сховішчам вусных успамінаў з’яўляецца архіў візуальнай гісторыі Шоа (USC Shoah Foundation), які дазваляе дазваляе шукаць і праглядаць больш за 54 тыс. відэаўспамінаў людзей, што выжылі пасля генацыду і сведкаў гэтых падзей (https://sfi.usc.edu/what-we-do/collections). Першапачаткова гэта было сховішча сведчанняў Халакосту падчас Другой сусветнай вайны, але яно пашырылася ўключыўшы сведчанні генацыду армян (Першая сусветная вайна), Нанкінскай разні (1937 г., Кітай), генацыду ў Камбоджы (1975–1979 гг.), ў Гватэмале (1918 г.), народа тутсі ў Руандзе і інш. Усяго сведчанні на 32 мовах з 56 краін. (http://www.newseum.org/warstories/index.htm)

### 1.5.2. Правілы працы архіваў вуснай гісторыі

Асноўныя архівазнаўчыя пытанні ВГ гэта:

• методыка збору вусных успамінаў (інтэрв’ю) і забеспячэнне іх надзейнасці як гістарычнай крыніцы, уключаючы аўдыё (відэа) запіс і транскрыбаванне;

• праблема транскрыбавання як першаснай інтэрпрэтацыі ўспаміна;

• суправаджальныя дакументы да інтэрв’ю, у якіх фіксуецца ход і асаблівасці запісу;

• пытанні забеспячэння захаванасці вусных успамінаў на розных носьбітах (папяровых, магнітнай плёнцы, лічбавых);

• легітымізацыя вусных успамінаў як гістарычнай крыніцы;

• забеспячэнне доступу да архіваў вуснай гісторыі і другаснае выкарыстанне вуснагістарычных дакументаў;

• этыка працы з вуснымі ўспамінамі, іх публікацыя, фарматы захоўвання дадзеных, онлайн доступ і паўнатэкставы пошук.

У 2019 г. амерыканская Асацыяцыя вуснай гісторыі (ОНА) прыняла агульныя правілы працы архіваў вуснай гісторыі як дадатак да прынцыпаў і правілаў сваёй. Яны таксама абапіраюцца на этычны кодэкс амерыканскіх архівістаў. Вуснагістарычныя інтэрв’ю тут разглядаюцца ў некалькіх аспектах, як гістарычныя і антрапалагічныя крыніцы (і крыніцы для іншых дысцыплін), якія мусяць быць даступнымі і зразумелымі, як культурныя аб’екты і як архіўныя адзінкі, якія патрабуюць працяглага захавання.

1. Кожны праект па вуснай гісторыі павінен мець план *захоўвання (архівавання)* успамінаў, які значна павышае эфектыўнасць праекта як такога. У выпадку калі выкарыстанне такіх дакументаў можа нанесці шкоду грамадзянам ці арганізацыям, дакументы дапускаецца не архіваваць ці абмяжоўваць доступ да іх.

Архіваванне надае кантэкст праекту і дазваляе выкарыстоўваць вынікі ў выглядзе запісаў у доўгатэрміновай перспектыве.

2. Наяўнасць выразных правілаў ацэнкі і прыёму дазваляе ўладальнікам калекцый, зарзумець, якое сховішча найбольш пасуе для захоўвання канкрэтных дакументаў. А прадстаўленая ўладальнікам інфармацыя дазваляе у наступным забяспечыць захоўванне і выкарыстанне у адпаведнасці з пажаданнямі самога ўладальніка.

3. Апісанне інтэрв’ю і стварэнне *апісання (метададзеных)* ўключае фіксацыю інфармацыі, якая дазваляе змясціць інтэрв’ю ў пэўны кантэкст атрымаць доступ да яго. Гэта інфармацыя: аб правядзенні інтэрв’ю, тэхнічная інфармацыя (напрыклад, тып файла, памер файла), інфармацыя аб правах і доступе да дакументаў, інфармацыя аб суадносінах інтэрв’ю з іншымі. Метададзеныя з цягам часу могуць абнаўляцца.

4. Прыярытэт у захаванні арыгінальнага запісу інтэрв’ю (змены не дапускаюцца), а таксама адпаведнай дакументацыі. Матэрыялы павінны захоўвацца ў кантраляваным асяроддзі з адпаведнай колькасцю лічбавых копій ў розных фізічных месцах.

5. Для выкарыстання інтэрв’ю патрэбныя: дазволы на выкарыстанне, наяўнасць транскрыпцыі (магчымасць поўнага тэкставага пошуку інтэрв’ю), забеспячэнне публічнага офлайн ці онлайн доступа ў адпаведнасці са стандартамі установы-захавальніка. Важна вызначыць права ўласнасці да пачатку праекта і дакументаваць любыя змены на працягу яго захоўвання (змены практыкі захоўвання, прававых нормаў, тэхналогій, грамадскіх узаемаадносін).

Архівы вуснай гісторыі адносяцца да катэгорыі *гукавых і аўдыёвізуальных архіваў* (IASA[22]), з чаго вынікаюць асаблівасці захоўвання. *IASA* – як асацыяцыя прафесійных архівістаў гукавых дакументаў – заклапочана тым, што істотны рост цікавасці да вуснай гісторыі павінен суправаджацца адпаведнай ступенню разумення важнасці і якасці выніковых гукавых дакументаў. Таму асацыяцыя прапанавала наступныя правілы:

1. Падрабязнае апісанне метадалогіі праекта, біяграфій рэспандэнтаў, канкрэтных інтэрв’ю і умоў іх запісу;

2. Стварэнне умоў для дапаўнення інтэрв’ю інфармантам (напрыклад, праз дадатковыя пісьмовыя ці вусныя запісы);

3. Забеспячэнне якасці інтэрв’ю і магчымасці крытыкі (рэфлексіі) над працай інтэрв’юера. Забеспячэнне чысціні запісу ад староннiх гукаў. Забеспячэнне

---

[22] Міжнародная асацыяцыя гукавых архіваў была створана ў 1969 г. Яна прадстаўляе, абагульняе і развівае працу ўстаноў і асоб, якія прафесійна займаюцца зборам, захоўваннем і распаўсюджваннем гукавых дакументаў. З моманту свайго стварэння IASA аб’ядноўвала членаў, звязаных з архівамі музычных запісаў; гістарычных, літаратурных і драматычных запісў; біяакустычныя і медыцынскіх гукаў; моўныя і дыялекталагічных запісаў; фальклорна-этнаграфічных, а таксама запісаў вяшчальных арганізацый. Практыка вуснай гісторыі, якая хутка развівалася на працягу апошніх двух дзесяцігоддзяў, прывяла да стварэння важнай новага віда гукаархіва, які цяпер добра прадстаўлены ў IASA.

паслядоўнасці інтэрв’ю, наяўнасці даведачнай інфармацыі і змяншэнне ролі інтэрв’юера.

4. Транскрыпцыя як этап забеспячэння доступу да інтэрв’ю. Адбор інтэрв’ю для транскрыбавання. Вызначэнне палітыкі транскрыбавання.

5. Арганізацыя захоўвання. Шыфраванне, апісанне. Індэксацыя.

Большая частка працэсаў збору, захоўвання і выкарыстання вусных успамінаў, такім чынам, патрабуе удзелу архівіста поўнасцю ці часткова.

### 1.5.3. Падыходы да запісу вусных успамінаў і тэрміналогія

Існуюць два асноўных падыхода да стварэння вуснага ўспаміна – гэта: *даследчыцкі (ці тэматычны) і архіўны (ці інфармацыйны)*. Іх даволі грунтоўна акрэсліла ў сваёй дысертацыі расійская даследчыца Дзіяна Хубава яшчэ напачатку 1990-х гг.[23] Гісторык стварае вуснагістарычную крыніцу, кіруючыся ўласнай праграмай тэматычнага даследавання. Для архівіста асноўнай задачай з’яўляецца фіксацыя і захаванне інфармацыі аб як мага большай колькасці грамадскіх працэсаў і з’яў. Адлюстраванне і фіксацыя не толькі самой інфармацыі але і сферы яе існавання. Дакументаванне працэса стварэння інтэрв’ю праз складанне *суправаджальных дакументаў: спіса рэспандэнтаў, плана інтэрв’ю, апытальніка, анкеты, пратакола інтэрв’ю, дамовы з рэспандэнтам* і інш. – з’яўляецца прынцыпова важным для працы архівіста, і мэтазгодным для працы гісторыка. Суправаджальныя дакументы фіксуюць усе этапы працы, і ў далейшым дазваляюць праводзіць знешнюю крытыку і верыфікаваць атрыманыя вынікі.

Прынцыповае адрозненне стаўлення вуснага архівіста і вуснага гісторыка ёсць і да працэса інтэрв’юявання, вынікам якога паўстае вусны ўспамін. Ён заўсёды ствараецца з выкарыстаннем *гуказапісваючай тэхнікі (дыктафон, відэакамера)*, якая дае магчымасць атрымаць своеасаблівы адбітак памяці ў зададзеным і верыфікуемым кантэксце, а таксама закладае магчымасць для вялікай колькасці інтэрпрэтацый у далейшым. Больш інфарматыўным з’яўляецца відэаінтэрв’ю, бо ўтрымлівае значны аб’ём невербальных звестак (інтэр’ер, адзенне, знешні выгляд, рухі, міміка і г.д.), якія ў далейшым могуць таксама стаць аб’ектам аналіза.

Для архівіста асноўным з’яўляецца *біяграфічнае інтэрв’ю*, якое мае мінімальны набор адкрытых пытанняў. Задача – даць рэспандэнту максімальна раскрыцца самастойна для трансляцыі ўласнага вобразу мыслення, памяці, ўспрымання пражытага, ацэнкі падзей мінулага. Праблема такога падыходу палягае ў фарміраванні структурных і часавых рамак інтэрв’ю, бо захаваць усё – немагчыма. З іншага боку, жорсткі тэматычны апытальнік вуснага гісторыка можа прывесці не толькі да немагчымасці верыфікацыі інфармацыі праз кантэкст, але і да адсутнасці новай інфармацыі як такой. Бо пры адсутнасці завершанага наратыву і раскрыцця ўласнага меркавання, асабліва малаадукаванымі

[23] Хубова Д.Н. Устная история и архивы: зарубежные концепции и опыт. Диссертация на соискание ученой степени кандидата исторических наук. 07.00.02. Отечественная история. – М., 1992. – С. 66–70.

рэспандэнтамі, транслюецца роўна тая інфармацыя, якая закладзена ў самім пытанні.

Для гісторыка суразмоўца – гэта найперш сведка падзей, з якім вядзецца размова па вызначаным плане, для архівіста – апавядальнік з якім вязецца вольная напаўкіруемая гутарка, скіраваная на раскрыццё як мага большай колькасці тэмаў. Класічны прыклад архіўнага інфармацыйнага ці элітарнага падыхода пры стварэнні вуснага успаміна – гэта збор інтэрв'ю ў знакамітых дзеячаў сучаснасці, з чаго ўласна і пачыналася вусная гісторыя як новы гістарыяграфічны накірунак у праекце Алана Нэвінса ў Калумбійскім універсітэце ў сярэдзіне ХХ ст. Надалей жа за вуснай гісторыяй замацавалася амплуа *гісторыі знізу*. Архіўны падыход пры гэтым не быў страчаны, а развіваўся ў межах захавання памяці асобных сацыяльных груп, якія мелі праблемы ў фіксацыі сваёй гісторыі традыцыйнымі пісьмовымі сродкамі, ці не мелі пісьмовай гісторыі ў прынцыпе.

Правілы правядзення інтэрв'ю прапанаваны ў вялікай колькасці прац: ад класічных оксфардскіх падручнікаў, працы класіка брытанскай вуснай гісторыі Пола Томпсана, упершыню апублікаванай ў 1978 г. і пераведзенай на рускую мову ў 2003 г., да метадычных парадаў, распрацаваных супрацоўнікамі шматлікіх архіваў вуснай гісторыі[24].

Адным з варыянтаў атрымання рэпрэзентатыўнасці вуснага ўспаміну (конмплекса вусных успамінаў) можа быць класічная сацыялагічныя выбарка. З кожнай сацыяльнай групы ці падгруппы выбіраецца 6–15 прадстаўнікоў з мэтай дасягнення *інфармацыйнага насычэння тэмы*. Але вусныя гісторыкі, у залежнасці ад пастаўленай задачы, могуць задаваць уласныя параметры выбаркі, зыходзячы таксама і з гістарычнага кантэкста. Крытэрыем адбору рэспандэнтаў могуць быць: прафесія, сацыяльны статус, узрост, пол, веравызнанне, месца жыхарства і інш. Для выяўлення якасцяў гістарычных працэсаў і з'яў рэпрэзентатыўная выбарка, як і дакладны апытальнік не патрабуецца – дастаткова агульных крытэрыяў сацыяльнага вымярэння і асобных пытанняў. Такі падыход атрымаў у навуковай літаратуры назву *"гістарычная сацыялогія"*.

Калі звярнуць увагу на тэрміналогію, датычную працэса стварэння вуснага ўспаміна, то яна таксама можа адрозніваццa ў залежнасці ад абранага падыходу. Паняцце *"інтэрв'ю"* разглядаецца як працэс у выніку якога ствараецца *вусны успамін*. Вусны успамін у сваю чаргу можа захоўвацца як *архіўны дакумент (гукавы архіўны дакумент)* і выкарыстоўвацца як *вуснагістарычная крыніца*. Пол Томпсан адзначаў, што інтэрв'ю – гэта не дыялог і не размова. Яго сутнасць у тым, каб даць магчымасць выказацца рэспандэнту. А П'ер Бурд'е разглядаў інтэрв'ю як від духоўнага практыкавання, што мае на мэце праз адмову ад уласнага "я" прыйсці да поўнай трансфармацыі меркавання аб іншых людзях. Аб'ектам інтэрв'ю у дадзеным выпадку выступае *рэспандэнт (інфармант, інтэрв'юяваны, сведка),* ад якога *інтэрв'юер* (даследчык, архівіст) атрымоўвае інфармацыю. Рэспандэнт і інтэрв'юер маюць розныя, няроўныя ролі і не могуць з'яўляцца суразмоўцамі.

[24] Томпсон П. Голос прошлого. Устная история. – М., 2003. – 368 с.; Rirchie Donald A. Doing Oral History. – Oxford, 2002. – 352 p.

Вынікам біяграфічнага інтэрв'ю можа стаць *"жыццёвая гісторыя"* ( ці *"біяграфічны аповед"*, якая на думку нямецкага сацыёлага Фрыца Шутцэ і з'яўляецца канструкцыяй, што ўключае ў сябе сацыяльную рэальнасць і ўнутраны жыццёвы досвед чалавека. Калі гаворка ідзе пра працу вуснага гісторыка ў рэчышчы *тэматычнага інтэрв'ю*, то аб'ектам будзе выступаць асоба якая можа прадставіць неабходныя звесткі па цікавячай тэме – *сведка ці ўдзельнік падзей*.

Паняцце *"вусны ўспамін"* можна разглядаць у кантэксце класічнай крыніцазнаўчай тэорыі як адзін з відаў дакументаў асабістага паходжання, з пэўнымі спецыфічнымі рысамі стварэння і інтэрпэтацыі.

Большасць даследчыцкіх медодык (крыніцазнаўчых, сацыялагічных, антрапалагічных) прадугледжваюць перавод успамінаў з вуснай у пісьмовую форму, т.зв. *транскрыпцыя інтэрв'ю*. Яна дае магчымасць паўнавартаснага аналізу, падзелу на дробныя элементы і пошуку новых сэнсаў. Пры гэтым асаблівасці вуснай формы таксама вербалізуюцца і аналізуюцца. Наяўнасць адкрытага доступу да аўдыёверсіі і суправаджальных дакументаў (апытальніка, анкеты, пратакола) ствараюць магчымасці верыфікацыі. Пры транскрыбаванні ўспамін з вуснага пераўтвараецца ў некалі прамоўлены. Транскрыпцыя па сутнасці становіцца першаснай інтэрпрэтацыяй, бо як паказвае практыка розныя транскрыбатары могуць па-рознаму чуць і фіксаваць пачутае ў залежнасці ад сваіх кампетэнцый, светабачання, адчування мовы, традыцый, культуры, якія закладзены ва ўспамін. Па-рознаму могуць інтэрпрэтавацца словы, выбудоўвацца сказы, фарміравацца абзацы, паказвацца завершаныя нарацыі. У кожнага транскрыбатара можа быць свой стыль і падыходы да працы. Можна дакладна пазначаць усе гукі (уключаючы асобныя літары, што не нясуць сэнсавага напаўнення) і невербальныя сімвалы. Можна абраць варыянт фіксацыі толькі сэнсава абумоўленых сімвалаў. Але пры выбары падыхода, трэба памятаць, што "*чым больш мы спрабуем каб голас быў максімальна пачуты на друкаванай старонцы, тым больш рызыкуем атрымаць нечытэльны тэкст"(М. Фрыш)*. Таму другі варыянт падаецца больш аптымальным, бо даследчык заўсёды можа параўнаць транскрыбаваны варыянт успаміна з арыгінальным.

Прыступаючы да інтэрпрэтацыі даследчык найперш мае справу з пэўнай формай *суб'ектыўнасці вуснага ўспаміна* як крыніцы. Класічнае крыніцазнаўства звяртае ўвагу на тое, што кожная крыніца мае свае асаблівасці ўзнікнення і бытавання, а яе верыфікацыя праводзіцца праз унутраную і знешнюю крытыку. Гэтыя ж правілы дзейнічаюць і для ўсяго комплексу дакументаў асабістага паходжання, методыка аналізу якіх дастаткова добра распрацаваная. Суб'ектыўнасць – гэта ўласцівасць любой крыніцы. Напрыклад, Пол Томпсан, у сваёй працы "Голас мінулага" прыводзіць цытату былога брытанскага міністра пачатку XX ст. аб афіцыйных дакументах: *"Прачытаўшы ўсе матэрыялы Кабінета міністраў аб паседжаннях, у якіх я сам удзельнічаў, я зразумеў, што гэтыя дакументы вельмі часта не мелі ніякіх адносінаў да таго, што адбывалася на самой справе… Кожная гістарычная крыніца мае суб'ектыўны характар, але толькі вусныя крыніцы дазваляюць нам пераадолець гэтую суб'ектыўнасць:*

*вызваліць памяць слой за слоем, дакапацца да яе глыбінь у надзеі знайсці скрытую праўду”.*

Таму праблема палягае найперш у пошуку адпаведных метадаў інтэрпрэтацыі вуснага ўспаміну, яго ўпісання ў кантэкст гістарычнага даследавання. Яны мусяць адпавядаць падыходу, абранаму напачатку даследавання. Два асноўныя метады аналіза: гэта *тэматычны і біяграфічны*. Традыцыйны вуснагістарычны аналіз, як правіла, зыходзіць з класічных пытанняў, сфармуляваных амерыканскім даследчыкам Майклам Фрышам: *хто гаворыць? пра што гаворыць? чаму гаворыць?* Пошук адказаў на іх праходзіць праз рэканструкцыю сувязей, эпізодаў, узаемаадносін у межах канкрэтнага наратыву. Ён скіраваны на пераадоленне разарванасці розных пакаленняў і сацыяльных груп, стварэнне выспаў калектыўнай памяці, аднаўленне індывідуальнай і калектыўнай ідэнтычнасці.

### 1.5.4. Правілы збору, апрацоўкі, захоўвання і выкарыстання вусных успамінаў

Правілы збору, апрацоўкі, захоўвання і выкарыстання вусных успамінаў уключаюць наступныя крокі:

1. Вызначэнне тэмы даследавання і мэты правядзення кантрэтных інтэрв’ю. Мэта павінна быць адна, у некаторых выпадках – да двух-трох. Неабходна вывучыць гістарыяграфію па азначанай тэме, азнаёміцца з методыкай правядзення інтэрв’ю.

2. Выбарка рэспандэнтаў з улікам года нараджэння, месца жыхарства, пола, нацыянальнасці, веравызнання ці іншых фактараў. Для раскрыцця адной тэмы можа быць апытана ад 5 да 15 рэспандэнтаў.

3. Падрыхтоўка *суправаджальных дакументаў* да інтэрв’ю: апытальнік, анкета, пратакол, дамова. *Апытальнік* утрымлівае ключавы сцэнар хода інтэрв’ю: першая фаза – анкетная, дзе запісваюцца асноўныя дадзеныя, другая – нязмушаны аповед, дзе рэспандэнтсвабодна апавядае пра сваё жыццё, трэцяя – удакладняючыя пытанні. *Анкета рэспандэнта* можа ўтрымліваць вельмі мала або шмат граф, у залежнасці ад мэтаў праекта. Асабістыя дадзеныя асабязкова фіксуюцца. Анкета павінна ўтрымліваць інфармацыю, якая дапаможа навукоўцам зразумець, выкарыстаць і інтэрпрэтаваць інтэрв’ю. Акрамя імя рэспандэнта, адраса, нумара тэлефона, даты і месца нараджэння, анкета можа утрымліваць імёны, даты нараджэння і даты смерці бацькоў, братоў і сясцёр, сужэнцаў і дзяцей, месцы пражывання, перамяшчэнні для атрымання адукацыі ці працы, спецыяльныя навыкі, сяброўства ў грамадскіх і палітычных арганізацыях і інш. звесткі для аналіза у залежнасці ад праекта. *Дамова на выкарыстанне інтэрв’ю* робіць зразумелым для рэспандэнта і інтэрв’юера, якім чынам інтэрв’ю будзе выкарыстоўвацца. Дамова падпісваецца пасля інтэрв’ю. Дадаткова можа складацца *пратакол правядзення інтэрв’ю,* дзе падрабязна апісваюцца ўмовы яго правядзення.

4. Знаёмства з рэспандэнтам і падрабязнае (можа некалькі разоў) тлумачэнне мэты правядзення інтэрв’ю. Усталяванне атмасферы даверу і

ўзаемаразумення мае важнае значэнне для паспяховага інтэрв’ю. Інтрэрв’юеру неабходна быць паважлівым, нязмушаным, прыязным, знайсці правільны баланс паміж нефармальным і фармальным падыходамі. звярнуць ўвагу на культурныя асаблівасці. Неабходна растлумацыць фармат і працэдуру інтэрв'ю, яго тэхнічную базу (напрыклад, наяўнасць камеры ці (і) дыктафона, неабходнасці выдалення староннiх асоб, прыбірання лішніх гукаў у пакоі). У час падрыхтоўкі да інтэрв’ю не варта пачынайць абмяркоўваць гісторыю жыцця інтэрв'юяванага (толькі пра падрыхтоўчыя моманты і тэмы, якія не будуць тычыцца зместу інтэрв’ю). Кожная сітуацыя ўнікальная, таму да кожнага суразмоўцы трэба выкарыстаць індывідуальны падыход. Можна імкнуцца зняць (запісаць) інтэрв’ю, узяць *дазвол на яго выкарыстанне (падпісаць дамову з рэспандэнтам)*, найбольш поўна запоўніць *анкету рэспандэнта*, але не пераходзіць этычных межаў (фізічны стан інтэрв’юера, нежаданне ці немагчымасць размаўляць, нежаданне даваць дазвол на выкарыстанне інтэрв’ю і інш.).

5. Інтэрв’ю запісваецца адначасова на дыктафон і камеру (ці на любыя два носьбіты). Пасля ці падчас інтэрв’ю робяцца фотаздымкі рэспандэнта, цікавых інтэр’ерных дэталяў. Скануюцца (фатаграфуюцца на фотаапарат ці камеру) дакументы сямейнага архіва. Апошнія абавязкова анатуюцца (хто ці што зафіксавана на фотаздымку, дата стварэння фотаздымка і інш.). Гэта можна зрабіць ў *анкеце рэспандэнта*.

6. Падчас размовы пажадана пазбавіцца лішніх асобаў (суседзяў, родных і г.д.) Але калі яны прысутнічаюць пазначыць у *анкеце ці пратаколе* (імя, прозвішча і яго адносіны з рэспандэнтам).

7. Неабходна аптымальна выбраць сцэну для здымкі: камера і інтэрв’юер насупраць рэспандэнта, за спіной рэспандэнта не павінна быць нікога, хто б адцягваў на сябе ўвагу. Неабходна звярнуць увагу на знешні выгляд рэспандэнта (асабліва пры відэаздымцы). Нельга здымаць насупраць вокнаў, не змешваць штучнае і натуральнае асвятленне, правяраць выяву з экрана з натуральнай выявай, асветленасць твару і адсутнасць цені. Заўсёды выкарыстоўваць штатыў, правяраць гарызонт кадру. Кропка здымкі павінна быць вышэй за ўзровень вачэй рэспандэнта. Пры ўсталяванай і ўключанай камеры наедзьце трансфакатарам на рэспандэнта каб наладзіць фокус. Не варта канцэнтраваць ўвагу суразмоўцы на дыктафоне і камеры. Рэспандэнт павінен глядзець не на камеру, а на інтэрв’юера.

8. Пазбавіцца лішніх удзельнікаў размовы і лішніх шумоў (радыё, тэлевізар, зачыніць вокны, абараніць дыктафон ад ветру і інш.) Дыстанцыя ад дыктафона і камеры да суразмоўцы да 2 м. і бліжэй. Самім інтэрв’юерам не ствараць лішняга шуму (не перапыняць рэспандэнта, не размаўляць адначасова з іншымі асобамі, не стукаць па паверхні, дзе ляжыць дыктафон і інш.) Дыктафон павінен быць бліжэй да рэспандэнта, чым да інтэрв’юера. Пажадана прагаворваць за рэспандэнтам згаданыя ім прозвішчы, назвы мясцовасцяў і пазначаць іх у *анкеце*.

9. Інтэрв’ю бяруць 2 чалавекі: першы размаўляе з рэспандэнтам, робіць запіс на дыктафон і бярэ *дазвол на выкарыстанне* інтэрв’ю, другі робіць фота і відэаздымку, сканаванне, запаўняе *анкету,* задае ўдакладняючыя пытанні у канцы размовы (толькі пасля таго як скончацца пытанні ў першага інтэрв’юера). У

*анкеце і дамове* пазначаюцца абодва інтэрв'юера ў акрэсленай паслядоўнасці абавязкаў. Стандартная працягласць інтэрв'ю – 1,5-2 гадз. Пасля чаго робіцца перапынак. Пажадана не рабіць вялікую колькасць файлаў (толькі ў выпадку вялікага перапынку ў размове).

10. Інтэрв'ю пачынаецца з агучвання даты інтэрв'ю, імён рэспандэнта і інтэрв'юераў, месца правядзення інтэрв'ю (пры неабходнасці – мовы). Пры правядзенні інтэрв'ю варта не толькі прытрымлівацца схемы інтэрв'ю, але і тэмпу, зададзенага рэспандэнтам.

11. Першае і галоўнае пытанне якое задаецца: "Раскажыце пра сваё жыццё…" Пасля – галоўная задача інтэрв'юера – слухаць. Даць магчымасць чалавеку расказаць тое, што ён лічыць самым значным у сваім жыцці. Пры гэтым важна не ўмешвацца ў яго аповед, не перабіваць, не ствараць ніякіх гукаў, але невербальна праяўляць зацікаўленасць у аповедзе. Калі рэспандэнт спыніўся, трэба вытрымаць паўзу не менш 10–20 сек. і калі рэспандэнт не працягвае аповед – можна павольна задаваць свае пытанні. Яны павінны вынікаць з папярэдняга аповеду, быць кароткімі і адкрытымі: *Як жылі у вайну? Ці былі партызаны ў вёсцы? Ці памятаеце калектывізацыю? і інш.* Нельга спяшайцца задаваць пытанні! Задаваць іх толькі па адным, ствараць магчымасць для суразмоўцы падумаць, узважыць свае думкі. Нельга перапыняць[25]. Лепш натаваць вашыя пытанні і задаваць іх у канцы інтэрв'ю. Нельга спрачацца і даводзіць свае меркаванне – задача рэспандэнта – зразумець і асэнсаваць прамоўленае. Неабходна абстрагавацца ад уласнай пазіцыі і вядомых фактаў, каб мець магчымасць атрымаць новую інфармацыю. Пытайцеся пра вызначэнне і тлумачэнне слоў, якія рэспандэнт выкарыстоўвае і якія маюць значэнне для інтэрв'ю. Напрыклад, можна запытаць жанчыну, якая жыла на вёсцы, што яна мае на ўвазе пад жорнамі. Як гэта выкарыстоўваць? Якая была іх мэта? Перафразуйце і паўторна задавайце важныя пытанні, каб атрымаць поўны аб'ём інфармацыі, якім валодае рэспандэнт. Важна каб пытанне было зразумелым.

12. Закончыць інтэрв'ю патрэбна цяперашнім часам і станоўчымі ўспамінамі. Абавязкова падзякуйце за інтэрв'ю. Зрабіце копіі дакументаў сямейнага архіа, якія спатрэбяцца для аналіза інтэрв'ю.

13. Адразу пасля інтэрв'ю, інтэрв'юер запаўняе суправаджальныя дакументы, анатуе атрыманыя файлы у фармаце прозвішча імя імя па бацьку рэспандэнта, від дакумента, (напрыклад, аўдыё), можа быць таксама год нараджэння і месца запісу інтэрв'ю.

14. Атрыманыя дакументы захоўваюцца як мінімум у двух копіях. Захоўваюцца зыходнікі файлаў, якія ніяк не рэдагуюцца.

15. Пасля інтэрв'ю можа рабіцца *транскрыпцыя* – фармалізаваны тэкставы запіс гукавога інтэрв'ю: слоў, экспрэсіі, рухаў. Для такой фіксацыі

---

[25] Адзіны выпадак, калі гэта дапушчальна – для пераключэння размовы на асноўную тэму, напрыклад, калі рэспандэнт доўга распавядае пра сучасныя бытавыя праблемы ці інш. не звязанае з тэмай інтэрв'ю. Але варта не рабіць гэта занадта рэзка ці агрэсіўна, бо такія адыходы ад асноўнай тэмы могуць спрыяць усталяванню даверлівых адносін паміж рэспандэнтам і інтэрв'юерам.

выкарыстоўваюцца спецыяльная сістэма пазначэнняў для ўніфікацыі тэкставых версій успамінаў і спрашчэння іх выкарыстання. Пры транскрыбаванні неабходна максімальна дакладна перадаваць словы і мову рэспандэнта, не рабіць у тэксце граматычнага, стылістычнага ці іншага рэдагавання. Паўзы, пазначаныя эмоцыі і інш. павінны супадаць з тымі, якія на самой справе былі праяўлены інфармантам пры інтэрв'ю. Пры транскрыпцыі ўлічваецца, што людзі гавораць не так як пішуць і што трэба імкнуцца пазбягаць няправільных інтэрпрэтацый і маніпуляцый са словамі рэспандэнта. Калі ў тэксце самім рэспандэнтам прапушчаны словы, якія неабходныя для разумення сказа, то яны могуць пазначацца ў квадратных дужках. Тое ж робіцца ў дачыненні зробленых рэспандэнтам памылак, калі вядомая карэктная інфармацыя (даты, месцы, факты і г.д.). Транскрыбаванне робіцца ў графічнай сістэме той мовы, якая пазначана рэспандэнтам як мова размовы.

16. Можа рабіцца *сегментацыя* – падзел тэксту транскрыпцыі ўспаміна на сегменты (часткі) з мэтай іх прывязкі да адпаведнага моманту ў аўдыё- ці відэафайле для лепшага візуальнага ўспрыняцця ўспаміна і пошуку неабходнай інфармацыі. Пазначэнні сегментаў робяцца па форме (гадзіна, хвіліна, секунда, доля секунды). *Напрыклад: #00:02:01-9#*

17. Таксама можа рабіцца *індэксацыя* – вызначэнне геаграфічных, храналагічных, імянных і тэматычных паказальнікаў у межах сегментаў інтэрв'ю для пошуку інфармацыі ў інтэрв'ю. Ключавыя тэмы, а таксама ўсе геаграфічныя назвы, даты і прозвішчы, якія сустракаюцца ў сегментах інтэрв'ю, індэксуюцца ў тэматычным**,** імянным, геаграфічным, храналагічным. Робіцца першапачатковая прывязка тэм, імён, дат і месцаў да канкрэтных сегментаў інтэрв'ю. Рэспандэнтам у інтэрв'ю паняцці, даты і імёны згадваюцца звычайна ў форме малапрыстасаванай для пошуку, хаця магчымасць пошуку існуе і непасрэдна па сегментаваных тэкстах.

18. Выкарыстанне інтэрв'ю можа адбывацца толькі на ўмовах і з мэтамі прапісанымі ў дамове і вызначанымі на пачатку праекта.

Магчымыя складанасці пры правядзенні інтэрв'ю:

- Рэспандэнт баіцца запісваючага абсталявання.
- Рэспандэнт не верыць, што мае нешта каштоўнае сказаць, ці не мае звычкі гаварыць публічна і трэба шмат тлучэмачэнняў і падмацаванняў.
- Рэспандэнт не памятае.
- Рэспандэнт мае шэраг гісторый, якія ён распрацаваў і выкарыстоўвае іх для размовы, амаль цалкам па сцэнары.
- Рэспандэнт баіцца даваць прыватную ці асабістую інфармацыю.
- Інтэрв'юер занадта нервуецца ці дэзарганізаваны.
- Інтэрв'юер не зацікаўлены ў размове, не слухае, што інтэрв'юяваны спрабуе сказаць ці "сам усё ведае".
- Інтэрв'юер выказвае крытыку ў дачыненні да пачутага.
- Інтэрв'юер фармулюе пытанні на незразумелай рэспандэнту мове.
- Праблемы з гукам: занадта слабы гук, староннія шумы, адначасова кажуць некалькі чалавек.

Спасылкі на вусныя успаміны могуць рабіцца наступным чынам:

на ўспаміны ў асабістым архіве інтэрв'юера

*Ілініч Любоў Міхайлаўна, 1928 г.н., в. Вольберавічы, Докшыцкі р-н, Віцебская вобл. Запісана В.С. Ціханавай. 23.05.2011 // Асабісты архіў В.С. Ціханавай. 00:21:06–00:26:13.*

на ўспаміны ў сямейным архіве рэспандэнта

*Ілініч Любоў Міхайлаўна, 1928–2011, в. Вольберавічы, Докшыцкі р-н, Віцебская вобл. Запісана М. Ілініч. 2007. // Сямейны архіў М. Ілініч. 00:21:06–00:26:13.*

на ананімны ўспамін у архіве

*Ядвіга Ш., 1933 г.р., в. Дубава, Дзяржынскі р-н, Мінская вобл. Запісана Т. Кухаронак і Т. Валодзінай. 2011. // Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Ф. 23. Воп. 11. Спр. 2. 00:01:43.*

на ўспамін ў анлайн архіве

*Асташинский Адам, 1926 г.р., г. Хайфа, Израиль. Записано Б. Зилпером. 1995. // USC Shoah Foundation. Visual History Archive Online. [Электрон. ресурс]. Режим доступа: https://vhaonline.usc.edu/viewingPage?testimonyID=7503&segmentNumber=31&returnIndex=-1. 00:21:06. Дата доступа: 20.04.2020.*

на дакумент ў сямейным архіве

*Фотография Евгении Чаплинской с мамой и сестрой. Воложин. 1934. // Личный архив Е. Чаплинской. д. Литва, Молодечненский р-н.*

## 2. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

**Тэматыка семінарскіх заняткаў**

Тэма 1. Тэарытычныя асновы працы з архівамі асабістага паходжання

1. Архівы асабістага паходжання і захаванне памяці
2. Паняцце архіваў асабістага паходжання. Віды архіваў асабістага паходжання.
3. Прававыя асновы захоўвання архіваў асабістага паходжання ў розных краінах свету
4. Сучасныя тэндэнцыі захоўвання асабістых архіваў
5. Архівы вуснай гісторыі
6. Сямейныя архівы і сучасныя праблемы асабістага дакументавання.
7. Рэканструкцыя архіваў асабістага паходжання

Тэма 2. Гісторыя архіваў асабістага паходжання Беларусі

1. Фарміраванне і захоўванне асабістых архіваў на беларускіх землях з канца XVIII – да пачатку XX ст.
2. Тэарытычныя і метадычныя асновы захоўвання архіваў асабістага паходжання ў савецкім архівазнаўстве
3. Захоўванне архіваў асабістага паходжання ў першай палове XX ст.
4. Збіранне і захоўванне архіваў асабістага паходжання ў БССР у 1945–1991 гг.
5. Архівы беларускай эміграцыі
6. Фонды асабістага паходжання ў складзе дзяржаўных сховішчаў Рэспублікі Беларусь.

Тэма 3. Методыка працы з дакументамі асабістага паходжання ў дзяржаўных архівах Рэспублікі Беларусь

1. Камплектаванне і экспертыза каштоўнасці дакументаў асабістага паходжання.
2. Стварэнне навукова-даведачнага апарата на дакументы асабістага паходжання.
3. Забеспячэнне захаванасці і ўлік дакументаў асабістага паходжання. Асаблівасці захоўвання кніг і музейных прадметаў
4. Выкарыстанне дакументаў асабістага паходжання ў дзяржаўных архівах Рэспублікі Беларусь.

# 3. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

**Пытанні да заліку**

1. Архівы асабістага паходжання і захаванне памяці
2. Прававыя асновы захоўвання архіваў асабістага паходжання ў розных краінах свету
3. Сучасныя тэндэнцыі захоўвання асабістых архіваў
4. Паняцце архіваў асабістага паходжання. Віды архіваў асабістага паходжання.
5. Архівы вуснай гісторыі
6. Сямейныя архівы і сучасныя праблемы асабістага дакументавання.
7. Фарміраванне і захоўванне асабістых архіваў на беларускіх землях з канца XVIII – да пачатку XX ст.
8. Захоўванне архіваў асабістага паходжання ў першай палове XX ст.
9. Тэарытычныя і метадычныя асновы захоўвання архіваў асабістага паходжання ў савецкім архівазнаўстве
10. Збіранне і захоўванне архіваў асабістага паходжання ў БССР у 1945–1991 гг.
11. Архівы беларускай эміграцыі
12. Фонды асабістага паходжання ў складзе дзяржаўных сховішчаў Рэспублікі Беларусь.
13. Рэканструкцыя архіваў асабістага паходжання
14. Камплектаванне і экспертыза каштоўнасці дакументаў асабістага паходжання.
15. Стварэнне навукова-даведачнага апарата на дакументы асабістага паходжання. Архіўны вопіс.
16. Стварэнне навукова-даведачнага апарата на дакументы асабістага паходжання. Архіўны каталог.
17. Забеспячэнне захаванасці дакументаў асабістага паходжання. Асаблівасці захоўвання кніг і музейных прадметаў
18. Выкарыстанне дакументаў асабістага паходжання ў дзяржаўных архівах Рэспублікі Беларусь.

# 4. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 4.1. Рэкамендаваная літаратура

**асноўная**

1. Иванова О.С. Архивоведение: электронный учебно-методический комплекс – Минск: БГУ, 2022. – 382 с. (https://elib.bsu.by/handle/123456789/294928)

2. Архівазнаўства: дапаможнік / А.М. Бяляўскі і інш.; пад рэд. М.Ф. Шумейкі – Мінск: БДУ, 2013. – Раздз. 11. https://elib.bsu.by/handle/123456789/95593

3. Іванова, В. Асабістыя архівы Беларусі канца XVIII – пач. XXI ст.– Мінск, 2014. – 404 с. https://elib.bsu.by/handle/123456789/289294

4. Іванова, В. Змест і эвалюцыя паняцця “асабісты архіў” / В. Іванова // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 8. / рэд. кал. У.І. Адамушка [і інш.] – Мінск, 2007. – С. 55–67. https://elib.bsu.by/handle/123456789/288877

5. Метадычныя рэкамендацыі па рабоце архіваў з дакументамі асабістага паходжання (зацверджаны загадам дырэктара Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 28.12.2015 № 48)

6. Инструкция о порядке доступа к архивным документам, содержащим сведения, относящиеся к личной тайне граждан (утверждена постановлением Министерства юстиции Республики Беларусь от 24 мая 2012 г. № 132).

**дадатковая**

1. Закон Рэспублікі Беларусь “Об авторском праве и смежных правах” ад 17 мая 2011г. №262-З

2. Метадычныя рэкамендацыі па рабоце архіваў з дакументамі асабістага паходжання (зацверджаны загадам дырэктара Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 28.12.2015 № 48)

3. Методические рекомендации по комплектованию, описанию, учету и использованию документов личного происхождения в государственных и муниципальных архивах / Росархив, ВНИИДАД. – М., 2020. – 185 с. (https://archives.gov.ru/documents/methodics/2021-recommendations-lf.shtml#term)

4. Аўтограф: альманах: заснаваны ў 2020 г. / Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Вып. 1–4. 2020–2023.

5. Архіўныя чытанні I—III / укладальнікі: Г. В. Запартыка і інш. Вып. 1. – 226 с.

6. Іванова В. Архівы вуснай гісторыі: этапы станаўлення, традыцыйныя практыкі і сучасныя тэндэнцыі захоўвання // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 23. / гал. рэд. Э.М. Савіцкі [і інш.] – Мінск, 2022. – С. 46–57. https://elib.bsu.by/handle/123456789/306559

7. Іванова В. Сямейныя архівы беларускіх вяскоўцаў і іх лёсы падчас Другой сусветнай вайны // Архивы и война. К 75-летию Победы над фашизмом [Электронный ресурс]: материалы междунар. науч. конф., Минск, 4 нояб. 2020 г. – Минск: БГУ, 2021. – С. 47–54. https://elib.bsu.by/handle/123456789/267438

8. Илизаров Б.С. И Слово воскрешает… или «Прецедент Лазаря». 25 тезисов и развернутое дополнение к светской теории воскрешения. По материалам Народного архива. – М., 2007. – 400 с.

9. Дмитриев С.С. Личные архивные фонды. Виды и значение их как исторических источников // Вопросы архивоведения. – 1965. – № 4. – С. 35–48.

10. Автократов В.Н. Понятие происхождения в архивоведении // Археографический ежегодник за 1978 год. – М.: Наука, 1979. – С. 142–149.

11. Хубова Д.Н. Устная история и архивы: зарубежные концепции и опыт. Диссертация на соискание ученой степени кандидата исторических наук. 07.00.02. Отечественная история. – М., 1992. – 322 с.

12. Самахвалаў Д.С. Архівы «вуснай» гісторыі ў ЗША // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 16. / гал. рэд. Э.М. Савіцкі [і інш.] – Мінск, 2015. – С. 278–284.

13. Фонды и коллекции документов личного происхождения в государственных архивах Республики Беларусь: краткий справочник / Департамент по архивам и делопроизводству Министерства юстиции Республики Беларусь. – Минск: БелНИИДАД, 2009. – 171 с.

14. Экспертыза каштоўнасці дакументаў асабістага паходжання: методыка і практычны вопыт Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва / Г. В. Запартыка // Теоретические и практические проблемы документоведения и архивоведения: ретроспектива и современность : материалы Международной научно-практической конференции (Минск, 2–3 декабря 2015 г.) / [редколлегия: Э. М. Савицкий и др.]. — Минск, 2016. — С. 104–110.

15. Zielińska T. Archiwalia prywatne (pojęcie, zakres gromadzenia, metody opracowania) // Archeion. Czasopismo naukowe poświęcone sprawom archiwalnym / Naczelna Dyrekcja Archiwów Państwowych. – T. 56. – Warszawa, 1971. – S. 71–85.

16. Kolankowski Z. Granice spuścizny archiwalnej // Archeion. Czasopismo naukowe poświęcone sprawom archiwalnym / Nachelna Dyrekcja Archiwów Państwowych. – T. 57. – 1972. – S. 53–73.

17. Kulecka A. Spuścizny w archiwach, bibliotekach i muzeach w Polsce // Archeion. – T. 100. – 1999. – S. 70–96.

18. Syta K. Archiwa magnackie w XVIII wieku. Studium kultury kancelaryjno-archiwalnej. – Toruń, 2010. – 311 s.

**4.2. Электронныя рэсурсы**

19. Відэаўрок па захоўванні музейных прадметаў [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://archives.gov.by/home/normativnaya-baza-arhivnogo-dela-i-deloproizvodstva-v-respublike-belarus/videouroki/26-videourok-naczionalnogo-arhiva-respubliki-belarus-oformlenie-i-podgotovka-k-hraneniyu-muzejnyh-predmetov-v-naczionalnom-arhive-respubliki-belarus – Дата доступа: 06.01.2024.